Камуністычная ... у Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 7 1934 г. СЕРАДА № 31 (4864) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Даклады т. МОЛАТАВА і т. МАНУІЛЬСКАГА

ЗАДАЧЫ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

Даклад тав. МОЛАТАВА на XVII з'ездзе ВКП(б)

...аварышы, справаздачны даклад ... Сталіна быў не проста спра... аб мінулай дзейнасці Цэн... ...ьнага Камітэта партыі. Гэта быў ...лад і аб нашых задачах, аб пер... ...ктыве будаўніцтва социялізма, ...лініі нашай далейшай работы. У ...м дакладзе дано ўсё асноўнае ...вызначэння ўстаноўкі партыі ў ...той пяцігодцы.

...ры асноўныя задачы мы ставім ...ад сабой у другой пяцігодцы. ...ь гэтыя задачы.

...ершая і разам з тым **асноўная ...тычная задача** другой пяцігодкі ...канчатковая ліквідацыя капіталі...чных элементаў і класаў наогул, ...ае знішчэнне прычын, якія па...жаюць класавыя рознасці і эк...аатацыю і перамаганне перажыт ...капіталізма ў эканоміцы і свя...масці людзей, ператварэнне ўсяго ...паўнага насельніцтва краіны ў ...домых і актыўных будаўнікоў ...класавага социялістычнага гра...ства». (XVII партканферэнцыя).

...ругая задача—далейшы пад'ём до...быту рабочых і калгасных мас і ...ышэнне ўзроўню спажывання ...цоўных у 2 з пал.—3 разы.

...рэцяя задача — завяршэнне тэх...ай рэканструкцыі ўсёй народ...гаспадаркі, прамысловасці, тран...рта, сельскай гаспадаркі.

...этыя тры задачы неразрыўна звя...ы паміж сабой і вызначаюць сут...ць социялістычнага будаўніцтва ...ерыяд другой пяцігодкі.

...к сказана ў рашэннях XVII парт...ферэнцыі, асноўнай палітычнай ...дачай другой пяцігодкі з'яўляецца ...ная ліквідацыя класаў і, разам з ...м, знішчэнне прычын, якія пара...жаюць класы. Пастаноўка такой ...дачы выходзіць з асноўнага марк...ска-ленінскага палажэння аб тым, ...о «социялізм ёсць знішчэнне кла...» (Ленін). З другога боку, толькі ...этай сувязі, толькі ў сувязі са ...нчэннем паразітычных класавых ...ментаў і пераходам узрастаючага ...одната даходу поўнасцю ў распа...ржэнне працоўных і совецкай ...ржавы можа быць пастаўлена за...а карэннага пад'ёму матэрыяль...а і культурнага ўзроўню рабочых ...ілян. Ажыццяўленне гэтых задач ...ішна апіраца на велізарны ...'ём народнай гаспадаркі і яе тэх...ную рэканструкцыю. Вось чаму ...ршэнне тэхнічнай рэконструк...і народнай гаспадаркі пастаўлена ...касці асноўнай гаспадарчай зада...і другой пяцігодкі.

...ы можам цяпер паставіць гэтыя ... асноўныя задачы другой пяці...кі, апіраючыся на поспехі, апіра...ся на пераможнае выкананне ...шай пяцігодкі. Рашэнне гэтых за...дач падрыхтавана першай пяцігодкай ...сім папярэднім социялістычным ...будаўніцтвам.

... пачатку першай пяцігодкі капі...лістычныя элементы ў нашай кра...і прадстаўлялі яшчэ нямалаважную ...велічыню.

...раўда, у прамысловасці доля ка...талістычных элементаў яшчэ да ...атку першай пяцігодкі з года ў ... падала і ўжо пяць год таму на-

Удельная вага социялістычных форм у гаспадарцы СССР (у процантах)

	1928 г.	1932 г.	1937 г.
Валавой прадукцыі буйнай пра...	99,0	99,93	100,0
Валавой прадукцыі сельскай гас...дарки (...ключаючы індывідуальныя гаспа...дарки калгаснікаў)	3,0	74,7	100,0
Ва ўсіх пасеўных плошчах (...ключаючы індывідуальныя гас...дарки калгаснікаў)	2,8	79,7	100,0
% калектывізацыі сялянскіх гас...дарак	1,7	61,5	100,0
...раздробным таваразвароце	75,2	99,0	100,0
...народным даходзе СССР	44,0	93,0	100,0

...к канцу другой пяцігодкі социялі...чныя формы займуць манаполь...становішча ва ўсіх галінах гас...дарки. З пяці грамадска-эканамі...х укладаў у нашай краіне, аб ...х Ленін гаварыў у пачатку нэпа, ... двух грамадска-эканамічных ук...даў, якія яшчэ існуюць у сучасны ...мант, к канцу другой пяцігодкі ў ... астанецца адзін грамадска-экана...ны уклад—социялістычны уклад, ...народны даход СССР цалкам і поў...цю будзе ў распараджэнні пра...ных. Наша краіна, ажыццявіў...і задачы другой пяцігодкі, стано...ца маналітнай социялістычнай ...публікай. (Апладысменты).

...Мы ставім сваёй задачай у другой ...пяцігодцы знішчыць прычыны, якія ...раджаюць класавыя рознасці і эк...плуатацыю чалавека чалавекам.

...Якія-ж гэта прычыны? Прычыны ...ыя захоўваюцца да таго часу, па...ль існуе прыватная ўласнасць на ...дкі творчасці, пакуль у адных ...дзей гэтыя сродкі вытворчасці ...ць, а ў другіх іх няма. Мы ве...м, што сродкі вытворчасці ў пра...словасці ўжо амаль цалкам зна...дзяцца ў руках дзяржавы. Амаль ...-ж самае можна сказаць цяпер і ...гандлі. Не можа быць сумненняў ...ў тым, што прыкладна адна трэ...я частка сялянскіх гаспадарак, ...о застаецца яшчэ па-за калгасам, ... гады другой пяцігодкі пройдзе ... шлях калектывізацыі. Тым са...м і ў сельскай гаспадарцы сród ...вытворчасці—машыны і жывы ін...тар—будуць належаць дзяржаве ...калгасам, а не прыватным асобам. ...зямля, як вядома, нацыяналізава...а яшчэ ў 1917 годзе. Пакончыўшы і ...сельскай гаспадарцы з прыватнай ...асласцю на сродкі вытворчасці і ...ціна зацвердзіўшы пазіцыі соция...стычных форм (калгасаў, МТС, соў...саў), мы знішчаем прычыны, якія ...раджаюць класы і эксплуатацыю.

Мы гаворым пры гэтым аб пера...ганні перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей.

Што гэта азначае? З сказанага ясна, што гэта азначае ў адносінах да эканомікі краіны. Перажыткі капіталізма ў свядомасці людзей яшчэ вельмі вялікі і надзвычай жывучы. Тав. Сталін падкрэсліў у сваім дакладзе, як з гэтымі перажыткамі ў свядомасці людзей нам неабходна яшчэ лічыцца нават у партыі. Нават у партыі гэтыя перажыткі будуць яшчэ доўга пажыўным асяродзем для антыленінскай ідэалогіі. Тым больш трэба падкрэсліць задачу перамагання перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей у адносінах да ўсёй масы працоўных. У перажытках гэтага роду мы не можам не бачыць апоры класавага ворага, які жывуч і які ідзе цяпер на ўсё, каб падрываць справу социялізма, каб пакасіць і шкодзіць працоўным. Патрэбна ўся сіла пролетарскай дыктатуры, велізарны рост культуры і ўвесь уплыў нашай партыі ў масах, каб усямерна паскорыць зжыванне гэтых перажыткаў у асяроддзі працоўных. Змагацца за перамаганне гэтых перажыткаў у свядомасці працоўных—значыць змагацца за ўмацаванне социялістычнай уласнасці, як уласнасці свяшчэннай і недатыкальнай у нашай краіне. Змагацца за перамаганне гэтых перажыткаў—значыць змагацца за социялістычныя адносіны да працы, за свядомую і жалезную працоўную дысцыпліну, за разгортванне спаборніцтва і ўдарніцтва, супроць усіх і ўсякіх лодыраў і дэзарганізатараў нашай работы.

Ажыццяўленне гэтых задач і, перш за ўсё, задачы ліквідацыі капіталістычных элементаў і класаў наогул патрабуе ўсямернага ўмацавання пролетарскай дыктатуры, яе магутнасці, яе боездольнасці. Ажыццяўленне гэтых задач патрабуе разам з тым умацавання саюза рабочага класа з працоўным сялянствам, на аснове ўмацавання якога толькі можна давесці да канца ліквідацыю капіталістычных элементаў і класаў наогул.

Такоў шлях ператварэння ўсіх працоўных нашай краіны ў свядомых і актыўных будаўнікоў бяскласавага социялістычнага грамадства.

У справе павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных у першай пяцігодцы мы дабіліся буйнейшых поспехаў. Даволі ўказаць на знішчэнне безработыя і на стварэнне ў рабочых поўнай упэўненасці ў заўтрашнім дні і на знішчэнне расслаення сялянства на кулакоў і беднякоў са спыненнем збяднення вёскі.

Няўхільны пад'ём матэрыяльнага ўзроўню рабочых мас і стварэнне цяпер прадпасылак для паскоранага пад'ёму добрабыту сялянскіх мас знаходзяць сваё выражэнне ў росце бытавых і культурных запатрабаванняў працоўных. Іменна ў сувязі з гэтым партыя і ўрад ставяць перад сабой задачу разгарнуць работу лёгкай і харчовай прамысловасці, а таксама другіх галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі і забяспечыць павышэнне ўзроўню спажывання працоўных у 2 з пал. —3 разы.

Што для гэтага неабходна?

Для гэтага, папершае, неабходна забяспечыць лёгкую і харчовую прамысловасць сыравінай і, значыць, па крайняй меры ўдвая падняць таварную прадукцыю сельскай гаспадаркі краіны.

Для гэтага, падругое, неабходна значна ўзмацніць вытворчыя магутнасці нашай лёгкай і харчовай прамысловасці і ў тры разы павялічыць прадукцыю гэтых галін прамысловасці. У гэтым і заключаецца важнейшая частка праграмы другой пяцігодкі.

Як задача быстрага пад'ёму сельскай гаспадаркі і разгортвання лёгкай і харчовай прамысловасці, так і задача карэннага паляпшэння ўсёй работы транспарта падводзяць нас да пытання аб тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі ў другім пяцігоддзі.

Вось чаму тэзісы к з'езду гавораць аб тым, што «асноўнай і рашаючай гаспадарчай задачай другой пяцігодкі з'яўляецца завяршэнне рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі».

Мы маем права разглядаць вынікі першай пяцігодкі, як найвялікшую перамогу ленінскай палітыкі нашай партыі, палітыкі социялістычнай індустрыялізацыі краіны. Мы маем права таксама сказаць, што задачы, якія высоўваюцца ў другой пяцігодцы, цалкам выцякаюць з поспехаў і дасягненняў папярэдняга перыяду і сведчаць аб велізарным росце сіл социялізма ў Совецкім Саюзе і аб непахісным упэўненасці партыі і рабочага класа ў перамозе сваёй справы.



Перш чым перайсці да больш канкрэтнага выкладання задач другой пяцігодкі, я спынюся на вядомых дырэктывах XVII партканферэнцыі. У параўнанні з гэтымі дырэктывамі ў адносінах паасобных галін гаспаркі, тэзісы к XVII з'езду намячаюць рад змен. Гэта адносіцца перш за ўсё да заданняў па прамысловай прадукцыі. Не спыняючыся па дэталях скажу толькі, што гэтыя змены ні ў якой меры не мяняюць асноўнай установкі XVII партканферэнцыі. Асноўныя задачы другой пяцігодкі ў тэзісах к з'езду сфармуляваны ў поўнай адпаведнасці з рашэннямі XVII партканферэнцыі.

Справа з'езда—абмеркаваць намечаныя змены і сказаць сваё канчатковае слова па ўсіх рашаючых заданнях другой пяцігодкі.

I. ЗАВЯРШЭННЕ ТЭХНІЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ І ПАД'ЁМ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ

Галоўнай гаспадарчай задачай другой пяцігодкі з'яўляецца завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і на гэтай аснове магутнае разгортванне прадукцыйных сіл краіны.

У першай пяцігодцы справа тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі ўжо значна прасунулася наперад. Цяжкая прамысловасць моцна стала на ногі, асабліва машынабудаўніцтва. У сельскай гаспадарцы тэхнічнае пераўзбраенне зрабіла цэлы пераварот. Тэхнічнае пераўзбраенне пайшло ўшырэй і ў іншых галінах народнай гаспадаркі. І ўсё-ж гэтым быў пакладзен толькі пачатак тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі СССР.

Толькі ў другой пяцігодцы задача тэхнічнай рэканструкцыі пастаўлена ва ўсім аб'ёме ў адносінах усіх галін прамысловасці, усёй сельскай гаспадаркі і ўсіх відаў транспарта.

Што значыць завяршыць тэхнічную рэканструкцыю народнай гаспадаркі ў СССР? Гэта значыць дабіцца такога тэхнічнага пераўзбраення ўсіх галін народнай гаспадаркі, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарта, якое-б паставіла іх на ўзровень перадавых па тэхніцы капіталістычных дзяржаў. Завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі высоўвае СССР на першае месца ў Еўропе па тэхнічнаму ўзроўню развіцця не толькі па ўзроўню тэхнікі, але і па размерах прамысловай прадукцыі, а таксама прадукцыі некаторых іншых асноўных галін народнай гаспадаркі. Совецкі Саюз будзе ісці ўперадзе, усіх краін Еўропы, але яшчэ будзе адставаць па раду галін ад Злучаных Штатаў Амерыкі. Усё гэта ўносіць істотныя змены ва ўзаемаадносіны СССР з капіталістычным светам і падымае барацьбу двух грамадскіх сістэм — социялістычнай і капіталістычнай—на новую, больш высокую ступень.

Асновай пад'ёму нашай краіны ў першай пяцігодцы была палітыка індустрыялізацыі. На аснове палітыкі індустрыялізацыі, забяспечыўшай стварэнне магутнай цяжкай прамысловасці, мы дабіліся велізарнага пад'ёму ўсёй народнай гаспадаркі.

У другім пяцігоддзі палітыка індустрыялізацыі знаходзіць сваё выражэнне ў далейшым павялічэнні ўдзельнай вагі прамысловасці ў галоўнай прадукцыі народнай гаспадаркі. Гэта відаць з наступнай табліцы:

Удзельная вага прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў валавой прадукцыі народнай гаспадаркі (у проц.)

	1932 г.	1937 г.
1. Прамысловасць (усяго)	76,8	79,5
2. Сельская гаспадарка	23,2	20,5
Разам	100,0	100,0

Такім чынам, у валавой прадукцыі народнай гаспадаркі к канцу другой пяцігодкі прадукцыя прамысловасці будзе складаць амаль 80 проц. Гэта значыць, што СССР будзе стаяць на ўзроўні самых індустрыяльных краін света—Германіі і ПАЗШ.

Другім пяцігадовым планам партыя ставіць задачу агромаднага павялічэння прамысловай прадукцыі. Гэта прадукцыя павінна ўзрасці з 43 млрд. рублёў у канцы першай пяцігодкі, да 103 млрд. руб. у апошнім годзе другой пяцігодкі. Гэта значыць, што прамысловая прадукцыя за другую пяцігодку павінна павялічыцца ў 2,4 раза, а ў параўнанні з даваенным узроўнем — у 9 раз. Такім чынам, наша індустрыя прадаўжае расці сапраўды большэвіцкімі тэмпамі.

Цяпер аб тэмпах росту прамысловасці. У адрозненне ад першай пяцігодкі, калі галоўная маса прадукцыі выраблялася на старых або асноўленых прадпрыемствах, тэхніка якіх была ўжо асвоена, у другой пяцігодцы галоўную масу прадукцыі будуць даваць новыя прадпрыемствы, асваенне якіх на першай стадыі звязана з рядам значных труднасцей. З гэтага вынікае, што, побач з задачай росту булаўніцтва, набывае выключнае значэнне задача асваення новай тэхнікі і новых вытворчасцяй. З гэтага, далей, вынікае, што ў параўнанні з тэмпамі росту прамысловай прадукцыі ў першай пяцігодцы (21-22 проц.) тэмпы прыросту прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы будуць некалькі меншыя (у сярэднім 19 проц. за год).

З другога боку нельга забываць, што кожны процант прыросту прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы будзе непараўнальна вышэй адпаведнага процанта прыросту ў першай пяцігодцы.

Сярэдні адзін процант прыросту прадукцыі прамысловасці ў канцы першай пяцігодкі ацэньваўся ў 386 млн. руб., у той час, як адзін проц. прыросту прадукцыі ў канцы другой пяцігодкі будзе раўняцца 825 млн. руб. Вось чаму, калі ў апошнія гады першай пяцігодкі гадавы прырост прадукцыі прамысловасці ацэньваўся ў 4-5 млрд. руб., то ў апошнім годзе другой пяцігодкі ён выразіцца сумай больш чым у 20 млрд. руб. Адно гэта павялічэнне прамысловай прадукцыі амаль у два разы перавышае ўсю прадукцыю буйнай (дакладней, пазаваўкі) прамысловасці царскай Расіі ў 1913 г. Вось што значыць большэвіцкія тэмпы росту прамысловасці!

Поспехі першай пяцігодкі даюць нам падставу паставіць перад сабой гэтыя гіганцкія новыя задачы.

Як вядома, стуленскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК у мінулым годзе ўстанавіў, што па валавой прадукцыі прамысловасці план апошняга года першай пяцігодкі быў выкананы у 1932 г. на 93,7 проц. Такавы былі папярэдніе даныя аб выкананні першай пяцігодкі. На пратыгу 1933 г. былі атрыманы спрэзаўчныя даныя прамысловасці, і на аснове іх былі зроблены ўдакладненыя падлікі рэзультатаў выканання першай пяцігодкі. Гэтыя падлікі не толькі не прывялі да зніжэння мяркуемага год таму назад выканання прамысловага плана першай пяцігодкі, а, наадварот, далі яшчэ больш спрыяльныя рэзультаты. Вось рэзультаты гэтых падлікаў у супастаўленні з папярэднімі вылічэннямі:

Прадукцыя цэнзавай прамысловасці (у цэнах 1926- 7 г.г.)

	Усяго прамысловасць	Прамысловасць групы „А"	Прамысловасць групы „Б"
1. План 1932-33 г. (па плану першай пяцігодкі) у млрд. руб.	36,6	17,4	19,2
2. Прадукцыя 1932 г. паводле папярэдніх вылічэнняў			
а) у млрд. руб.	34,3	18,0	16,3
б) у процантах да плана 1932-33 г.	93,7	103,4	84,9
3. Прадукцыя 1932 г. паводле справаздачных даных (у супастаўленні з пяцігадовым планам)			
а) у млрд. руб.	35,3	19,1	16,2
б) у процантах да плана 1932-33 г.	96,4	109,8	84,4

Такім чынам, як цяпер устаноўлена, па прамысловай прадукцыі план апошняга года першай пяцігодкі быў выкананы не на 93,7 проц., а на 96,4 проц., а па прамысловасці, стваральнай сродкі вытворчасці (група «А»), не на 103,4 проц., а на 109,8 проц.

Прыведзеныя паказальнікі выканання першай пяцігодкі па прамысловай прадукцыі—96,4 проц.—дастаткова пацвярджаюць поспехі выканання першай пяцігодкі (хоць і гэтыя паказальнікі не зусім поўныя). І гэта не гледзячы на тое, што ў нас былі спецыяльныя прычыны міжнароднага парадку, стварыўшыя ў канцы першай пяцігодкі затрудненні ў выкананні пяцігадовага плана.

Важнейшай асаблівасцю другой пяцігодкі з'яўляецца змяненне тэмпаў развіцця вытворчасці сродкаў вытворчасці (прамысловасць групы «А») і вытворчасці сродкаў спажывання (прамысловасць групы «Б»).

Калі ў першай пяцігодцы прамысловасць, якая стварае сродкі вытворчасці, разгортвалася адносна быстрэй, то ў другой пяцігодцы быстрэй за яе расце прамысловасць, якая стварае прадметы шырокага спажывання. Задачай першай пяцігодкі было стварэнне цяжкай індустрыі, як базы тэхнічнага пераўзбраення ўсёй гаспадаркі. З гэтай задачай мы справіліся. Цяпер мы маем магчымасць паскорана рушыць наперад і цяжкую, і лёгкую прамысловасць, дабіўшыся асаблівага паскарэння вытворчасці прадметаў шырокага спажывання.

У другой пяцігодцы заменены наступныя змены ва ўдзельнай вазе прадукцыі двух асноўных груп прамысловасці («А» і «Б»):

Змены ў суадносінах асноўных груп усёй прамысловасці за другую пяцігодку (у проц.)

	1932 г.	1937 г.
гр. «А» Прылады і сродкі вытворчасці	53,3	47,1
гр. «Б» Прадметы спажывання	46,7	52,9
Разам	100,0	100,0

Такім чынам, група «А» і група «Б» мяняюцца мясцамі. Гэта атрымліваецца ў рэзультаце таго, што тэмпы росту вытворчасці прадметаў спажывання ў другой пяцігодцы — 22 проц. — значна вышэй тэмпаў росту вытворчасці сродкаў вытворчасці—16 проц. Гэтыя тэмпы вышэй таксама тэмпаў росту вытворчасці прадметаў шырокага спажывання ў першай пяцігодцы (17 проц.). Адстаёўшая ад апошніх тэмпаў развіццё прамысловасці групы «Б» атрымлівае паскоранае развіццё — вышэй сярэдніх тэмпаў росту прамысловасці. Такім чынам, лёгкая і харчовая прамысловасць, а таксама іншыя галіны вытворчасці таварах шырокага спажывання стаяць перад новымі агромаднейшымі задачамі свайго развіцця.

Наша задача заключаецца не толькі ў забяспячэнні далейшага быстрага росту буйнай дзяржаўнай прамысловасці. У другой пяцігодцы мы павінны даць умоцненае развіццё і мясцовай прамысловасці, аказаўшы ёй дзяржаўнае падтрыманне. Задача заключаецца ў тым, каб у максімальнай меры скарыстаць мясцовыя крыніцы сыравіны і мясцовыя віды апалу, асабліва для павялічэння прадукцыі шырокага спажывання. Неабходна перадача значнай часткі прыбытку мясцовай прамысловасці ў распараджэнне мясцовых выканкомаў. Гэта будзе мець вялікае значэнне для далейшага развіцця самой мясцовай прамысловасці. З прычыны таго, што нашы мясцовыя органы, перш за ўсё абласныя арганізацыі, за апошнія гады значна памацнелі, мы павінны перадаць у веданне гэтых органаў рад прадпрыемстваў саюзнай і рэспубліканскай прамысловасці. У першую чаргу гэта адносіцца да тых прадпрыемстваў, якія працуюць галоўным чынам, на мясцовай сыравіне і мясцовым апале.

Няправільна таксама ігнараваць велізарныя магчымасці далейшага росту саматужнай прамысловасці. Не гледзячы на быстры пад'ём дзяржаўнай прамысловасці, саматужная прамысловасць можа і павінна даць немалую долю дадатковай прадукцыі для мясцовых рынкаў, а таксама для абслугоўвання прамысловасці падобнымі відамі вырабаў і будзе матэрыялам.

I. ПАД'ЁМ І РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Пераходжу да развіцця паасобных галін прамысловасці ў другой пяцігодцы.

Вось асноўныя задачы па важнейшых галінах прамысловасці, стваральных сродкі вытворчасці:

Рост валавой прадукцыі прамысловасці (па групе „А")

	1932 г.	1937 г.	1937 г. у проц. да 1932 г.
Вытворчасць сродкаў вытворчасці (у млрд. руб., у цэнах 1926-27 г)	23,1	48,4	209,4
У тым ліку:			
1. Машынабудаўніцтва (у млрд. руб.)	9,3	21	227
У тым ліку:			
а) варштаты металаапрацоўчыя (у тыс. штук)	15,0	40	267
б) цяжкае машынабудаўніцтва (млн. руб.)	148,3	415	280
в) трактары (ва ўмоўн. 15-сільных тыс. штук)	51,7	167	323
г) камбайны (у тыс штук)	10,0	25	250
д) паравозы (таварныя і пасажырскія ў пераліку на ўмоўныя «Э» і «СУ» у шт.).	828,6	2900	350
е) вагоны таварныя (у 2-восевым вылічэнні, у тыс. шт.)	22,2	128	576
ж) Аўтамабілі (у тыс. шт.)	23,9	200	837
з) Тэкстыльнае машынабудаўніцтва (млн. руб.)	60,1	360,0	599
і) харчовае машынабудаўніцтва (млн. руб.)	47,7	140,0	294
2. Электраэнергія (у млрд. квт.-гадз.)	13,4	38	283
У тым ліку:			
раённыя станцыі Галоўэнерго	8,3	25	302
3. Каменны вугаль (у млн. тон)	64,3	152	235
4. Нафта з газам (у млн. т.)	22,1	47	213
5. Чыгун (у млн. т.)	6,2	18	292
6. Сталь (у млн. т.)	5,8	19	328
7. Пракат (у млн. т.)	4,2	14	326
8. Медзь (у тыс. т.)	46,7	155	332
9. Хімія (у млрд. руб)	1,9	5,7	307
10. Пільматэрыялы (у млн. куб. м.)	24,4	43	176

З гэтай табліцы відаць, што ўсе важнейшыя галіны цяжкай прамысловасці атрымліваюць велізарнае развіццё, пры гэтым машынабудаўніцтва, якому належыць вядучая роля ў завяршэнні тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, разгорваецца быстрэй сярэдняга росту цяжкай прамысловасці. У рэзультаце гэтага ў апошнім годзе другой пяцігодкі 80 проц. усёй прамысловай прадукцыі будзе створана на новых прадпрыемствах, пабудаваных ці поўнасцю рэканструяваных на працягу першай і другой пяцігодкі, у той час, як у канцы першай пяцігодкі мы мелі толькі 35 проц. прадукцыі прамысловасці ад новых прадпрыемстваў.

Не толькі прамысловасць, але і іншыя галіны гаспадаркі павінны атрымаць для свайго тэхнічнага пераўзбраення велізарную колькасць машын. К канцу другой пяцігодкі не менш паловы (50-60 проц.) дзейнічаючых трактараў вытворчасці ва ўсёй народнай гаспадарцы будуць складаць тыя прылады вытворчасці, якія пакіраваны ў народную гаспадарку за гады другой пяцігодкі.

Мы ставім сваёй задачай забяспечыць правядзенне тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі ўлас...

(ПРАЦ...Г НА 4 СТАР...)

Працяг даклада тав. МОЛАТАВА

паляпшваецца ўдзельная вага больш складанага абсталявання — поўаўтаматы, аўтаматы, шліфавальныя, фрэзерныя, зубарэзныя і другія складаныя варштаты; асваенне да двухсот тыпа-размераў навейшых варштатаў; пастаноўка на вытворчасць значна большай колькасці варштатаў спецыяльнага тыпу для авіяцыйнай і аўтамабільнай прамысловасці, для транспартнага машынабудаўніцтва. Выраб варштатаў за гады другой пяцігодкі павінен скласці 129 тыс. штук, між тым, у канцы першай пяцігодкі ў СССР было ўсяго 169 тысяч металарэжучых варштатаў. Металургічная вытворчасць павінна быць поўнасцю забяспечана комплексным абсталяваннем. Быстра развіваецца таксама энергетычнае машынабудаўніцтва (турбіны, генератары, рухавікі ўнутранага згарання, паравыя коцлы), электратэхнічная прамысловасць моцных і слабых токаў, складанае хімічнае машынабудаўніцтва. Гігантскі расце транспартнае машынабудаўніцтва. Выраб аўтамабіляў павінен дасягнуць не менш 200 тысяч штук ў 1937 годзе.

Машынабудаўніцтва для харчовай прамысловасці павялічваецца ў 3 разы, для тэкстыльнай прамысловасці ў 6 раз. Сельска-гаспадарчае машынабудаўніцтва СССР ужо ў першай пяцігодцы стала найбольшым магутным па ўсім свеце. У другой пяцігодцы яно павінна павялічыцца амаль у 3 разы. У канцы другой пяцігодкі будзе вырабляцца за адзін год 167 тысяч трактароў (ва ўмоўных пятнаццаці-сільных) і 25 тысяч камбайнаў.

Завяршэнне справы тэхнічнай рэконструкцыі неадлучна звязана з шырокім ажыццяўленнем механізацыі працаёмкіх і цяжкіх працэсаў у прамысловасці. Гэта асабліва датычыць такіх важных галін прамысловасці, як каменнавугальная, лясная, тарфяная, чорная металургія, будаўніцтва. Прыхільнае росту механізацыі можа служыць каменнавугальная прамысловасць, дзе амаль поўнасцю будуць механізаваны ўсе асноўныя працэсы работы: зарубка — 93 проц., адбітка — 80 проц., дастаўка — 90 проц.

У Савецкім Саюзе машына з'яўляецца ў сапраўдным сэнсе вызваліцелем і прыяцелем працоўных, абцяжараючы цяжкую работу, павялічваючы прадукцыйнасць працы і падвышаючы дабрабыт працоўных.

Першастэпенное значэнне для справы рэконструкцыі народнай гаспадаркі мае электрыфікацыя. У другой пяцігодцы ў спрыяльнай меры ўзрастае патрэба ў электраэнергіі. Асабліва быстра развіваецца выкарыстанне электраэнергіі для хімічных і тэрмічных мэтаў, перш за ўсё ў металургіі, хіміі і машынабудаўніцтве. Буйнейшае значэнне электрыфікацыя будзе мець для транспарта, асабліва на найбольш цяжка напружаных участках чыгунак Донбаса, Прыдняпроўя, Закаўказзя, Урала і інш. У гэты-жа перыяд па чыстае прыметна павялічваецца спажыванне электраэнергіі ў сельскагаспадарчай вытворчасці — электраметадыцы і інш.

Выраб электраэнергіі павінен узняцца за другую пяцігодку з 18,4 млрд. кілават-гадзін да 38 млрд. кілават-гадзін, г. зн. амаль падвоіцца. Па колькасці вытворчасці электраэнергіі СССР апераджае ўсе еўрапейскія краіны і выйдзе на другое месца ў свеце.

Электраўзброенасць аднаго рабочага ў СССР будзе дасягаць 68 проц. электраўзброенасці аднаго рабочага ў ЗША і больш чым 150 проц. у адносінах электраўзброенасці рабочага ў Германіі. Ні ў якое параўнанне з дарэвалюцыйным перыядам электраўзброенасць рабочых СССР пойдзе наставіць. У гэтым росце электраўзброенасці заключаецца адзін з самых важных паказальнікаў тэхнічнага пераўзбраення нашай краіны.

Апаляная прамысловасць таксама атрымлівае велізарны рост за другую пяцігодку. Здабыча каменнага вугалю павялічваецца з 64,8 млн. тон да 152,5 млн. тон. Нафтавая прамысловасць дае павялічэнне з 22,3 да 47,5 млн. тон.

Торфяная, а таксама сланцавая прамысловасць, як мясцовы апал, павінна атрымаць далейшае і прытым большае развіццё.

Чорная металургія павінна ліквідаваць свае адставанне ад агульных тэмпаў росту народнай гаспадаркі і поўнасцю задаволіць узрастаючыя запатрабаванні краіны на метал. Вытворчасць чыгуну павінна падняцца з 6,2 да 18 млн. тон, вытворчасць сталі з 5,9 да 19 млн. тон, вытворчасць пракату з 4,3 да 14 млн. тон. Наша металургія як па магутнасці вытворчага апарата, так і па вытворчасці прадукцыі павінна выйсці на першае месца ў Еўропе, хоць будзе яшчэ стаяць значна ззаду металургіі ЗША.

Асабліва вялікае значэнне мае развіццё вытворчасці якаснага пракату і электрасталі, а таксама вытворчасці ферасплаваў. Необходна таксама правесці шырокую рэканструкцыю жалезарудной прамысловасці і на аснове забяспечыць укараненне метадаў узбагачэння і аглямерацыі руд. Барацьба за чорную металургію і ў другой пяцігодцы будзе стаяць у цэнтры нашых гаспадарчых задач.

Асабліва адстала ад тэмпаў агульнага развіцця каляровая металургія. Між тым, нельга забяспечыць патрабнага развіцця машынабудаўніцтва і электрыфікацыі, не гаворачы ўжо аб патрэбах абароны, без рашучага падёму такіх галін прамысловасці, як медзь, алюміній і іншых. Ліквідаваць адставанне каляровай металургіі і завяршыць яе тэхнічную рэканструкцыю — адна з важнейшых задач другой пяцігодкі.

Хімічная прамысловасць павінна адыграць у другой пяцігодцы буйнейшую ролю ў тэхнічнай рэканструкцыі. У перыяд першай пяцігодкі нанава створан рад галін хімічнай прамысловасці, як азотная, коксахімічная, анілафарбавальная, калійная, апатытавая і інш. У другой пяцігодцы стварэнне тэпы рад новых хімічных вытворчасцей, як: хімічная пераапрацоўка вугалю, торфу і сланцаў, новыя віды фарбавальніку, разгортваецца вытворчасць штучных мас, сінтэтычнага каўчука і іншых.

Вытворчасць мінеральных угнаенняў за пяцігоддзе павінна ўзняцца ў дзесяць раз. Развіццё гэтай прамысловасці для нашай гаспадаркі і для абароны краіны мае выключнае значэнне.

Перахожу да прамысловасці, вырабляючай прадметы спажывання. Вось табліца з радам важнейшых паказальнікаў па гэтых галінах вытворчасці:

Рост валавой прадукцыі прамысловасці (па групе „Б")

	1932 г.	1937 г.	1937 г. у процантах да 1932 г.
Вытворчасць сроднаў спажывання (ў млрд. руб., у цэнах 1926-27 г.)	20,2	54,3	268,8
У тым ліку:			
1) Наркамлегпром	6,7	20,5	308
2) Наркамснаб	4,6	12,9	283
3) Наркамцяжпром (шырспажыў)	0,96	2,9	300
4) Промкааперацыя	1,9	6	310
5) Камгаг СНК (мукамольная, крупяная і інш.)	1,0	2,5	250
6) Вытворчасць тавараў шырспажыву іншымі гаспадарчымі арганізацыямі	4,8	8,6	181
Па асобных відах лёгкай прамысловасці:			
а) баваўнянай тканіны (з тавар. сураўём), млн. метраў, усяго	2719,7	6250	229,8
б) шарсцяныя тканіны, млн. метр., усяго	91,8	270	295,7
в) абутак скураны, млн. пар, усяго	81,9	205	250,3
г) шкло, тыс. тон, усяго	396,4	1033,0	260,6
д) мыла (у перавод. на 40 проц.-00) тыс. тон, усяго.	357,2	1300,0	363,9
Па асобных відах харчовай прамысловасці:			
а) мяса, тыс. тон	435,0	1250,0	287,4
б) рыба—ўлоў, тыс. тон	1333,0	1900,0	142,5
в) масла жывёльнае, тыс. тон	65,1	180,0	276,5
г) кансервы, млн. умоўн. банак	716,0	2400,0	335,2

З табліцы відаць, што за пяцігодку вытворчасць прадметаў шырокага спажывання лёгкай прамысловасці ўзрасце з 6,7 млрд. рублёў да 20,5 млрд. рублёў, г. зн. больш, чым у тры разы. Прадукцыя ўсёй харчовай прамысловасці ўзрасце з 5,6 млрд. руб. да 15,6 млрд. руб., г. зн. больш чым у 2,8 раза супроць канца першай пяцігодкі. Узрастае значна і вытворчасць тавараў шырспажыву па Наркамцяжпрому, а іменна: выпуск металічных вырабаў павышаецца ў 4,2 раза, вытворчасць веласіпедаў павялічваецца ў 5,5 раза, гадзіннікаў у 5,8 раза, фатаграфічных апаратаў у 12,5 раза, лампавых радыёпрыёмнікаў больш, чым у дваццаць раз, металічнай пасуды ў чатыры разы і т. д.

Па ўзроўню тэхнічнай узброенасці лёгкая прамысловасць Саюза выходзіць к канцу другой пяцігодкі на адно з першых месц у свеце. Хутка расце і дасягае аграмадных размераў прымяненне аўтаматычных варштатаў у ткацтве, у баваўняна-паняровай прамысловасці, у шарсцяной прамысловасці. Па прадзенню мы пераходзім да шырокага прымянення вельмі дасканалага ватэра вынаходства совецкага інжынера Хрушчова, па ткацтву — да лепшага сучаснага ткацкага варштата Шангера. У ільнянай прамысловасці ўводзіцца новы ватэр вынаходства совецкага інжынера Зварыкіна, павялічваючы прадукцыйнасць цяперашніх ватэраў на 40 проц. і значна паляпшаючы прадзіва. Значная тэхнічная рэканструкцыя праводзіцца ў абутковай прамысловасці, у шкляной і фарфаравай вытворчасці, а таксама ў паньковаджутавай прамысловасці, дзе вынайдзеная совецкім інжынерам Раманавым сецявязальная машына павышае прадукцыйнасць дзействуючых машын у некалькі раз.

У харчовай прамысловасці за першую пяцігодку створан рад новых галін: мясная індустрыя з такімі магутнымі і першакласна-тэхнічна ўзброенымі прадпрыемствамі, як Маскоўскі і Ленінградскі мясакамбінаты; магутная кансервовая прамысловасць, механізаванае хлебапячэнне ў такіх гарадах, як Масква, Ленінград і інш.; маргарынавая, гідрагенізацыйная, плодагародная і рад іншых галін. Многае зроблена і ў тэхнічным пераўзбраенні рыбнай прамысловасці. Арганізавана буйная халадзільная гаспадарка ў найбольш важных індустрыяльных цэнтрах. Механізаваныя прадпрыемствы грамадскага харчавання, буйныя сталовыя і фабрыкі-кухні з вялікім механічным абсталяваннем занялі выдатнае месца ў арганізацыі снабжэння гарадоў. У другой пяцігодцы найбольшы тэмп росту намечан па цукравай, кансервовай і мясной прамысловасці, па вытворчасці пшанічнай мукі, макарон, кандытарскіх вырабаў, чаю, а таксама мыла. Прамысловасць, выпрацоўваючая харчовыя тлушчы, ідзе на ўзроўню росту перадавых галін і расце больш, чым у тры разы. У рэзультаце завяршэння тэхнічнай рэканструкцыі, СССР к канцу пяцігодкі становіцца па абёму прадукцыі харчовай прамысловасці на першае месца ў Еўропе.

Трэба асоба ўказаць на тое, што лёгкая і харчовая прамысловасць павінны ў другой пяцігодцы з года ў год значна павышаць тэмпы свайго развіцця. У адпаведнасці з гэтым павінна разгортвацца іх тэхнічная рэканструкцыя і забеспячэнне сельска-гаспадарчай сыравінай.

Калі да ўсіх галін прамысловасці адносіцца патрабаванне партыі рашучага паляпшэння якасці прадукцыі, то бадай, у асаблівасці гэта адносіцца да вытворчасці тавараў спажывання. Перад лёгкай прамысловасцю стаяць такія задачы, як значнае паляпшэнне якасці баваўняна-паняровых тканін, паляпшэнне краскі рысунка, павялічэнне долі тонкасуконных і камвольных груп шарсцяной прамысловасці, павялічэнне моцнасці абутку, перыяд пасуды і г. д. Перад харчовай

2. ПАД'ЁМ І РЭКАНСТРУКЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

У сельскай гаспадарцы ў першай пяцігодцы не было такога хуткага пад'ёму, як у прамысловасці. Пад'ём тут ужо захапіў зернавую гаспадарку і тэхнічныя культуры, але адначасова мы мелі падзенне жывёлагадоўлі і скарачэнне паголоўя.

У сельскай гаспадарцы адбыўся не толькі пераварот у тэхнічным узбраенні, але, што асабліва важна, і ў самой яе грамадскай арганізацыі.

Тав. **Сталін** у справаздачы ЦК разгарнуў карціну карэннай рэарганізацыі сельскай гаспадаркі, якая адбылася за апошнія гады. Стварэнне 200 тысяч калгасаў, 5 тысяч соўгасаў і 3 тысяч МТС адносіцца да апошніх 4-5 год. Такая перабудова ўсёй, і ва ўсякім выпадку пераважнай часткі, сельскай гаспадаркі не магла прайсці дарма. Яна была звязана з аграмадныміі труднасцямі і ў рэарганізацыйны перыяд нельга было дабіцца вялікага паскарэння тэмпаў пад'ёму сельскай гаспадаркі.

Буйнейшым дасягненнем гэтага перыяда з'яўляецца ўжо той факт, што не гледзячы на вялікае скарачэнне жывёлы, мы дабіліся не толькі росту пасеўных плошчаў, але і павялічэння прадукцыі па раду важнейшых культур. Гэтага можна было дабіцца толькі дзякуючы тым перавагам у арганізацыі сельскай гаспадаркі, якія маюць калгасы і соўгасы перад дробнай адпрасобнай селянскай гаспадаркай. Гэтага можна было дабіцца дзякуючы таму, што разам з сацыяльнай перабудовай у вёсцы адбывалася тэхнічнае пераўзбраенне сельскай гаспадаркі, якое праявілася ў перадачы сельскай гаспадарцы аграмадной колькасці трактароў, аўтамабіляў, камбайнаў і іншых сельска-гаспадарчых машын. Гатага можна было дабіцца толькі дзякуючы таму, што партыя і ўсе органы пролетарскай дыктатуры забяспечылі разгром кулацтва і разгарнулі аграмадную арганізацыйна-палітычную работу ў вёсцы, умацаваўшы калгасы і соўгасы, узняўшы калгасную дысцыпліну, выхаваўшы новы калгасны актыў.

К сучаснаму моманту, калі перабудова сельскай гаспадаркі з адпрасобнай у калгасную ў асноўным закончана, стварыліся другія непараўнальна больш спрыяючыя ўмовы для пад'ёму сельскай гаспадаркі. Тав. **Сталін** сказаў у сваім дакладзе на з'ездзе:

«Па сутнасці справы справаздачны перыяд быў для сельскай гаспадаркі не столькі перыядам хуткага пад'ёму і магутнага разбегу, колькі перыядам стварэння прадпасылак для такога пад'ёму і такога разбегу ў бліжэйшым будучым».

Цяпер ад нас залежыць рэалізаваць гэтыя указанні і сапраўды забяспечыць быстры пад'ём сельскай гаспадаркі ў бліжэйшыя гады.

Як стаіць задача пад'ёму сельскай гаспадаркі ў другой пяцігодцы?

Маштаб задач відаць перш за ўсё з наступных паказальнікаў па павялічэнню валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў другой пяцігодцы:

Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ў другой пяцігодцы (у млн. цэнтн.)

КУЛЬТУРЫ	1932 г.	1937 г.	1937 г. у процантах да 1932 года
1. Усяго зернавых	698,7	1105,6	158,2
2. Тэхнічных:			
а) баваўна-сырэц	12,7	22,5	177,7
б) лён (валакно)	5,0	9,0	180,0
в) цукровы бурак	65,6	276,0	420,7
г) сланечнік	22,6	35.7	158,0

Выкананне гэтых задаткаў па валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі поўнасцю забяспечыць нашы патрэбы ў зернавых культурах, а таксама ў асноўным задаволіць нашы патрэбы ў тэхнічных культурах. Асабліва быстры рост, у параўнанні з канцом першай пяцігодкі, намечан па цукровых бураках, для якіх 1932 год быў годам найбольшага ўпадку.

Пяцігадовы план не намячае вялікага павялічэння пасеўных плошчаў.

Пасеўныя плошчы ў першай і другой пяцігодцы (у тыс. га)

	1932 г.	1937 г.	1937 г. у процантах да 1932 года
Уся пасеўная плошча	134.435	140.000	105.1
У тым ліку:			
а) зернавыя	99.711	140.000	104,1
б) тэхнічныя	14.877	14.050	94,5
в) гародня-бахчавыя	9.215	9.600	104,2
г) кармовыя	10.632	11.550	108,6

План дае павялічэнне ўсіх пасеўных плошчаў з 134.435 тыс. га ў 1932 г. да 140 млн. га ў 1937 г., г. зн. толькі на 4 проц. за пяцігодку. Па тэхнічных культурах, дзе разбег у росце пасеўных плошчаў у апошнія гады быў часамі праверна вялікі, улічана нават некаторае скарачэнне пасеўных плошчаў на 5,5 проц. Толькі ў цэнтральнай спажываючай паласе, а таксама ў Сібіры і на Далёкім Усходзе, перад намі стаіць задача далейшага значнага павялічэння пасеўных плошчаў.

Галоўнай задачай сельскай гаспадаркі ў другой пяцігодцы з'яўляецца задача павышэння ўраджайнасці. Вось табліца, якая паказвае на тыя задачы, якія стаяць перад намі ў справе пад'ёму ўраджайнасці:

Ураджайнасць у першай і другой пяцігодцы (у цэнтн. з га)

	Сярэдняе за 1928-32 г.	1937 г.	1937 г. у процантах да 1928-32 г.
Зернавыя ўсе	7.5	10,6	141,4
У тым ліку:			
пшаніца азімая	8,6	12,0	139,6
пшаніца яравая	6,1	8,5	139.4
жыта	8,0	11,5	143,8
авёс	8,3	11,2	134,8
ячмень	8,2	10,5	128,1
кукуруза	8,9	14,5	162,8
Тэхнічныя:			
баваўна-сырэц	7,5	12,0	160,0
лён-даўгунец (валакно)	2,2	3,7	165,8
цукровы бурак	120,1	200,0	166,6
сланечнік	5,5	8,5	154,6

З гэтай табліцы відаць, якія велізарныя задачы стаяць перад намі ў справе павышэння ўраджайнасці. Па зернавых культурах мы павінны забяспечыць павышэнне ўраджайнасці звыш 40 проц., па бавоўне, ільну і цукроваму бураку—60 проц. і больш, па сланечніку — звыш 50 проц.

Такія задачы мы можам паставіць толькі цяпер, пасля сканчэння рэарганізацыйнага перыяда, пасля таго, як у асноўным перабудова дробных селянскіх гаспадарак у буйныя калгасныя гаспадаркі закончана і калгасы дабіліся пэўнага ўмацавання. Што гэтыя задачы нам па плячы, гаворыць прайноўшы год, калі адразу-ж пасля завяршэння рэарганізацыйнага перыяда мы змаглі дабіцца значнага росту прадукцыі зернавых і тэхнічных культур.

У галіне жывёлагадоўлі мы таксама ставім буйнейшыя задачы ў другой пяцігодцы. У чым заключаюцца гэтыя задачы, відаць з наступнай табліцы:

Паголоўе жывёлы па СССР (у мільёнах галоў)

	1916 г.	1928 г.	1932 г.	1937 г.	1937 г. у процантах да 1932 г.
1. Коні	35,1	33,5	19,6	21,8	111,2
2. Буйная рагатая жывёла	58,9	70,5	40,7	65,5	160,0
3. Авечкі і козы	115,2	146,7	52,1	96,0	184,3
4. Свінні	20,3	25,9	11,6	43,4	374,1

З гэтай табліцы відаць, што па конях мы і к канцу другой пяцігодкі далёка яшчэ не дойдзем да вышэйшага пункту, які мелі ў мінулым. Па буйнай рагатай жывёле мы блізка падыйдзем да найвышэйшага ўзроўню ў мінулым (1928 г.). Па авечках і козах мы ставім задачу амаль падвоення паголоўя і ўсё-ж яшчэ не зможам забяспечыць узроўню 1928 г. Па свінняй пяцігодка намячае павялічэнне амаль у чатыры разы. Па паголоўю свіней мы ў 1937 г. павінны ў два з лішкам разы перавысіць вышэйшы ўзровень за ўвесь мінулы перыяд.

Усяго гэтага ў росце паголоўя жывёлы мы зможам дабіцца толькі ўпартай работай па паляпшэнню справы ў жывёлагадоўчых соўгасах і калгасна-таварных фермах і пры ўсямерным падтрыманні развіцця жывёлагадоўлі паасобных калгаснікаў.

Мы павінны, апрача таго, дабіцца значнага павышэння якасных паказальнікаў па жывёлагадоўлі (удой, жывая вага, рост маладняка і інш.). Усёй арганізацыяй работы па падняццю жывёлагадоўлі мы павінны даказаць большэвіцкую здольнасць хутка выраўляць адсталыя ўчасткі работы і ўменне забяспечыць вырашэнне важнейшай гаспадарчай задачы большэвіцкімі тэмпамі.

Галоўнае, што неабходна для забяспечэння хуткага пад'ёму сельскай гаспадаркі, **гэта арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне** калгасаў і соўгасаў. Для таго, каб выканаць задачы другой пяцігодкі, калгасы і соўгасы павінны ў корані палепшыць сваю работу і завесці парадкі, вартыя буйнай арганізаванай механізаванай гаспадаркі. Партыя зрабіла ўсё для таго, каб палітычная работа ў калгасах і кіраўніцтва справай іх арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання было значна ўзнята. Палітаддзелы МТС і соўгасаў за адзін год даказалі, якое рашаючае значэнне маюць моцныя большэвіцкія кадры ў кіраўніцтве масамі, у іх барацьбе супроць кулакоў і падкулачнікаў і ва ўсёй справе ператварэння калгасаў у большэвіцкія калгасы. Растучы калгасны актыў і актыўнасць калгасных мас, знаходзячыя сваё выяўленне ў разгортваючымся калгасным спаборніцтве, ва ўмацаванні калгаснай дысцыпліны, у паляпшэнні арганізацыі калгаснай працы (асабліва ўборкі ўраджаю), у новых адносінах да калгаснай уласнасці і да выканання абавязацельстваў перад совецкай дзяржавай, з'яўляюцца надзейнай апорай калгаснай справы і пад'ёму сельскай гаспадаркі.

У велізарнай меры выкананне пастаўленых перад сельскай гаспадаркай задач другой пяцігодкі будзе залежаць ад **тэхнічнага пераўзбраення** соўгасаў і калгасаў. Пытанне аб механізацыі сельскай гаспадаркі ў другой пяцігодцы ставіцца ва ўвесь рост.

Як расце трактарны парк у сельскай гаспадарцы, відаць з наступнага:

Магутнасць трактарнага парку ў сельскай гаспадарцы (з улікам амартызацыі)

Годы	Тыс. конскіх сіл
1932 г.	2.225
1933 г.	3.100
1934 г.	4.400
1935 г.	5.575
1936 г.	6.675
1937 г.	8.200
1937 у %% да 1932 г.	368,5

З табліцы відаць, што трактарны парк у сельскай гаспадарцы шпаркарасце з кожным годам (але з прычыны перабудовы Сталінградскага завода на вусенічны трактар-прырост магутнасці трактарнага парка ў 1935-36 г. г. некалькі змяншаецца). Пераважная частка трактараў паступае МТС; тым самым трактарная база калгасаў гіганцкі ўзмацняецца. Выключнае значэнне будзе мець той факт, што замест 5 тысяч вусенічных трактароў, якія сельская гаспадарка атрымала ў першую пяцігодку, за другую пяцігодку ў сельскую гаспадарку паступіць звыш 100 тыс. вусенічных трактароў. Гэтыя трактары, дзякуючы раду пераваг (больш глыбокае ворыва, работа ранняй вясной) дадуць на аблягчаюць барацьбу за падняцце ўраджайнасці. Апрача таго, у сельскую гаспадарку паступяць 35 тысяч прапашных трактароў, што ў вялікай зарнай меры аблягчае барацьбу з далейшым пад'ём тэхнічных культур.

Агульная колькасць МТС узрастае да 6 тыс. і к канцу другой пяцігодкі яны ахопяць усе калгасы. Лік соўгасаў таксама павінен павялічыцца, галоўным чынам, кошт разузбуйнення надзвычайных зернавых соўгасаў.

Як пры гэтым павялічваецца за механізацыі сельскай гаспадаркі відаць з наступнай табліцы:

Парк сельска-гаспадарчых машын ва ўсёй сельскай гаспадарцы (соўгасы, МТС, калгасы)

	1932 г.	1937 г.
АРЫТЭНАЛ 64		
Камбайны (тыс. штук)	15,5	100
Складаныя і поўскладаныя малатарні (тыс. штук)	47,7	80
Электраўстаноўкі (тыс. квт.)	65,9	425
Рамонтныя майстэрні	2.820	6.920
Грузавыя аўтамабілі (тыс. штук)	14,5	128
Легкавыя аўтамабілі (тыс. штук)	1	42

Усё гэта забяспечвае завяршэнне механізацыі сельскай гаспадаркі. Гэта знойдзе сабе выражэнне ў тым, што ў 1934 г. ворыва і зяблева будуць механізаваны пры дапамозе трактароў на 80 проц., культывацыя на 70 проц., уборка зернавых на 60 проц., малацьба механізуецца на 100 проц.

Цяпер відаць, што наша сельская гаспадарка к канцу другой пяцігодкі будзе зусім не падобна на тую, якой яна была ўсяго некалькі год таму назад. Мы з поўным правам можам сказаць, што сельска-гаспадарчая праца ператвараецца ў працу індустрыяльную.

Побач з механізацыяй, неабходна разгарнуць работу па правядзенню **агратэхнічных мерапрыемстваў** і ўкараненню мінеральных угнаенняў. Наша хімічная прамысловасць павінна прыкладна ў дзесяць раз павялічыць вытворчасць угнаенняў к канцу пяцігодкі. У рэзультаце гэтага ўгнаення плошча вельмі ўзрастае: на паліўной бавоўне азотам і фосфарам будзе ўгнойвацца да 60 проц. і калієм 40 проц., а фосфарам — 100 проц. пасеўнай плошчы. З яшчэ большай настойлівасцю трэба прадаўжаць і ўгнаенне зямлі гноем.

У правядзенні агратэхнічных мерапрыемстваў мы яшчэ вельмі адстаем. Між тым, ад правядзення такіх мерапрыемстваў, як зяблева ворыва, узняцце чыстых папараў, пераход на гатункавае насенне і шырокае выкарыстанне ўгнаенняў многім залежыць выкананне задачы пад'ёму ўраджайнасці зернавых і тэхнічных культур.

Вопыт паказаў, што ў тых выпадках, калі мясцовыя арганізацыі ўмеюць абаперціся ў правядзенні гэтых мерапрыемстваў на калгасы, мы дабіваемся сур'ёзных рэзультатаў. У другой пяцігодцы калгасы могуць паказаць у гэтай справе выключную сілу. Буйная калгасная гаспадарка, якая апіраецца на велізарную машынную тэхніку, на моцную арганізацыю мільёнаў калгаснікаў у правядзенні агратэхнічных мерапрыемстваў — гэта сила, якая літаральна можа зрушыць горы.

Такім чынам, мы яшчэ стаім на вельмі нізкім узроўні развіцця сельскай гаспадаркі, але ў нашых руках найвялікшыя прадпасылкі шпаркага пад'ёму сельска-гаспадарчай вытворчасці. Усё залежыць ад нас, ад нашага ўмення скарыстаць быстраўзрастаючую тэхнічную базу, ад нашага ўмення арганізаваць соўгасы і калгасы як буйную механізаваную гаспадарку, у якой прадукцыйнасць працы можа быць сапраўды будзе непараўнана больш высокай, чым прадукцыйнасць працы ў дробнай селянскай гаспадарцы. Вось чаму мы ставім свае задачы забяспечыць, прыкладна, такія-ж тэмпы пад'ёму сельскай гаспадаркі ў другой пяцігодцы, як тэмпы росту нашай прамысловасці.

3. ПАД'ЁМ І РЭКАНСТРУКЦЫЯ ТРАНСПАРТА

Аграмадны рост прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, разгортванне тавараазвароту паміж гарадам і вёскай і быстры пад'ём дабрабыту і культуры працоўных ставяць перад транспартам буйнейшыя задачы. У пад'ёме народнай гаспадаркі і развіцці культуры транспарту належыць актыўная роля. Ад росту работы транспарта залежыць развіццё народнай гаспадаркі, не гаворачы ўжо аб тым, што задачы гаспадарчага і культурнага пад'ёму ў новых раёнах, якія знаходзяцца далёка ад цэнтра, невыканальны без значнага развіцця транспарта.

У другой пяцігодцы грузазварот быстра расце. Гэта відаць з наступных даных.

Грузазварот у другой пяцігодцы (у млрд. тона-кілометраў)

	1932 г.	1937 г.	1937 г. у процантах да 1932 года
1. Чыгункі	169,3	302	178,4
2. Рачны транспарт (перавозкі за цягай)	26,1	64	245,2
3. Морскі транспарт (перавозка на совецкіх суднах)	18,2	51	280,2

З гэтага відаць, што рашаючая роля ў агульным грузазвароце належыць чыгуначнаму транспарту.

Мы і цяпер кожны дзень ужо адчуваем, як рост народнай гаспадаркі ўпіраецца ў наш транспарт. Не можа быць сумненняў у тым, што многае тут залежыць ад паляпшэння самога кіраўніцтва чыгуначным транспартам. Забяспечыць сапраўднае правядзенне ў жыццё даных партыяй дырэктыў і разгарнуць на справе барацьбу з канцылярска-бюракратычнымі метадамі ў кіраўніцтве чыгуначным транспартам — гэта адна з асноўных нашых задач. Без вырашэння гэтай задачы мы не забяспечым самых асноўных патрэб развіцця народнай гаспадаркі.

У нездавальняючай рабоце чыгуначнага транспарта сказваецца і яго адсталасць у тэхнічным узбраенні. Гэта адсталасць таксама павінна быць як мага хутчэй ліквідавана. У сувязі з задачай хуткага павялічэння грузазвароту, справа тэхнічнай рэканструкцыі транспарта, і перш за ўсё чыгуначнага транспарта, павінна стаць у цэнтры нашых гаспадарчых задач.

Якавы асноўныя шляхі рэканструкцыі чыгуначнага транспарта?

У другой пяцігодцы павінна быць ажыццёўлена электрыфікацыя 5 тысяч кілометраў чыгуначных ліній. Пачынае разгортвацца пераход на цепловозы. На найбольш затруднёных магістралях, і перш за ўсё на дарогах Урала-Кузбаса, Данбаса, Забайкальскай і Усурыйскай, а ўсяго на працягу 9.500 кілометраў, укладваюцца другія шляхі. Аўтаблакіроўка павінна ахапіць 8.300 клм. замест меўшыхся на канец першай пяцігодкі 582 клм.

Вялікае значэнне маюць мерапрыемствы, намечаныя ў адносінах рухомага саставу. Аб гэтых мерапрыемствах можна судзіць па наступнай табліцы:

Павялічэнне магутнасці рухомага саставу чыгуначнага транспарта за другую пяцігодку

	1932 г.	1937 г.	1937 г. у процантах да 1932 года
1. Усяго лакаматываў, штук	19.475	24.600	126,5
а) таварныя лакаматывы, шт.	16.350	19.720	120,6
б) агульная цягавая сіла таварных лакаматываў, тыс. тон.	196,2	297	151,3
в) пасажырскія лакаматывы, штук	3.125	4.880	155,8
г) агульная цягавая сіла лакаматываў пасажырскіх, тыс. тон	26,4	46,5	176,1
2. Электравозы, штук	10	410	—
3. Цеплавозы, штук	6	276	—
4. Усяго вагонаў, тыс. штук	536,0	686	127,8
а) таварныя вагоны, тыс. штук	507,9	644	126,7
б) агульная грузапад'ёмнасць таварных вагонаў, у млн. тон	9,5	15,8	166,3
в) пасажырскія вагоны, тыс. штук	29	42	144,8

З гэтай табліцы відаць, што агульная цягавая сіла ўзрастае значна быстрэй, чым колькасць саміх паравозаў. Гэта тлумачыцца тым, што чыгуначны транспарт у значнай мары пераходзіць на магутныя таварныя паравозы тыпу «ФД» і на магутныя пасажырскія паравозы тыпу «ІС». З гэтай табліцы відаць таксама, што грузападзёмнасць таварных вагонаў расце значна быстрэй, чым сама колькасць таварных вагонаў. Гэта тлумачыцца тым, што другім пяцігоддзі будуць выраблены на галоўным чынам вялікагрузныя вагоны. Асноўным тыпам вагона становіцца чатырохосевы вялікагрузны вагон. Увесь вагонны парк абсталёўваецца аўтатармазамі і г. д. Менш паловы вагоннага парка абсталёўвацца, што мае вялікае значэнне для павялічэння праваздольнасці чыгунак.

З усіх новых чыгуначных будаўніцтваў выдзяляецца грандыёзнасцю будовы Байкала-Амурская магістраль працяжнасцю ў 1400 клм. Яна злучыць Забайкалле з нізоўямі Амура і будзе спрыяць упяцяненню ў гаспадарчае жыццё аграмадных прасторы, бытуючай да гэтага часу ў значнай частцы недаступнай чалавеку.

Усе гэтыя мерапрыемствы маюць на ўвазе адну мэту: ліквідаваць адставанне чыгуначнага транспарта ад агульнага росту народнай гаспадаркі. Прагрэсіўнае ўказаных і рэд другіх мерапрыемстваў па тэхнічнаму пераўзбраенню чыгуначнага транспарта, пры правільнай арганізацыі выкарыстання рухомага саставу і чыгуначнай сеткі і пры ўзгадненым развіцці рамонтнай базы, поўнасцю забяспечвае вырашэнне пастаўленых перад чыгуначным транспартам задач.

Значэнне воднага транспарта і другой пяцігодцы вельмі ўзрастае. Узрастае і сетка водных шляхоў. У першым годзе другой пяцігодкі закончана будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала імя Сталіна даўжынёй у 227 кілометраў. Пачата ўжо і вядзецца аграмадныміі тэмпамі работа па будаўніцтву канала Волга-Масква, даўжынёю ў 127 кілометраў, — канала, які непасрэдна сталіцу Совецкага Саюза ў партовы горад з залогам буйнейшых тагоннага суднаў. Нарэшце, у другой пяцігодцы будуецца Волга-Дон-канал, даўжынёю ў 100 кілометраў. У сувязі з пабудовай гэтых новых шляхоў, злучаючых Белае з Балтыйскім морамі, Балтыйскае з Чорным морам, Маскву з Волгай, і ў сувязі з тэхнічнымі цяперашнімі водных сістэм (Марыінскай і Маскваецкай) стварэнне адзінай магутнай водная сістэма ў еўрапейскай частцы СССР.

Справа абнаўлення і рэканструкцыі рэчнага, а таксама марскога транспарта павінны быць значна падняты ў другой пяцігодцы. Гэта ў немалой ступені аблегчыць чыгуначнаму транспарту выкананне яго задач.

Хутка расце народна-гаспадарчае значэнне аўтадарожнага транспарта і будаўніцтва новых шасейных да-

(ПРАЦЯГ НА 3 СТАР.).

Працяг даклада тав. МОЛАТАВА

рот. У нашай краіне за гэтай справай вялікая будучыня.

Паветраны транспарт будзе адыгрываць велізарную ролю па сувязі з аддалёнымі раёнамі і з оунымі прамысловымі цэнтрамі.

Вялізную ролю ў ажыццяўленні задач другой пяцігодкі павінна выканаць арганізацыя сувязі, асабліва радыёсувязі, значэнне якой ў забеспячэнні быстрага апераціўнага кіраўніцтва работай усіх галін народнай гаспадаркі і ў культурным будаўніцтве расце з кожным днём.

У заключэнне, па пытанню аб рэканструкцыі транспарта я павінен падкрэсліць асноўную мысль. Мы павінны правесці аграмадную работу па тэхнічнаму перабраенню шляхта транспарта і перш за ўсё чыгуначнага. Але тыя грамадныя ўкладанні ў новую тэхніку, якія мы павінны даць транспарту ў другой пяцігодцы, трэба выкарыстаць пасапраўднаму. Для гэтага ўся арганізацыя чыгуначнага транспарта павінна быць узнята на непараўнальна большую вышыню, чым зараз. Трэба прызнаць, што і з цяперашнім сваім тэхнічным узбраеннем нашы таварыцы на транспарце спраўляюцца даволі дрэнна. Разам з велізарным ростам тэхнічнага ўзбраення шляхта транспарта і, перш за ўсё, чыгуначнага, у аграмадной меры ўзрастае і адказнасць усяго кіруючага складу транспарта за правільнае выкарыстанне гэтай новай тэхнікі, за сапраўднае паляпшэнне ўсёй работы транспарта. Рашыць гэту задачу ва што-б гэ ні стала і рашыць набольшэвіцку — вось адна з самых галоўных і самых неадкладных нашых задач.

1. ЗАВЯРШЭННЕ ТЭХНІЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ І ПРАБЛЕМА АСВАЕННЯ

Ажыццяўленне справы тэхнічнай рэканструкцыі патрабуе ўпартай барацьбы за асваенне новай тэхнікі. Мы ўсе добра памятаем словы таварыша аб тым, што «У перыяд рэканструкцыі тэхніка рашае ўсё». Гэтыя ўказанні маюць асаблівае значэнне ў другой пяцігодцы, калі завяршаецца тэхнічная рэканструкцыя ўсіх галін народнай гаспадаркі. Наша партыя прыняла, што ў другой пяцігодцы лозунг новага будаўніцтва павінен быць дапоўнен лозунгам асваення новай тэхнікі і новых вытворчасцяй.

Нашы поспехі ў справе асваення новай тэхнікі і ў справе паляпшэння арганізацыі ўсёй вытворчасці будуць вымярацца практычнымі рэзультатамі работы. Гэтыя рэзультаты павінны знайсці сваё выражэнне, перш за ўсё, у вялікім росце **прадукцыйнасці працы** і ў значным **зніжэнні сабекошту прадукцыі.** Перад намі стаіць задача падняць у другой пяцігодцы прадукцыйнасць працы ў прамысловасці на 63 проц. і знізіць сабекошт прамысловай прадукцыі на 26 проц.

Само зніжэнне сабекошту прадукцыі будзе ў першую чаргу залежаць ад падняцця прадукцыйнасці працы.

Урэшце, ад падняцця прадукцыйнасці працы рабочых будзе залежаць выкананне ўсяго плана па павялічэнню прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы. З другога боку, вялізарны пад'ём спецыяльнага і культурнага ўзроўню рабочых у другой пяцігодцы стварае ўмовы для паскарэння росту прадукцыйнасці працы ў нашай прамысловасці і ў іншых галінах гаспадаркі.

На чым асноўваецца запраектаванае пятігодкай павялічэнне прадукцыйнасці працы ў прамысловасці і ў іншых галінах народнай гаспадаркі?

Падняцце прадукцыйнасці працы ажыццяўляецца, па-першае, на велізарным росце новай, дасканалай тэхнікі ва ўсёй народнай гаспадарцы. У адпаведнасці з гэтым найбольшы рост прадукцыйнасці працы і зніжэнне сабекошту адносіцца да такіх галін, як чорная металургія, машынабудаўніцтва, каменнавугольная прамысловасць і буйная прамысловасць у цэлым, дзе атрымаецца найбольш значная рэканструкцыя тэхнічнай базы. Найбольшы ж сакорэ тэмпы росту прадукцыйнасці працы запраектаваны ў новых прадпрыемствах і ў прадпрыемствах з новымі агрэгатамі.

Падняцце прадукцыйнасці працы асноўваецца, падругое, на канцэнтрацыі аграмадных рэсурваў навызрыстанага рабочага часу ў нашых прамысловых прадпрыемствах. Бясспрэчнымі фактамі даказана, як адна выкарыстоўваецца скарочаны рабочай уладай да сямі гадзін работы дзень у прамысловасці СССР. Даказана, што на многіх прадпрыемствах фактычна рабочы час у работы не складае больш 5-5½ гадзін у дзень. Тут многае залежыць ад самых рабочых, але гэта яшчэ больш залежыць ад гаспадарчага кіраўніцтва, ад паляпшэння ўсёй справы арганізацыі працы на фабрыках і заводах. Мы павінны, нарэшце, навучыцца пасапраўднаму скарыстоўваць 7-гадзінны рабочы дзень, і гэта дасць велізарнае павялічэнне прадукцыйнасці працы ў прамысловасці. Тое-ж самае адносіцца, вядома, і да транспарта і да соўгасаў.

Падняцце прадукцыйнасці працы ажыццяўляецца, па-трэцяе, на росце колькасці рабочых мас ва ўсім соцыялістычным будаўніцтве.

Гэта актыўнасць знаходзіць сваё іскучае выражэнне ў соцыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве і яго розных і новых формах (напрыклад, грамадска-тэхнічных экзаменах прадпрыемстваў). Найлепшым, чэрпнутым перайманням прыкладам з'яўляецца вопыт выпрацоўкі і ажыццяўлення тэхпромфінпланаў на раёне прадпрыемстваў Ленінграда. Тэхпромфінплан, пры выпрацоўцы якога прымаюць удзел не толькі гаспадарчыя і тэхнічныя кіраўнікі, але і ўсе заводскія рабочыя, якія ставяць вытворча - тэхнічныя дасягнамасці цэха, агрэгатаў і паасобных машын і тым самым актыўна ўдзельнічаюць у выяўленні ўсіх вытворчых рэсурсаў прадпрыемства,— тэхпромфінплан — адна з лепшых соцыялістычных форм барацьбы за ўсе тэмпы. Ажыццяўленне ідэй тэхпромфінплана не мірыцца са стараімі прывычкамі гаспадарчага кіраўніцтва «наогул» і моцна падрывае адказнасць усяго рабочага калектыва за сваё прадпрыемства, а гэтым — наша найвялікшая сіла. А колькі яшчэ другіх форм узрастаючай актыўнасці рабочага класа разгортваецца ў нашай краіне!

Падняцце прадукцыйнасці працы ажыццяўляецца, нарэшце, на тым, што кадры гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічнага персанала і кваліфікаваных рабочых у нас накапілі значны вытворчы вопыт і ў другой пяцігодцы шпарка растуць. Яны, гэтыя кадры кваліфікаваных рабочых, інжынерна-тэхнічнага персанала і гаспадарчых кіраўнікоў і іх узрастанне папаўненні павінны з гонарам рашыць задачу асваення велізарнага тэхнічнага ўзбраення, якое на адной гаспадарцы атрымлівае ў другой пяцігодцы.

Некалькі слоў аб нашых кадрах. Перш за ўсё, аб кадрах кваліфікаваных рабочых. У гэтых адносінах мы робім гіганцкі шаг наперад у другой пяцігодцы. На самай справе, за першую пяцігодку ў народную гаспадарку ўлілося 460 тысяч чалавек, скончыўшых школы фабрычна-заводскага вучнёўства, у тым ліку ў прамысловасць улілося 300 тыс. кваліфікаваных рабочых з ФЗВ. На працягу другой пяцігодкі намечан выпуск 2,7 мільёна кваліфікаваных рабочых з школ ФЗВ па ўсёй народнай гаспадарцы; з гэтага ліку 1,7 млн. чалавек па прамысловасці і 0,5 млн па транспарту. Апрача таго, будзе падрыхтавана 1,5 млн. чалавек кваліфікаваных работнікаў для сельскай гаспадаркі — трактарыстаў, камбайнераў, брыгадзіраў і інш. Нарэшце, у аўтаколах і на курсах будзе падрыхтавана 700 тысяч шофераў для аўтатранспарта. Такім чынам, у вытвор часць увальюцца на працягу пяцігоддзя каля 5 млн. новых падрыхтаваных работнікаў масавых кваліфікацый.

Выпуск спецыялістаў з ВТНУ і тэхнікумаў значна павялічваецца ў другой пяцігодцы ў параўнанні з першай.

Па прамысловасці колькасць скончыўшых тэхнікумы ўзрастае з 69 тысяч у першым пяцігоддзі да 172 тысячы ў другім пяцігоддзі, а скончыўшых ВТНУ — з 60 да 112 тысяч.

Па транспарту колькасць скончыўшых тэхнікумы павялічваецца з 28 тысяч да 97 тысяч, а скончыўшых ВТНУ — з 8 тысяч да 28 тыс.

Па сельскай гаспадарцы колькасць скончыўшых тэхнікумы павялічваецца з 57 тысяч да 153 тысяч, а скончыўшых ВТНУ — з 29 тысяч да 54 тысяч. Ітак, падрыхтоўка спецыялістаў для прамысловасці, транспарта і сельскай гаспадаркі быстра ўзрастае ў другой пяцігодцы супроць папярэдняга пяцігоддзя. Прыбяўце да гэтага, што і сама кваліфікацыя канчаючых тэхнікумы і ВНУ з кожным годам расце.

Нарэшце, аб ліку спецыялістаў у прамысловасці і на чыгуначным транспарце. Лік спецыялістаў з сярэдняй і вышэйшай асветай павялічваецца ў прамысловасці з 123 тысяч у 1932 годзе да 300 тысяч у 1937 г. На транспарце гэта-ж груп спецыялістаў павялічваецца за пяцігоддзе з 10 тысяч да 41 тысячы.

Такім чынам, наша прамысловасць і транспарт, а таксама сельская гаспадарка за гады другой пяцігодкі папаўняюцца аграмадным колькасцю новых спецыялістаў, спецыялістаў, выпрацаваных совецкай уладай, спецыялістаў з падрыхтоўкай для работы, з новай тэхнікай і ў новых умовах.

Гэта аграмадны капітал, які пролетарская дыяржава зможа мець толькі цяпер.

Трэба яшчэ сказаць аб разгарнуўшайся навукова-тэхнічнай рабоце ў СССР. Нам прышлося многаму вучыцца ў замежнай тэхнікі, у замежных спецыялістаў. Гэта вучоба не пашла ўдастую. У нас выраслі ўжо значныя новыя кадры работнікаў навукі і тэхнікі. У другой пяцігодцы ў справе тэхнічнага перабраення гаспадаркі мы ўжо ў значнай меры будзем апірацца на дасягненні совецкай тэхнікі. Увязка навукова-тэхнічнай работы з соцыялістычнай практыкай робіцца ўсё больш цеснай і навукова-тэхнічная работа ў СССР усё больш ядначэцца адзіным планам соцыялістычнага будаўніцтва.

Стварэнне пролетарскай вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі, уключаючы навукова-тэхнічныя кадры, было важнейшай задачай апошняга пяцігоддзя. У вырашэнні гэтай задачы ў другім пяцігоддзі мы хутка пасоўваемся наперад. Разам з аграмадным культурным ростам рабочых і ўсёй масы працоўных, разам з аграмадным размахам падрыхтоўкі новых кадраў кваліфікаваных рабочых совецкая дзяржава атрымлівае ў сваё распараджэнне сотні тысяч новых спецыялістаў розных галін тэхнікі і гаспадаркі. З гэтымі кадрамі мы можам брацца за вырашэнне буйнейшых задач у асваенні новай тэхнікі і новых вытворчасцяй і дабіцца, каб нашы прадпрыемствы працавалі сапраўды пакультурнаму, пасоцыялістычнаму.

З гэтымі кадрамі мы смела можам узяцца за завяршэнне задачы тэхнічнай рэканструкцыі ўсіх галін народнай гаспадаркі і за выкананне пастаўленай другой пяцігодкай праграмы пад'ёму народнай гаспадаркі.

Усё гэта павінна забяспечыць такі рост прадукцыйных сіл СССР, якога не было яшчэ ні ў адной краіне, якога не было і ў нас у мінулыя гады. Не толькі па тэмпах росту прамысловасці, але і на ўзроўню развіцця асноўных прамысловых галін Совецкі Саюз гіганцкі прасоўваецца наперад, апярэджваючы самыя перадавыя краіны Еўропы. Гэта відаць з наступнай таблицы, прыведзенай Дзяржпланам СССР у першым томе «Праекта другога пяцігадовага плана»:

Месца СССР у прадукцыі сусветнай прамысловасці*)

ВІДЫ ПРАДУКЦЫІ	1913 г.		1928 г.		1932 г. **)		1937 г. **)	
	ва ўсім свеце		ва ўсім свеце		ва ўсім свеце	у Еўропе	ва ўсім свеце	у Еўропе
Уся прадукцыя	—	5	3	2	2	1		
Электраэнергія	15	10	7	4	2	1		
Каменны вугаль	6	6	4	3	4	3		
Торф	—	—	1	1	1	1		
Нафта	2	3	2	1	2	1		
Чыгун	5	6	5	4	2	1		
Сталь	5	5	5	4	2	1		
Агульнае машынабудаўніцтва	4	4	2	1	2	1		
Сельска-гаспадарчае машынабудаўніцтва	—	4	2	1	2	1		
Трактары	—	4	2	1	2	1		
Камбайны	—	—	2	1	2	1		
Аўтамабілі, усяго	—	12	7	5	5	3		
У тым ліку грузавікі	—	11	6	4	2	1		
Медзь	7	9	9	2	3	1		
Алюміній	—	—	11	9	3	1		
Цэмент	—	8	7	5	2	1		
Фосфарныя ўгнаенні (суперфасфат)	—	18	9	6	2	1		

*) Капіталістычны свет паводле даных «Аннуатрстатыстык дэ ля сосіетэ дэ націон», 1932 г.

**) 1932 і 1937 гг. у параўнанні з вытворчасцю ў капіталістычных краінах у 1929 г.

З гэтай табліцы відаць, што к канцу другой пяцігодкі становішча нашай краіны ў прадукцыі дзяржаў усяго свету карэнным чынам змяняецца ў параўнанні з мінулым. Па размерах прадукцыі ўсёй прамысловасці СССР напярэдадні першай пяцігодкі займаў пятае месца сярод дзяржаў усяго свету. Напярэдадні другой пяцігодкі СССР перайшоў ужо на трэцяе месца ва ўсім свеце і на другое ў Еўропе. К канцу другой пяцігодкі прамысловая прадукцыя нашай краіны зойме другое месца ў сусветнай прадукцыі і першае ў Еўропе. Задача «дагнаць і перагнаць» у тэхніка-эканамічных адносінах капіталістычныя краіны ажыццяўляецца на практыцы.

Совецкі Саюз ператвараецца ў краіну перадавой тэхнікі ва ўсіх галінах гаспадаркі. Совецкі Саюз ператвараецца ў краіну, багатую прадуктамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, правёўшы тэхнічнае пераўзбраенне ўсіх галін народнай гаспадаркі. Совецкі Саюз ператвараецца ў краіну, перад якой у справе далейшага развіцця гаспадаркі, тэхнікі і культуры адкрыты неабмежаваныя магчымасці, дастойныя поўнай пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

II.
БУДАЎНІЧАЯ ПРАГРАМА І НОВАЕ РАЗМЯШЧЭННЕ ПРАДУКЦЫЙНЫХ СІЛ

Завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і быстры пад'ём дабрабыту і культуры працоўных мас нельга ажыццявіць без аграмаднага разгортвання новага будаўніцтва. Новае будаўніцтва ў другой пяцігодцы шпарка разгортваецца ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі —і ў цяжкай, і ў лёгкай прамысловасці, і на транспарце, і ў сельскай гаспадарцы. Асаблівасцю плана капітальных работ другой пяцігодкі з'яўляецца новае больш правільнае размяшчэнне прадукцыйных сіл СССР. Тут атрымлівае сваё поўнае развіццё ўстаноўка партыі і ўрада на больш роўнамернае размяшчэнне прамысловасці па тэрыторыі СССР, на прыбліжэнне прамысловасці да крыніц сырца і энергіі, на забеспячэнне паскоранага эканамічнага і культурнага пад'ёму адсталых нацыянальных рэспублік і абласцей і на значнае прасоўванне наперад на шляху знішчэння процілегласці паміж горадам і вёскай.

Аб размаху новага будаўніцтва у другой пяцігодцы гаворыць параўнанне з першай пяцігодкай. Калі ўвесь аб'ём капітальных работ па народнай гаспадарцы ў першай пяцігодцы складаў 50,5 млрд. руб., то ў другой пяцігодцы ён дасягае 133,4 млрд. руб., г. зн. павялічваецца ў 2,3 разы.

Напрамак капітальнага будаўніцтва па асобных галінах відаць з наступнага:

больш паловы, а іменна 69,5 млрд. руб. капітальных затрат ідзе на развіццё прамысловасці. Львіная доля гэтых затрат, а іменна 53,4 млрд. руб., што складае 40 проц. усяго аб'ёму капітальных работ, ідзе на развіццё прамысловасці, стваральнай сродкі вытворчасці. Гэтым забяспечваецца далейшае ўмацаванне цяжкай прамысловасці, як асновы індустрыялізацыі краіны.

З другога боку, тэмпы павялічэння капітальных затрат у лёгкай і харчовай прамысловасці амаль у два разы вышэй тэмпаў цяжкай прамысловасці. Гэтыя затраты ў першай пяцігодцы складалі 3,5 млрд. рублёў, а ў другой—16,1 млрд. руб., што азначае павялічэнне ў 4,6 раза. Такое разгортванне прамысловасці, выробляючай прадметы спажывання, цалкам адказвае асноўным задачам другой пяцігодкі.

Капітальныя работы па сельскай гаспадарцы (соўгасы, МТС, калгасы) таксама значна павялічваюцца—з 9,7 млрд. руб. за першую пяцігодку да 15,2 млрд. рублёў за другую, г. зн. павялічваюцца больш чым у паўтары разы. У паказанай тут суме 15,2 млрд. рублёў не лічыцца тое, што будуць будаваць самі калгасы і што складае не малую дабаўку да плана будаўніцтва па сельскай гаспадарцы. Асабліва хутка растуць капітальныя работы па МТС, якія павялічваюцца больш, чым у пяць раз. У рэзультаце гэтага МТС ахопяць сваёй работай усю плошчу калгасных пасеваў. Соўгаснае будаўніцтва павінна стварыць усе прадпасылкі для ператварэння соўгасаў ва ўзорныя прадпрыемствы як у галіне паляводства, так і ў галіне жывёлагадоўлі.

Вышэй сярэдняга ўзроўню вызначан рост капітальных работ па транспарту. Тут будаўніцтва расце з 8,9 млрд. рублёў у першай пяцігодцы да 26,3 млрд. руб. у другой пяцігодцы, г. зн. у тры разы.

Важнейшым момантам будаўнічай праграмы другой пяцігодкі з'яўляецца аграмадны план уводу ў эксплаатацыю новых прадпрыемстваў. Пры 133 млрд. рублёў агульнага плана капітальных работ, увод у эксплаатацыю новых і рэканструіруемых прадпрыемстваў вызначаецца сумай у 132 млрд. рублёў, амаль у тры разы больш таго, што было ўведзена ў эксплаатацыю ў першай пяцігодцы. Гэта тлумачыцца з аднаго боку, значнасцю будаўніцтва, пераходзячага з першай пяцігодкі, а, з другога боку, тым, што накоплены намі будаўнічы вопыт павінен забяспечыць больш хуткія тэмпы будаўніцтва.

Прымаемы маштаб капітальных работ і праграма ўводу ў эксплаатацыю новых прадпрыемстваў забяспечваюць аграмадныя ўзрастанні дзействуючых асноўных фондаў народнай гаспадаркі. Агульная сума гэтых фондаў, укладзеных у розныя прадпрыемствы, узрастае за пяцігоддзе з 85 млрд. рублёў да 195 млрд. рублёў, што азначае павялічэнне асноўных фондаў краіны ў 2,3 раза; па прамысловасці гэтыя фонды ўзрастаюць у тры разы, па сельскай гаспадарцы і транспарту— ў два разы. Тым самым вядучая роля прамысловасці ва ўсёй народнай гаспадарцы яшчэ больш замацоўваецца.

Гэты план будаўніцтва забяспечвае не толькі неабходнае для выканання вытворчай праграмы ўзрастанне тэхнічнай базы, але па раду галін прамысловасці і вялікія рэзервы магутнасцяй. Стваралемыя ў другой пяцігодцы вялікія рэзервы вытворчых магутнасцяй у металургіі, па каменнаму вугалю, па электрастанцыях і ў другіх галінах падрыхтуюць далейшае бурнае развіццё народнай гаспадаркі ў трэцім пяцігоддзі.

1. НОВАЕ БУДАЎНІЦТВА ПА ГАЛІНАХ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Як разгортваецца будаўніцтва па асобных галінах народнай гаспадаркі, відаць з наступнага.

Па машынабудаўніцтву ўводзяцца ў строй за другую пяцігодку 94 новых заводы. За гэты перыяд заканчваюцца пачатыя будаўніцтвам у першай пяцігодцы Уральскі завод цяжкага машынабудаўніцтва магутнасцю ў 100 тыс. тон і Краматорскі ў 150 тыс. тон прадукцыі, а таксама магутны завод хімічнай апаратуры на Урале. Заканчваецца будаўніцтва Луганскага паравозабудаўнічага завода, магутнасцю ў 1.080 паравозаў «ФД» у год, Орскага паравоза і цеплавозабудаўнічага завода на 500 электравозаў і 500 цеплавозаў, Каірскага электравознага на 300 магістральных паравозаў. Часткова заканчваецца Уральскі вагонабудаўнічы завод на 54 тыс. чатырохвосевых вагонаў і разгортваецца будаўніцтва Кузнецкага і Ніжна-Чаркаскага паравозабудаўнічых заводаў і Казанскага вагонабудаўнічага завода. Разгортваецца будаўніцтва вялікай групы заводаў рачнога і марскога суднабудаўніцтва са скарачэннем такіх буйнейшых суднабудаўнічых заводаў, як суднаверф у Комсамольску, на Далёкім Усходзе.

Заканчваецца будаўніцтва маторнага завода ў Уфе на 50 тыс. маторaў.

Расшыраецца Горкаўскі аўтазавод да 300 тыс. машын, Маскоўскі аўтазавод імя Сталіна да 80 тыс. машын (у тым ліку 10 тыс. лёгкавых тыпу «Бюік», і Яраслаўскі завод магутнасцю да 25 тысяч шматтонных грузавікоў. Апрача таго, у другой пяцігодцы будуюцца Уфімскі і Сталінградскі аўтазаводы магутнасцю па 100 тыс. 3-тонных грузавікоў кожны і Самарскі аўтазавод на 25 тыс. 5-тонных грузавікоў. Разгортваецца для аўтабудаўніцтва вялікая група заводаў сумежных вытворчасцяй, у ліку якіх — новы магутны завод шарыкападшыпнікаў на 24 млн. штук, заводы аўта-электраабсталявання і аўтапрыборaў. Заканчваецца Харкаўскі турбагенератарны завод на 1,5 млн. квт. і будуецца Уральскі трансформатарны і электраапаратны завод, рад электратэхнічных заводаў у Маскоўскай вобласці і ў Паволжы, 10 варштатабудаўнічых заводаў, стваральных шліфавальныя, радыяльна-свердзільныя, зубаразныя, аўтаматычныя і цяжкія варштаты.

Разгортваецца будаўніцтва групы заводаў пралёльнага абсталявання, фарбавальна-апрэтурнага абсталявання, а таксама вытворчасць розднага роду абсталявання для харчовай, лясной і паляроваі прамысловасці. Гэтым далёка не вычэрпваецца спіс буйных машынабудаўнічых заводаў, якія мы будуем у другой пяцігодцы.

У галіне **электрыфікацыі** ідзе будаўніцтва 79 раённых станцый, у тым ліку 48 новых электрастанцый. Велізарнае будаўніцтва разгортваецца ў асноўных прамысловых раёнах Саюза — Масква, Ленінград, вугальна-металургічная база на Украіне і Урала-Кузнецкі камбінат.

Злучанне высокавольтнымі электрычнымі правадамі Масквы, Іванава, Горкага, апрача таго, на Усходзе — паўночнага і паўднёвага Урала з сярэднім Уралам і на Украіне—Данбаса з Дняпракамбінатам азначае падрыхтоўку да стварэння адзінай высокавольтнай сеткі, аб'ядналачай асноўныя прамысловыя раёны СССР.

Асноўныя прамысловыя раёны ў поўнай меры забяспечваюцца электраэнергіяй. Шпарка расце электрабудаўніцтва і ў новых раёнах.

Маскоўскі вузел значна ўмацняецца і поўнасцю забяспечвае электраэнергіяй і атрымлівае неабходны рэзерв магутнасці для патрэб Маскоўскага раёна. Разам з тым Масква ператвараецца ў буйнейшы ў СССР і ва ўсім свеце цеплафікацыйны вузел. Ленінград будзе надзейна забяспечан электраэнергіяй, вытвор часць якой не будзе залежаць ад прывазнога апалу. Вугальна-металургічная база на Украіне таксама забяспечваецца ў поўнай меры.

Злучэнне Дняпроўскага і Данбаскага энергетычных вузлоў, а таксама ўключэнне ў яго вугальна-металургічнага раёна Паўночнага Каўказа ператварае гэту энергетычную сістэму з агульнай магутнасцю ў канцы другой пяцігодкі ў два мільёны кілават і магчымай выпрацоўкай у 9 млрд. кілават-гадзін у самую буйную ва ўсім свеце энергетычную сістэму. На Урале электрабудаўніцтва разгортваецца на базе мясцовых вугаляў.

У каменнавугальнай прамысловасці разгортваецца буйнае капітальнае будаўніцтва, што дазваляе ўвесці ў эксплаатацыю 178 вугальных капальняў магутнасцю ў 143 млн. тон. У плане прадугледжана закладка 65 новых капальняў, якія забяспечаць далейшае развіццё вугляздабычы ў першыя гады трэцяй пяцігодкі.

У нафтавай прамысловасці капітальныя работы ідуць значна вышэй сярэдняга тэмпу капітальных работ усёй цяжкай прамысловасці. Асабліва важна будаўніцтва нафтаперарабляючых заводаў — 46 трубчатак, першачарговай перагонкі і 93 крэкінгаў. У другой пяцігодцы прадугледжана скарачэнне будаўніцтва нафтаправодаў — Каспій-Орск, Махач-Кала-Варонеж, Нефцедаг-Краснаводск, расшырэнне нафтаправода Баку-Батум і будаўніцтва прадуктапровадаў Грозны-Армавір і Трудавая — Дняпрапятроўск.

У чорнай металургіі заканчваюцца заводы — Магнітагорскі на 2,7 млн. тон чыгуну, Кузнецкі — на 1 млн. тон чыгуну, Запарожскі, «Азоўсталь», Крывапожскі, Турскі, Ліпецкі, Пятрова-Забайкальскі і трубапракатныя заводы — Нікапальскі і Перваўральскі. На палавінную магутнасць заканчваецца будаўніцтва Тагільскага завода. Пускаюцца дзве домны Байкальскага завода, разгортваецца будаўніцтва Халілаўскага завода, другога Кузнецкага і Далёка-Усходняга заводаў з пускам першых аграгатаў у канцы пяцігодкі.

Па каляровай металургіі заканчваецца будаўніцтва Прыбалхашскага камбіната на 100 тыс. тон медзі, Сярэдня-Уральскага на 50 тыс. тон медзі. Праводзіцца рэканструкцыя старых медных прадпрыемстваў Урала і Закаўказзя з давядзеннем іх магутнасці да 80-85 тыс. тон медзі ў год. Заканчваецца будаўніцтва Казпаліметала на 60 тыс. тон свінца. Фарсіруецца скарыстанне багатай паліметалічнай базы Рыдэра. Уводзяцца ў строй цынкавыя заводы ў Чэлябінску і Орджанікідзе. Канчаецца таксама будаўніцтва Волхаўскага і Дняпрапятроўскага алюмінієвых заводаў, будуецца на Урале новы алюмінієвы завод на 25 тыс. тон і Карэльскі — на 8 тыс. тон. Вялікае значэнне набывае будаўніцтва, якое забяспечвае вытвор часць магнія, нікеля, волава і рэдкіх металаў.

У галіне **хіміі** разгортваецца будаўніцтва новых тукавых камбінатаў, заводаў сінтэтычнага каўчука, аніліна-фарбавальнай і лака-фарбавальнай прамысловасці, пластычных мас, содавых заводаў, сернакіслотных, гумавых, штучнага валакна і т. д.

У лёгкай прамысловасці, разварот будаўніцтва асабліва значны ў параўнанні з першай пяцігодкай. Гэта відаць з таго, што ў другой пяцігодцы будуецца 15 буйнейшых новых камбінатаў. 5 з гэтых камбінатаў — Ташкенцкі, Барнаўльскі, Хаджэнскі, Чарджуйскі, і Закаўказскі — магутнасцю ў 200 тысяч верацён кожны. Будуюцца 12 буйных шарсяных фабрык магутнасцю ад 8 да 15 млн. метраў тканіны кожная, 12 ільняных прадпрыемстваў — магутнасцю ад 18 да 27 тыс. верацён кожнае, 18 буйных прадпрыемстваў трыкатажнай прамысловасці, 13 каціанінных фабрык, 11 шоўкавых фабрыд, 21 абутковае прадпрыемства, магутнасцю ў 100 млн. пар, 54 швейныя фабрыкі, 19 шкляных заводаў, 9 прадпрыемстваў музычных інструментаў і немала іншых.

У харчовай прамысловасці разварот будаўніцтва таксама значна вышэй мінулых год. Тут заканчваецца ў другой пяцігодцы будаўніцтва пачатых у першай пяцігодцы 17 мясакамбінатаў і разгортваецца будаўніцтва 23 новых мясакамбінатаў. Апрача таго, уводзяцца ў эксплаатацыю 14 цукровых заводаў, 21 кансервовых заводаў, 36 кандытарскіх фабрык, 59 буйных халадзільнікаў, 47 млынарных камбінатаў і шмат другіх.

У лясной прамысловасці разгортваецца будаўніцтва вялікай колькасці лесапільных заводаў, лесахімічных прадпрыемстваў, фанерных заводаў і інш. Заканчваецца будаўніцтва Камскага і Кандапожскага цэлюлозна-папяровых камбінатаў, а таксама Сясьскага цэлюлознага камбіната, Башкірскага і Краснаярскага папяровых камбінатаў. Будуюцца новыя мэблевыя фабрыкі і інш.

У СССР ужо стварылася **будаўнічая індустрыя**, як спецыяльная галіна прамысловасці. У другой пяцігодцы парк будаўнічых механізмаў значна расце, і механізацыя ас ноўных працэсаў будаўніцтва даходзіць да 80 проц. і больш.

У сувязі з вялікім размахам будаўніцтва ў другой пяцігодцы, пытанне аб шырокім і ўмелым скарыстанні новай будаўнічай тэхнікі, уключаючы ў лепшыя дасягненні за межнага вопыту, набывае асабліва вялікае значэнне.

Зраблю яшчэ адну агульную заўвагу аб прамысловым будаўніцтве.

Мы ганарымся тым, што наша прамысловасць дасягнула высокай ступені канцэнтрацыі і ў галоўнейшых галінах вытворчасці прадстаўлена заводамі-гігантамі. Мы павінны і далей выкарыстоўваць усе перавагі буйных і буйнейшых прадпрыемстваў, аснашчоных сучаснай першакласнай тэхнікай, гэта забяспечваецца планам другой пяцігодкі. Аднак, канцэнтрацыю прамысловасці нельга змешваць з хваробаю, называемай «гігантаманіяй» у будаўніцтве. Асабліва аб гэтым трэба памятаць цяпер, калі адной з важнейшых задач новага будаўніцтва з'яўляецца разгортванне прамысловасці ў новых раёнах, стварэнне прамысловых прадпрыемстваў у малапрамысловых абласцях і набліжэнне прамысловасці да крыніц сыравіны і апалу. Выходзячы з гэтага, мы прызналі, напрыклад, неабходным разгортваць будаўніцтва не аднаго-двух новых аўтазаводаў, а чатырох аўтазаводаў у розных абласцях СССР. Відома таксама ра-

2. НОВАЕ РАЗМЯШЧЭННЕ БУДАЎНІЦТВА ПА РАЁНАХ

У будаўнічай праграме другой пяцігодкі велізарнае значэнне мае новае размяшчэнне будаўніцтва па тэрыторыі краіны. Гэта новае размяшчэнне будаўніцтва мае на ўвазе ажыццяўленне двух задач: папершае, усямернае ўзмацненне скарыстання прыродных багаццяў краіны ў раёнах, якія ў мінулым былі ўсім адсталымі і якія павінны стаць новымі раёнамі развіцця індустрыі, і, падругое, паскораны эканамічны і культурны пад'ём адсталых нацыянальных рэспублік і абласцей, у адсталасці якіх яшчэ да гэтага часу сказваецца спадчына царскага каланіяльнага рэжыму.

Па прыродных рэсурсах наша краіна адносіцца да самых багатых. Па такіх асноўных прыродных багацтвах, як жалеза, вугаль, нафта, каляровыя металы, а таксама лес і водная энергія, мы займаем першае ці адно з першых месц сярод краін свету. Работа нашых геолагаў за апошнія гады моцна разгарнулася, дала значныя рэзультаты і павінна быць усямерна падтрымана ў далейшым.

Агульныя запасы жалезных руд у СССР вылічваюцца, прыкладна, у 240 млрд. тон, што складае амаль 50 проц. усіх сусветных жалезарудных рэсурсаў. Гэтыя запасы ў 4 разы перавышаюць запасы ўсёй Еўропы. Нашы разведаныя вугальныя рэсурсы за гады Окцябрскай рэволюцыі павялічылі ў 5 раз. Пасля ЗША па вугальных рэсурсах СССР — самая багатая краіна. Нафтавыя запасы Совецкага Саюза вызначаюцца ў 3 млрд. тон і складаюць трэцюю частку сусветных рэсурсаў.

Моцна сказваецца наша адсталасць у разведках каляровых металаў. Па медзі, свінцу, цынку, нікелю нашы рэсурсы пакуль што складаюць ад 5 да 10 проц. сусветных запасаў. Але за апошнія гады, дзякуючы ўзмоцненым разведкам, рэсурсы каляровых і рэдкіх металаў (вальфрам, малібдэн, вісмут, берылій) быстра павялічваюцца. Лясныя багацці мы да гэтага часу яшчэ скарыстоўваем толькі ў самай незначнай меры. А тут нашы магчымасці проста неабмежаваныя. Нельга разам з тым не ўказаць на недапушчальнасць знішчэння лясоў у бліжэйшых ад цэнтра раёнах і на спабасць лесакультурных мерапрыемстваў у засушлівых раёнах. Нашы водныя рэсурсы выкарыстоўваліся раней вельмі дрэнна. Толькі пры совецкай уладзе ўпершыню пачалі будавацца буйныя гідраэлектрастанцыі ў СССР.

Як дрэнна даследаваліся і выкарыстоўваліся прыродныя багацці краіны, відаць з наступнага. У старой Расіі, калі ўчаць яе ў цяперашніх межах, распрацоўка жалезных руд вялася амаль выключна на поўдні краіны і ў невялікай меры на Урале. Данбас даваў 86 проц. усёй вугляздабычы, а астатнія раёны былі ў поўным загоне. Нафта апрымлівалася толькі з Баку і Грознага.

З тых пор становішча ў карэнні змянілася. Побач са старымі раёнамі ўжо высунуліся новыя раёны як па жалезных рудах і каляровых металах, так і па вугалю і па нафце. У нас адкрыты такія буйныя жалезна-рудныя месцанараджэнні, як багацейшы раён Курскай магнітнай аномаліі, гарны Магнітная, Кемерава-Зігазінскае месцанараджэнне ў Башкірыі, Халілоўскае месцанараджэнне ў Сярэдня-Волжскім краі, а таксама жалеза-рудныя месцанараджэнні ў Заходняй і Усходняй Сібіры, у Казакстане, у Паўночна-Каўказскім краі і на поўначы Ленінградскай вобласці. Па вугальнай прамысловасці мы ўжо ставім задачу ператварэння Кузбаса ў новы Данбас, і хутка падымаюцца такія вугальныя раёны, як Карагандзінскі, Кізелаўскі, Чалябінскі, Падмаскоўны, а таксама ва Усходняй Сібіры, на Далёкім Усходзе, у Закаўказзі, у Сярэдняй Азіі і ў Паўночным краі. Апрача Баку і Грознага, вялікае значэнне набываюць такія новыя нафтавыя раёны, як Майкоп, Эмба, Турэменія, — раён Краснаводска, Башкірыі і рад іншых.

У сувязі з налічэннем указаных прыродных р

Працяг даклада тав. МОЛАТАВА

віцця новых высокакаштоўных культур, асабліва ў субтрапічных раёнах.

Справа барацьбы з засушшам у Заволжы разгортваецца ў вялікія работы. Шырокая праграма ірыгацыі Заволжа пачынаецца са ставрэння плошчы абнадняемых пасеваў на мясовым стоку ў 130 тыс. га, і разам з тым, павінна быць закончана падрыхтоўка да ажыццяўлення генеральнага плана ірыгацыі Заволжа.

Транспарт ва ўсім ажыццяўленні задач новага размяшчэння прадукцыйных сіл павінен адыграць вельмі важную і пры тым актыўную ролю. У адпаведнасці з гэтым павінна быць разгорнута будаўніцтва чыгуначных ліній да такіх прамысловых прадпрыемстваў, як Балхаш (медзь), Рыдэр (медзь, цынк, свінец), Стэрлітамак (нафта), Чулым (лес) і інш.

Усё гэта азначае, што пад'ём народнай гаспадаркі і праграма размяшчэння прадукцыйных сіл у другім пяцігодзьдзі не толькі забяспечвае шпаркі рост народнай гаспадаркі ў цэлым, але і значнае паскарэнне пад'ёму эканамічнага і культурнага ўзроўню адсталых раёнаў.

Ажыццяўленне будаўнічай праграмы другой пяцігодкі ператварае нашу краіну, уцягвае ў вытворчае жыццё велізарныя новыя прыродныя рэсурсы, падымае сельска гаспадарчую працу з яе новай машыннай тэхнікай на ўзровень працы індустрыяльнай, падцягвае адсталыя раёны да перадавых раёнаў краіны, звязвае новымі транспартнымі шляхамі цэнтр і далёкія акраіны, забяспечвае небывалы ўздым нацыянальных культур народаў СССР і ўсім гэтым падрыхтоўвае знішчэнне процілегласці паміж горадам і вёскай.

Ажыццяўленне гэтай будаўнічай праграмы, а таксама разгортванне ўсіх галін народнай гаспадаркі, правядзенне сацыяльна-культурных мерапрыемстваў і затраты на кіраўніцтва і абарону краіны патрабуюць у другім пяцігодзьдзі звыш 330 млрд. рублёў, г. зн. у 2,8 разы больш, чым у першай пяцігодцы. Толькі ў 1937 годзе ўказаныя затраты складуць 76,6 млрд. рублёў.

Дзе крыніцы для атрымання гэтых сродкаў?

Галоўная і рашаючая крыніца даходаў дзяржавы павінна заключацца ў накапленнях, якія павінна даць сацыялістычная гаспадарка. Гэта відаць з наступнага. — —

У 1937 г. ад прыцягнення сродкаў насельніцтва (прамыя падаткі, пазыкі і т. п.) пакрываецца менш адной восьмай гэтых расходаў, а іменна 9,3 млрд. руб. супроць 8,2 млрд. руб. у 1932 г. Такім чынам не ў гэтым заключаецца наша галоўная крыніца даходаў для выканання праграмы другой пяцігодкі.

З другога боку, накапленні (прыбыткі, падатак са звароту), якія павінна даць уся сацыялістычная гаспадарка, павінны ў 1937 г. скласці 61,5 млрд. руб., г. зн. узрасці ў два разы супроць 1932 г. Гэта — буйнейшая задача другой пяцігодкі. Забяспечыць паступленне гэтых накапленняў дзяржаве можна толькі пры выкананні двух наступных умоў: папершае, зніжэннем сабекошту прадукцыі ва ўстаноўленых размерах пры поўным выкананні праграмы павялічэння прадукцыі ўсіх галін народнай гаспадаркі, і, падругое, даходамі ад гандлю пры ажыццяўленні ўстаноўленага разгортвання таваразвароту.

Пачну з першай з гэтых асноўных крыніц даходаў дзяржавы.

У чым заключаюцца нашы задачы па зніжэнню сабекошту прадукцыі ў другой пяцігодцы?

Вось гэтыя заданні: па прамысловасці ў цэлым зніжэнне сабекошту павінна скласці 26 проц., што ў 1937 г. дае дзяржаве не менш 14 млрд. руб. накаплення; па транспарту — на 40 проц., што дае 7,8 млрд. рублёў; па Наркамсоўгасаў — на 63 проц., што складае 1,6 млрд. руб.; зніжэнне выдаткаў звароту гандлёвых арганізацый на 26 проц., што складае 2 млрд. руб.; зніжэнне кошту будаўніцтва на 40 проц., што дае дзяржаве эканоміі 8,7 млрд. руб. Дабіцца выканання гэтых задач — значыць забяспечыць дзяржаве трыццаць шэсць млрд. рублёў у 1937 годзе. Выканаць гэтыя задачы можна толькі: А) забяспечыўшы прыняты пяцігодкай рост прадукцыйнасці працы; Б) скараціўшы затраты апалу і сыравіны на адзінку прадукцыі, для чаго пры ўзмоцненай барацьбе з безгаспадарчасцю ў нас ёсць вялікія магчымасці; В) значна скараціўшы ўсякага роду непрадукцыйныя расходы, скараціўшы апарат і інш. Рашыць гэтыя задачы — значыць разгарнуць велізарную барацьбу за паляпшэнне работы нашай прамысловасці, транспарта, соўгасаў і калгасаў. Са мацёкам такія справы не робяцца, яны рашаюцца барацьбой з тысячамі труднасцяй, якіх мы ўжо не мала перамаглі і з якімі мы павінны павесці яшчэ больш настойлівую і яшчэ больш арганізаваную барацьбу.

Другой буйнейшай крыніцай даходаў дзяржавы будзе дзяржаўна-кааператыўны гандаль. Каб забяспечыць поўнасцю даходы ад гандлю, мы павінны дабіцца поўнага выканання праграмы па прадукцыі тавараў шырокага спажывання, пры ўсямерным паляпшэнні якасці гэтай прадукцыі. Тады і гэта важнейшая крыніца даходаў дзяржавы будзе забяспечана. Нельга забываць таго, што ў другім пяцігоддзі мы ставім задачу зніжэння раздробных цэн на 35-40 проц. Гэта азначае, што выкананне праграмы даходаў па гандлю можа быць забяспечана толькі велізарным разваротам таваразвароту і рашучым паляпшэннем работы ўсяго гандлёвага апарата.

Сур'ёзна змагацца за выкананне абодвух гэтых умоў праграмы сацыялістычнага накаплення ў другой пяцігодцы—значыць весці няўхільную барацьбу за паляпшэнне арганізацыі ўсёй гаспадаркі нашай краіны, за ўкараненне гаспадарчага разрахунку ва ўсіх гаспадарчых звеннях, за ўзмацненне плана-фінансавай дысцыпліны і за далейшае ўмацаванне совецкага рубля, як важнейшай зброі пад'ёму сацыялістычнай гаспадаркі і ўмацавання эканамічнай змычкі паміж горадам і вёскай.

Такім чынам, для выканання будаўнічай праграмы і іншых задач другой пяцігодкі ў нас ёсць у наяўнасці неабходныя прыродныя рэсурсы, магчымасць скарыстання яких быстра расце. У нас ёсць таксама велізарныя крыніцы даходаў, забеспечэння якіх цалкам залежыць ад нас, ад нашай работы.

Перспектывы другой пяцігодкі з яе гіганцкай праграмай будаўніцтва адкрываюць перад намі такі шлях пад'ёму нашай краіны, які ўзнімае энтузіязм і ўмацоўвае волю да перамогі ў сэрцах працоўных нашай краіны. Наша задача—разгарнуць яшчэ больш арганізавана барацьбу за скарыстанне велізарных рэзерваў у народнай гаспадарцы, усямерна палепшыць арганізацыю працы ў вытворчасці і ў будаўніцтве, забяспечыць умелае канкрэтнае кіраўніцтва ўзрастаючымі кадрамі будаўнікоў сацыялізма.

Наша задача—арганізаваць перамогу другой пяцігодкі.

III.

УЗДЫМ МАТЭРЫЯЛЬНАГА І КУЛЬТУРНАГА ЎЗРОЎНЮ ПРАЦОЎНЫХ

Сіла сацыялізма заключаецца ў тым, што гіганцкі пад'ём народнай гаспадаркі, сацыялістычнае будаўніцтва непарыўна звязваецца з аграмадным павышэннем дабрабыту працоўных мас. Прасоўванне сацыялізма наперад азначае знішчэнне капіталістычных элементаў—эксплаататараў працоўных. Гэта азначае, што даходы, якія раней ішлі ў рукі эксплаататараў, у рукі паразітаў, пераходзяць да саміх працоўных. Зразумела, што ўсё гэта адбываецца ў жорсткай барацьбе працоўных з рэшткамі буржуазных класаў, але толькі ў гэтай барацьбе рабочыя і сяляне адваёўваюць сабе новае жыццё, выходзяць з галечы і цемры, у якіх трымалі іх капіталісты і памешчыкі.

Ужо ў першай пяцігодцы мы дабіліся карэннага паляпшэння ў становішчы рабочых. Чаго варта адно знішчэнне беспрацоўя і ўпэўненасць усіх нашых рабочых у заўтрашнім дні, у забяспечанасці работай. Нідзе ва ўсім свеце рабочыя не могуць аб гэтым і марыць. Цэлы пераварот адбыўся і ў становішчы сялянства за апошнія гады. Калектывізацыя вымела велізарную колькасць кулакоў і вывела ўсю масу беднякоў і сераднякоў на шлях сапраўднага пад'ёму. З вёскі, якая з года ў год бяднела, стварылася вёска, якая з года ў год ідзе па шляху пад'ёму. Лепшым паказальнікам карэннага паляпшэння ўмоў жыцця сялянства з'яўляецца той факт, што не гледзячы на пад'ём дабрабыту рабочых, у нас ва многіх выпадках ёсць няхватка рабочых у гарадах, у той час як ва многіх капіталістычных краінах прымяняцца меры супроць напыву поўгалодных сялян з горада на заработкі.

Сіла другой пяцігодкі заключаецца ў тым, што цяпер мы можам ісці па шляху пад'ёму дабрабыту працоўных яшчэ хутчэй.

Пачну са становішча рабочых.

У нас, зразумела, няма небяспекі з'яўлення беспрацоўя сярод рабочых. Наадварот, лік рабочых і служачых за пяцігоддзе павялічваецца з 22,9 млн. чалавек у 1932 годзе да 29,6 млн. чалавек у 1937 г., г. зн. павялічваецца на 29 проц. Непасрэдна ў прамысловасці лік рабочых і служачых павялічваецца амаль на тры мільёны чалавек, г. зн. на 40 проц. Найвялікшае значэнне мае той факт, што ўся падрастаючая моладзь у сем'ях рабочых і служачых забяспечана работай і, прайшоўшы поўны курс вучобы, становіцца ў рады працоўных совецкай дзяржавы.

Перад рабочымі нашай краіны не стаіць небяспека падаўжэння рабочага дня. Наадварот, рабочы дзень у нашай прамысловасці ўжо скарочан да сямі гадзін, а на больш цяжкіх работах—да шасці гадзін і менш. І дзяржава патрабуе толькі аднаго—выразнай і поўнай работы на працягу гэтага кароткага рабочага дня.

У адносінах дахода рабочых і служачых упор у другой пяцігодцы робіцца на павышэнне рэальнай заработнай платы. У параўнанні з узроўнем 1932 года рэальная заработная плата папіна павялічыцца за пяцігодку ў 2,1 раза. Гэта значыць, што агульны размер фізычнага аб'ёма душавога спажывання рабочых і служачых (не сельска-гаспадарчых галін працы) павінен павялічыцца больш, чым у два разы.

Рост рэальнай заработнай платы рабочых і служачых ідзе за кошт наступных трох крыніц:

А) значнага росту грашовага дахода рабочай сям'і;

Б) вялікага росту дармовых паслуг, атрымліваемых рабочымі і служачымі па дзяржаўных і іншых фондах культурна-бытавога абслугоўвання;

В) велізарнага зніжэння цэн на тавары шырокага спажывання.

Фонд заработнай платы па ўсім галінам народнай гаспадаркі ўзрастае за пяцігодку з 32,7 млрд. руб. да 50,8 млрд. руб., г. зн. павялічваецца на 59 проц. Грашовы даход рабочых і служачых за пяцігодку павялічваецца на 40 проц., а сярэдняя заработная плата рабочых і служачых павялічваецца на 22,5 проц. Мы лічым няправільнай устаноўку на агульнае павышэнне грашовай заработнай платы ў другой пяцігодцы.

Павышэнне-ж заработнай платы рабочых пройдзе ў рэзультаце росту прадукцыйнасці працы і значна га павышэння кваліфікацыі рабочых, а таксама ў сувязі з праведзеным у першым годзе другой пяцігодкі павышэннем заработнай платы. Нарэшце, грашовыя даходы рабочых павялічацца яшчэ і таму, што ў сем'ях рабочых павялічыцца лік працоўных, колькасць стыпендыятаў, пенсіянераў і т. д.

Вялікае значэнне для росту рэальнай заработнай платы рабочых і служачых маюць затраты дзяржавы на культурна-бытавое бясплатнае абслугоўванне працоўных. Гэтыя расходы, разам з затратамі прафсаюзаў павялічваюцца за пяцігодку з 4,3 млрд. руб. да 9,3 млрд. руб. г. зн. больш, чым у два разы.

Гэтыя сродкі ідуць на павялічэнне пенсій і дапамог па сацстраху, на павялічэнне расходаў па выхаванню і навучанню дзяцей і дарослых, на лячэнне, яслі, дамы адпачынку, санаторыі і іншыя мерапрыемствы па паляпшэнню бытавых і культурных умоў жыцця рабочых і служачых.

Рашаючае значэнне ў росце рэальнай заработнай платы мае памечанае ў пяцігодцы зніжэнне раздробных цэн на тавары шырокага спажывання на 35-40 проц. Як вядома, за апошнія гады нам не раз прыходзілася ісці на павышэнне цэн на тавары. Цяпер прамысловасць наша ўмацавалася, сельская гаспадарка закончыла рэарганізацыйны перыяд, кадры нашы выраслі, і таму, мы маем усе прадпасылкі для зніжэння сабекошту прадукцыі і скарачэння непрадукцыйных расходаў для таго, каб рашуча знізіць цэны на тавары. Зніжэнне цэн на 35-40 проц. — не маленькая задача, але гэту задачу мы можам цяпер выканаць і таму павінны выканаць на што-б там ні стала. У гэтым — рашаючы нагар пад'ёму дабрабыту працоўных горада і вёскі ў другой пяцігодцы.

Вёска ўступіла цяпер у паласу быстрага пад'ёму. Дабрабыт калгас нікаў расце на нашых вачах. Хіба гэта выпадкова, што з таго часу, як калгасы прайшлі ўжо рэарганізацыйны перыяд і дабіліся ўстойлівасці, мы атрымалі рэкордна-высокі ўраджай зернавых культур. Вядома, таксама, што ўраджай зернавых быў вышэй за ўсё там, дзе лепш арганізаваны калгасы, дзе яны ўмацаваліся. Прыклад Кабарды, дзе на плацдзень выдана ў мінулым годзе да аднаго пуда збожжа (уключаючы кукурузу) і дзе калгасы сапраўды ўжо некалькі ўмацаваліся, гаворыць сам за сябе.

Для таго, каб хутчэй палепшыць сваё жыццё, сяляне калгаснікі павінны памятаць толькі аб адным,— сумленна працаваць у калгасе і бераччы калгаснае дабро. Дзяржава-ж дае ў дапамогу сялянству не толькі трактары, аўтамабілі, камбайны, сельска-гаспадарчыя машыны, рамонтныя майстэрні і іншае тэхнічнае абсталяванне, але і ўзмацнена рыхтуе кадры вопытных спецыялістаў сельскай гаспадаркі, а таксама арганізуе падрыхтоўку цэлых армій трактарыстаў, камбайнераў, брыгадзіраў і кіраўнікоў калгасаў і МТС. Для пад'ёму жывёлагадоўлі дзяржава не толькі аказвае дапамогу соўгасам і калгасам, але і ўсямерна аблягчае ліквідацыю бескароўных калгасных гаспадарак, арганізуючы кредыт і выдачу цёлак бескароўным. У нас ужо ў гэтым годзе, г. зн. на другі год 2 пяцігодкі будуць буйнейшыя вобласці, якія звядуць да нуля бескароўныя калгасныя гаспадаркі і забяспечаць усіх калгаснікаў каровай або цёлкай. Вялікую ролю ў снабжэнні калгасаў племянной жывёлай, гатунковым насеннем і т. п. выканаюць нашы соўгасы.

І так, створаны ўсе прадпасылкі для таго, каб зрабіць калгасы больш-вікімі і забяспечыць калгаснікам культурнае і заможнае жыццё. Гэты лозунг тав. Сталіна мы можам і павінны ажыццявіць ужо ў першыя два-тры гады другой пяцігодкі. Такім чынам, нарэшце, шматмільённыя сялянскія масы зажывуць пача лавечаму, пакультурнаму.

У адносінах **культурнага развіцця** СССР ідзе наперад, як велікан.

У другой пяцігодцы мы павінны ў гэтай галіне ажыццявіць наступныя задачы:

а) Ліквідацыю неабсямённасці сярод усяго насельніцтва. Гэта задача зусім ажыццяўлима ўжо на працягу двух-трох бліжэйшых год.

б) Ажыццяўленне ўсеагульнага абавязковага палітэхнічнага навучання ў аб'ёме сямігодкі не толькі ў горадзе, але і ў вёсцы. У адпаведнасці з гэтым кантынгент школы сямігодкі павінен узрасці з 21,7 млн. вучняў да 28,8 млн. вучняў. Гэта задача павінна стаць цэнтральнай задачай другой пяцігодкі ў развіцці нашай школы.

в) Павялічэнне агульнай колькасці педагагічных кадраў у школе ўсенавучча за пяцігодку з 628 тысяч да 834 тысяч.

Школы забяспечваюцца педагогамі з вышэйшай і сярэдняй асветай, што разам з забеспячэннем школ і вучняў падручнікамі, вучэбнымі прыладамі і неабходным абсталяваннем ва многім узніме якасць работы школы. Павышэнне якасці вучобы пры правядзенні палітэхнізацыі школы на марксісцка-ленінскай аснове ажыццяўляе на першаступенных задач партыі і ўрада.

г) Павялічэнне агульнай колькасці вучняў (у ніжэйшых і сярэдніх школах, рабфаках, ФЗВ, тэхнікумах, ВНУ і ВТНУ) з 24,2 млн. чалавек у 1932 годзе да 30 млн. чалавек у 1937 годзе.

д) Ахоп грамадскім і дашкольным выхаваннем дзяцей ва ўзросце да сямі год у колькасці 16 млн. дзяцей у 1937 годзе, замест 5,2 млн. дзяцей у 1932 годзе — павялічэнне больш, чым у тры разы. І тут важнейшай задачай з'яўляецца забеспячэнне дашкольнага навучання кваліфікаванымі кадрамі — педагогамі і кіраўнікамі.

е) Павялічэнне колькасці вучняў у агульна-адукацыйных школах і на курсах павышанага тыпу дасягае да 10,5 млн. чалавек, што звязана з аграмадным цягам да культуры ў шырокіх мас насельніцтва.

ж) Павялічэнне сеткі клубаў, дамоў культуры, хат-чытальнёў і т. д. з 49,3 тыс. да 76,9 тыс., г. зн. больш чым у паўтары разы.

з) Павялічэнне сеткі масавых бібліятэк за пяцігодку — з 15 тыс. да 25 тыс., з іх кніжнага фонду ў тры разы.

1) Павялічэнне колькасці радыёвяшчальных станцый за пяцігодку з 57 да 93, а колькасці прыёмных радыёпунктаў на адну тысячу жыхароў СССР — з 13 у цэлым па краіне да 57 і ў горадзе да 100 радыёпунктаў.

к) Павялічэнне колькасці навуковых работнікаў навукова-даследчых інстытутаў (без тэхнічных і бе аспірантуры) за пяцігоддзе — з 52,6 тыс. у 1932 годзе да 59 тысяч.

Найбольшы тэмп росту па ўсіх галінах культурнага будаўніцтва будуць мець нацыянальныя рэспублікі і вобласці. Ніколі яшчэ не ставраліся такія спрыяючыя ўмовы для росту нацыянальных культур і для шырокага вылучэння новых культурных кадраў з асяродзішча працоўных усіх нацыянальнасцяй СССР. У аграмадным росце нацыянальных культур на соцыялістычнай аснове знойдзе сваё выражэнне пераможны рост соцыялізма ў СССР, які дасць народам усяго свету новыя шматлікія прыклады таго, што ў наш час толькі соцыялізм можа быць базай сапраўднага эканамічнага і культурнага пад'ёму.

У справе паляпшэння аховы здароўя працоўных ў другой пяцігодцы стаяць таксама велізарныя задачы. Маштаб гэтых задач характарызуецца хоць-бы тым, што затраты на ахову здароўя, рабочы ад пачынак і фізкультуру з 5,4 млрд. руб. у першай пяцігодцы павялічваецца да 20,5 млрд. руб. у другой пяцігодцы, г. зн. узрастаюць амаль у чатыры разы. Колькасць больнічных ложкаў у гарадах павялічваецца на 44 проц., у сельскіх мясцовасцях — на 98 проц. Значна вырастуць і медыцынскія кадры.

Першаступеннае значэнне для рабочых мае паляпшэнне становішча з жыллём. Увесь жыллёвы фонд за другое пяцігоддзе павялічваецца з 185 млн. кв. метраў да 246 млн. кв. метр., г. зн. на 33 проц., з прычыны вялікага росту насельніцтва жыллёвая норма падымаецца аднак толькі па 15 проц.; але ў некаторых галінах прамысловасці яна расце куды быстрэй, так у машынабудаўніцтве жыллёвая норма расце на 22 проц., у чорнай металургіі—на 33 проц., у каменнавугольнай павялічваецца ў два разы.

Нарэшце, аб паляпшэнні справы **снабжэння працоўных** горада і вёскі і аб разгортванні тавара вароту.

Як велікі таварныя фонды, якія мы будзем мець у другой пяцігодцы?

Мы ўжо ведаем, якімі тэмпамі расце ў другой пяцігодцы лёгкая і харчовая прамысловасць і іншыя галіны вытворчасці прадметаў шырокага спажывання. У адпаведнасці з гэтым будзе быстра ўзрастаць фонд тавараў шырокага спажывання, які мы будзем мець. Калі ў 1932 г. уся маса прамысловых тавараў, створаных дзяржаўнай прамысловасцю, уключаючы і харчовыя тавары, ацэньвалася ў 14,5 млрд. руб. (у нязменных адпускных цэнах 1932 г.), то ў 1937 г. гэта таварная прадукцыя ўзрастае да 41,5 млрд. руб. (у тых-жа цэнах), г. зн. на 186 проц.; некалькі павольней расце прадукцыя тавараў шырокага спажывання ў саматужна-прамысловай кааперацыі, але з другога боку нярыначныя фонды растуць значна павольней, чым рыначныя. У рэзультаце рыначны фонд тавараў шырспажыву павялічваецца за пяцігоддзе на 205 проц. Такім чынам, рыначная прадукцыя тавараў шырспажыву к канцу пяцігодкі ўзрастае больш чым у тры разы. Быстрымі тэмпамі расце таксама таварная прадукцыя сельскай гаспадаркі пры адначасовым значным павялічэнні асабістага спажывання калгаснікаў.

Павялічэнне таварнай масы прадуктаў сельскай гаспадаркі ідзе, па першае, за кошт асноўных дзяржаўных паступленняў (ад падатку, ад натураплаты МТС, ад соўгасаў); па другое, за кошт прыгараднай гаспадаркі і, патрэцяе, за кошт калгаснага гандлю і дэцэнтралізаваных загатовак. Усе гэтыя крыніцы павелічэння таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі даюць магчымасць падняць снабжэнне такімі прадуктамі, як зернавы хлеб, бульба і гародніна, амаль у два разы, а па мясу і малаку прыкладна ў 2½ разы.

У рэзультаце мы атрымліваем бы стры рост агульнага раздробнага таваразвароту дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю разам з грамадскім харчаваннем. Вось асноўныя паказальнікі росту таваразвароту ў другой пяцігодцы.

Рост раздробнага таваразвароту ў другой пяцігодцы

	у сучасных раздробных цэнах 1932 г. (у млн. руб.)		
	1932 г.	1937 г.	1937 г. у процантах да 1932 г.
1. Тавары шырспажыву, у тым ліку: тканіны, вопратка, абутак, мыла, кнігі і інш. прамтавары	16.970	54.280	319,9
2. Прадукты харчавання, у тым ліку: хлеб, мяса, яйкі, цукар, рыба і інш.	10.145	26.385	260,1
3. Грамадскае харчаванне	4.800	13.920	290,0
УСЯГО (без табачна-алкагольнай групы):	31.915	94.585	296,4

З табліцы відаць, што асабліва быстра расце раздробны таваразварот па таварах шырспажыву (320 процантаў). Некалькі павольней павялічваецца таваразварот па прадуктах харчавання (280 проц.). Пасярэдзіне паміж імі ідзе ўзрастанне тэмпаў разгортвання грамадскага харчавання (290 проц.). У цэлым таваразварот павялічваецца к канцу пяцігодкі амаль у тры разы (296 проц.), — павольней па гораду (283 проц.), быстрэй па вёсцы (329 проц.).

Застаецца дадаць, што і сярэднія душавыя нормы спажывання важнейшых прадуктаў узрастаюць адна веднымі-ж тэмпамі. За другую пяцігодку гэтыя сярэднія душавыя нормы павялічваюцца па мясу і маслу жывёльнаму ў два разы, па яйках, цукру і кандзіцерскіх вырабах прыкладна ў 2,5 раза, па кансервах—у пяць раз, па хлебу, бульбе і гародніне патрэбы задавольваюцца.

Узрастаюць і сярэднія душавыя нормы спажывання па ўсіх прамысловых таварах. У сярэднім гэтыя нормы па прамысловых таварах узрастаюць за другую пяцігодку ў 2,8 раза.

Усё гэта робіць магчымым павышэнне ўзроўню спажывання працоўных у 2½-3 разы за пяцігоддзе. Разам з вялікім павелічэннем аб'ёму таваразвароту неабходна забяспечыць значнае паляпшэнне яго структуры шляхам павелічэння ўдзельнай вагі важнейшых груп прадметаў харчавання і тавараў шырокага спажывання, паляпшэння якасці тавараў і іх асартыменту.

Велізарнае павелічэнне таваразвароту ў дзяржаўна-кааператыўнай гандлёвай сетцы і зніжэнне цэн на прамысловыя тавары к канцу пяцігодкі на 35-40 проц. даюць магчымасць забяспечыць зніжэнне рынчных цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты і давесці да канца барацьбу за выкаранение спекулятыўных элементаў у гандлі. «Ножніцы цэн» на прамысловыя і сельска-гаспадарчыя тавары зближаюцца і паступова знічаюцца зусім. Мы ўжо пачалі праводзіць зніжэнне цэн у камерцыйным гандлі і дасягнулі значных рэзультатаў у зніжэнні рыначных цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты. У другой пяцігодцы мы павінны забяспечыць такі рост таваразвароту і ажыццяўленне такой палітыкі зніжэння цэн на прамысловыя тавары і сельска-гаспадарчыя прадукты, каб падрыхтаваць скасаванне нарміраванага гандлю.

Для гэтага нам патрабуецца далейшае вялікае разгортванне раздробнай гандлёвай сеткі. Гэта адносіцца і да спажывецкай кааперацыі, асабліва ў вёсцы, і да дзяржаўнага гандлю, уключаючы камерцыйны, і да ОРС'аў усіх наркаматаў і, нарэшце, да грамадскага харчавання. Значна разгорнецца і калгасны гандаль.

Толькі разгарнуўшы ўсе віды дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю і забяспечыўшы яго магутнай сеткай магазінаў і крам, адпаведным чынам тэхнічна прыстасаваных як да буйнага, так і да дробнага гандлю, і толькі пасапраўднаму палепшыўшы ўсю арганізацыю дзяржаўна-кааператыўнага гандлю і падбор кадраў у гандлёвай сетцы, можна справіцца з пастаўленымі перад намі задачамі ў другой пяцігодцы. Іменна таму, што ў справе паляпшэння гандлю мы да гэтага часу ішлі наперад павольна, мы павінны ў другім пяцігоддзі ўзяцца за гэту справу шчыльна і вялікасці яго на шырокую большэвіцкую дарогу быстрага пад'ёму. Большэвіцкае вырашэнне гэтай задачы, як адной з самых важных задач бліжэйшых гадоў, павінна быць забяспечана. Мы павінны гэта зрабіць, калі хочам пасапраўднаму палепшыць справу снабжэння рабочых і сялян. Мы павінны гэта зрабіць, калі хочам рашучым пад'ёмам рэальнай заработнай платы і паляпшэннем снабжэння рабочых яшчэ лепш забяспечыць праграму пад'ёму народнай гаспадаркі і быстрае павелічэнне яе прадукцыі. Мы павінны гэта зрабіць ва што-б там ні стала, памятаючы аб тым, што рашэннем гэтай задачы мы маннейшым чынам умацоўваем саюз рабочых і сялян—гэту аснову перамогі сацыялізма.

Тав. Сталін даў добрую ацэнку значэння разгорнутага совецкага гандлю ў нашых умовах. Тав. Сталін знішчаюча адхлястаў як панскапагардлівыя адносіны да совецкага гандлю, так і «лявацка»-дробна буржуазнае глупства наконт неадкладнага пераходу да прадуктаабмену.

Усё гэта падкрэслівае нашы задачы ў адносінах гандлю. Канцылярска-бюракратычныя парадкі ў кіраванні гандлёвай справай заслугоўваюць асабліва рашучага асуджэння. Тут яны яшчэ настолькі моцныя, і так яшчэ слаба разгорнута барацьба з імі, што адной з неабходнейшых задач партыі з'яўляецца задача ліквідацыі гэтых канцылярска-бюракратычных агіднасцяй і ўсямернае падтрымане ўсіх сумленных работнікаў і адданых справе большэвікоў, якія ўпарта працуюць над паляпшэннем арганізацыі гандлю.

Нельга не прызнаць, што ў нас ёсць бліскучыя прадпасылкі для быстрага пад'ёму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця рабочых і сялянскіх мас. Усімі сваімі мерапрыемствамі дзяржава аблягчае пад'ём добрабыту працоўных горада і вёскі.

Мерапрыемствы дзяржавы і партыі накіраваны на тое, каб з дня ў дзень паляпшаць умовы працы рабочых і аблягчаць пад'ём іх вытворчай кваліфікацыі і агульнага культурнага ўзроўню, а гэта ў сваю чаргу дае магчымасць усёй рабочай масе, няўхільна ўзнімаючы прадукцыйнасць працы, быстрэй, чым калі-б там ні было, ісці наперад на шляху паляпшэння свайго матэрыяльнага добрабыту і культурнага росту.

Мерапрыемствы дзяржавы і партыі накіраваны на тое, каб канчаткова змесці з твару совецкай зямлі астаткі эксплаататараў сялянства і знішчыць усе і ўсякія спробы куланкага супраціўлення новаму ладу ў вёсцы і пры гэтым усямерна ўмацаваць калгасы, забяспечыўшы іх машынамі і лепшай тэхнікай і забяспечыўшы быстры рост культурнага жыцця ў вёсцы. Гэта стварае небывала спрыяючыя ўмовы для пад'ёму сельскай гаспадаркі і для забеспячэння культурнага і заможнага жыцця ўсёй масы калгаснікаў і ставіць тэмпы гэтага пад'ёму да новага шчаслівага жыцця ў прамую залежнасць ад арганізаванасці і працыйнасці працы саміх калгаснікаў.

Усе перашкоды на шляху да быстрага пад'ёму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця рабочых і сялянскіх мас. Усімі сваімі мерапрыемствамі дзяржава аблягчае пад'ём добрабыту працоўных горада і вёскі.

Перапрыемствы дзяржавы і партыі накіраваны на тое, каб з дня ў дзень паляпшаць умовы працы рабочых і аблягчаць пад'ём іх вытворчай кваліфікацыі і агульнага культурнага ўзроўню, а гэта ў сваю чаргу дае магчымасць усёй рабочай масе, няўхільна ўзнімаючы прадукцыйнасць працы, быстрэй, чым калі-б там ні было, ісці наперад на шляху паляпшэння свайго матэрыяльнага добрабыту і культурнага росту.

Мерапрыемствы дзяржавы і партыі накіраваны на тое, каб канчаткова змесці з твару совецкай зямлі астаткі эксплаататараў сялянства і знішчыць усе і ўсякія спробы куланкага супраціўлення новаму ладу ў вёсцы і пры гэтым усямерна ўмацаваць калгасы, забяспечыўшы іх машынамі і лепшай тэхнікай і забяспечыўшы быстры рост культурнага жыцця ў вёсцы. Гэта стварае небывала спрыяючыя ўмовы для пад'ёму сельскай гаспадаркі і для забеспячэння культурнага і заможнага жыцця ўсёй масы калгаснікаў і ставіць тэмпы гэтага пад'ёму да новага шчаслівага жыцця ў прамую залежнасць ад арганізаванасці і працыйнасці працы саміх калгаснікаў.

Усе перашкоды на шляху да быстрага пад'ёму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця рабочых і сялянскіх мас. Справа, урэшце, залежыць ад нас саміх, ад нашай работы, ад нашага ўмення арганізаваць барацьбу за выкананне абстаўленых задач.

IV.

БАРАЦЬБА ЗА ПЯЦІГОДКУ І КІРАЎНІЦТВА ПАРТЫІ

Пройдзены перыяд гаворыць аб напружанай барацьбе рабочага класа з астаткамі варожых класаў.

Каб прыйсці з перамогай да задач другой пяцігодкі, рабочы клас павінен быў скінуць са свайго шляху астаткі нэпманскай буржуазіі ў гарадах, разграміць кулацтва ў вёсцы і з дня ў дзень даваць адпор дробна-буржуазнай стыхіі яшчэ вельмі моцнай у нашай краіне.

Нават у большэвіцкай партыі знайшліся значныя групы, якія ў сваіх дробна-буржуазных хістаннях і барацьбе з партыяй адлюстравалі напор варожых класаў. Пад сцягам «левай» апазіцыі, як і пад сцягам права-ўхілісцкай барацьбы з большэвіцкімі тэмпамі і, нарэшце, пад сцягам блокаў гэтых груп і фракцый ішла барацьба з генеральнай лініяй гэтай партыі і з ленінскім кіраўніцтвам, на чале якога нязменна стаяў, стаіць і будзе стаяць **т. Сталін. (Апладысменты).** Партыя з гонарам адбіла ўсе атакі і разграміла правых і «левых» апазіцыянераў. Без гэтага не было-б у нас ні партыі, ні вялікіх перамог сацыялізма. Партыя і рабочы клас маглі ўзяцца за справу першай пяцігодкі толькі пасля разгрому трацкісцкай апазіцыі, адмаўляўшай магчымасць перамогі сацыялізма ў адной краіне. Без ліквідацыі гэтай паражэнцкай групы, якая прабавала цягнуць нас назад да капіталізма, мы не маглі-б і думаць аб той самаадданай барацьбе, якую рабочы клас нашай краіны вёў і пераможна давёў да канца ў першай пяцігодцы. Разграмляючы трацкістаў, партыя адстаяла ленінскі сцяг перамогі сацыялізма ў адной краіне. Толькі тады стварылася ў шырокіх масах рабочага класа поўная ўпэўненасць у правільнасці палітыкі партыі і энтузіязм мас стаў расці з кожным крокам наперад па шляху будаўніцтва сацыялізма. Барацьба за першую пяцігодку не магла-б скончыцца перамогай, калі-б партыя пахіснулася ў барацьбе з правымі, ставіўшымі стаўку на адмаўленне ад большэвіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі і на разгортванне капіталізма ў нашай краіне. У адказ на атакі правых партыя разгарнула сцяг наступлення супроць капіталістычных элементаў па ўсяму фронту, і пад гэтым сцягам мы атрымалі перамогу першай пяцігодкі. Ліквідатарская сутнасць правага ўхіла і яго кулацкая падаплёка былі своечасова выкрыты большэвікамі. У барацьбе з правымі і з «левымі», у барацьбе з іх пераражэнцкай ідэалогіяй партыя згуртавала рабочы клас і мільённыя масы сялянства і вырашыла самую цяжкую задачу будаўніцтва соцыялізма—задачу соцыялістычнай перабудовы вёскі.

Поспехі першай пяцігодкі перад тварам найшырэйшых мас працоўных усяго свету на практыцы даказалі магчымасць пабудовы соцыялізма ў адной краіне. Соцыялізм у СССР перамог і ўсе ўнутраныя труднасці далейшай барацьбы за канчатковую яго перамогу, як-бы яны яшчэ не былі велікі, непараўнальны з тымі, сапраўды велізарнымі труднасцямі, якія ўжо мы перамаглі. У гэтым асноўны сэнс перамогі першай пяцігодкі.

Нельга не супаставіць таго, што адбываецца ў СССР, са становішчам у капіталістычных краінах.

Вось ужо пяты год, як капіталістычны свет не можа выбрацца з глыбокага эканамічнага крызіса. Нават пасля некаторага паляпшэння спраў у капіталістычных краінах у мінулым годзе ўзровень гаспадарчага жыцця ў гэтых краінах усё яшчэ значна ніжэй перадкрызіснага 1929 года. Па дынаміцы народнага даходу СССР і асноўных капіталістычных краін можна судзіць, як развіваюцца справы ў нас і ў іх:

Дынаміка народнага даходу СССР і асноўных капіталістычных краін (у процантах да 1928 г.) *)

КРАІНЫ	1928 г.	1929 г.	1932 г.	1937 г. (аплан)
СССР	100	115,6	182,0	432,0
Англія	100	103,8	88,1	—
Германія

Працяг даклада тав. МОЛАТАВА

...расы і яго партыі разгортваецца ў ...ўнай моры. І таму з той вострас... стала пытанне аб барацьбе з бю...ратыямам, аб барацьбе з дроб...рока-бюракратычнымі метадамі кі...ўніцтва, якія з'яўляюцца горшым ...ражэннем астаткаў капіталізма ў ...тэме кіраўніцтва.

У артыкуле «Да пытанняў ленізма» т. Сталін з усёй яснасцю вы...сеў, у чым заключаецца значэнне ...олетарскай дыктатуры. Ён указаў ...тры асноўныя стадыі дыктатуры ...пролетарыята: 1) скарыстанне ...ады пролетарыята для прадухілен...я эксплаататараў, для абароны краі...ы, для ўмацавання сувязяй з пра...тарыямі іншых краін, для разгро...ту і перамогі рэвалюцыі ва ўсіх ...аінах; 2) скарыстанне ўлады пра...тарыята для канчатковага адрыву ...цоўных і эксплуатуемых мас ад ...ржаўей, для ўмацавання саюза ...олетарыята з гэтымі масамі, для ...ямення гэтых мас у справу со...ыялістычнага будаўніцтва, для ...ержаўнага кіраўніцтва гэтымі ма...мі з боку пролетарыята; 3) ска...станне ўлады пролетарыята для ...ніквідацыі сацыяльнага, для зніш...чэння класаў, для пераходу ў гра...дзянства без класаў, у грамадства ...з дзяржавы.

Гэтыя асноўныя задачы і цяпер ...аюць перад пролетарскай дыктату...рай.

Праграма другой пяцігодкі дае ...ганоўку на пабудову бяскласава...га сацыялістычнага грамадства. Сто...ма, праграма захапляючая, мабі...лізуючая мільёны на любую барацьбу.

Але такая ўжо сіла мінулага, сіла ...звычак, сіла перажыткаў капіта...лізма ў свядомасці людзей, учора...шняе прыдушэнных традыцыямі бур...жаза-памешчыцкага рэжыму; та...я жывучасць дробна-буржуазных ...стояў нават у масах працоўных, ...нат у некаторых праслойках пар...ыі, што і наш бліскучы лозунг аб поў...ным знішчэнні капіталістычных эле...ментаў і класаў наступ успрымаец...ца нецэтка, як канец класавай ба...рацьбы, як пераход да сацыяльнага ...ці да адмаўлення ад зброі. Наяў...ны немалой колькасці ахвотнікаў ...ыць на цяпэнню, трансляваць ...ваду сваёму і перакуліць ў ба...ц абезвітальшчыны нельга асно...ць.

Вось чаму партыя, і перш за ўсё ...Сталін, на кожным кроку засце...рэ «шалупінчасць» гэтых вастраў ...і «славу» герояў самапёка. ...ртыя фастрыруе сапраўдныя пабу...ды бяскласавага грамадства, як ...дачы ўпартай і салідаўды гераічнай барацьбы з астаткамі капіталіз...ма і з увнутранымі і знешнімі ворага...мі перамочнага рабочага класа, з ...мі і ўсякімі вагалі працоўных. Вось чаму актуальнейшай задачай ...тый з'яўляецца ўзмацненне рэво...люцыйнай пільнасці рабочага класа, ...чэ большая мабілізацыя мас для ...ацьбы з трудгасцямі будаўніцтва ...соцыялізма, усяемнае ўзмацнен...не пролетарскай дыктатуры супроць ...ацаў, супроць астаткаў ворожых ...соваў. Для гэтага нам патрэбна ...ртная і мацнейшая дыктатура про...тарыята» (Сталін).

Значэнне гэтай магутнасці і сілы ...ыкі ...ны пяткрэслець тым больш, ...о перад нашай з усёй восцрасцю ...ыць і яшчэ доўга будуць стаяць ...тачы абароны Совецкай рэспубліі ад знешніх нападаў.

Не толькі для гэтага нам патрэб...на магутнасць пролетарскай дыкта...ры. Гэта магутнасць, якая абапраец...ца на высока развітую індустрыю і ...скарыстанне ўсёй сучаснай тэх...кі, нам патрэбна для пераробкі і ...знічэння перажыткаў рэшткі на...шай гаспадаркі, у тым ліку і са...ых адсталай яе галіны — сельскай ...гаспадаркі. Яна патрэбна таксама ...а таго, каб арганізаваць будаў...ніцтва новай культуры і пітанкую ...боту на соцыялістычнаму перавы...хаванню мас.

Наша дзяржава называецца рабо...сялянскай, бо яна апіраецца на ...ое рабочых і працоўных сялян. ...на дзяржава — пролетарская ...ржава, бо яе кіруючай сілай ...ўляецца рабочы клас. Кіраўніцтва ...рабочага класа ў адносінах сялян ...х мас выражаецца цяпер у вялі...чэтай арганізацыйна-гаспадарчай і ...ытучнай дзейнасці і ў арганізацыі ...справы соцыялістычнага пера...хавання вёскі. Кіраўніцтва рабоча...га класа набывае рэсам з тым на...ы, каб забяспечыць інтэрэсы дзяр...авы, як галоўныя інтэрэсы ўсіх ...працоўных нашай краіны.

Гэта асабліва неабходна цяпер, ка...ў рады калгаснікаў уключаюцца ...ямыя апсталыя групы сялян, на ...іх учора яшчэ асабліва спасцярэ...ўся кулацтва і іншых перажыт...ў капіталізма. Толькі апіраючыся ...ўвесь апарат пролетарскай дыкта...туры і ўсё больш разгортваючы ра...ту па соцыялістычнаму перавыха...ванню мас, наша партыя з гонарам ...ыкае задачу ліквідацыі ўсіх ...ласаў у большэвіцкія калгасы, ...ператварэння ўсёй масы працоўных ...ян, як і рабочых, у свядомых і ...ыўных будаўнікоў новага бясклас...ага грамадства.

У руках нашай партыі пролетар...ая дыктатура з'яўляецца, разам з ...м, магутным апаратам агітацыі і перавыхавання самых рабочых, ...тым пос. як рабочы клас узяў ...ладу ў свае рукі, ён атрымаў маг...масць да канца выкараніць рэшту ...ы толькі магілышчыка капіталістыч...ага ладу, але і арганізатара соцыя...лістычнага грамадства. Перад ім, ра...зам з тым, паўстала задача «ахоўваць інтарэсы рабочага класа ад тых жменек, груп, слаёў рабочых, якія ўпарта трымаюцца традыцый (прызычак) капіталізма і прадаўжаюць глядзець на совецкую дзяржаву пара лейшаму: даць «ёй» работы паменш і паторш, садраць з «яе» грошай пабольш» (Ленін). У гэтым знаходзіць сваё выражэнне своеасаблівае праяўленне класавай барацьбы ў нашых умовах. Аб гэтым нельга забываць хоць-бы таму, што ў рабочы клас цяпер уліваюцца мільёны выхадцаў з непролетарскіх слаёў. Умоцненай работай па перавыхаванню адсталых груп і ўсёй масы рабочых у духу соцыялізма мы забяспечваем умацаванне пролетарскай дыктатуры, як рашаючай зброі стварэння новага грамадства. Наша сіла заключаецца ў тым, што арганізаваная маса рабочых ужо ўвайшла ў рады свядомых і актыўных барацьбітоў з перажыткамі капіталізма не толькі ў эканоміцы, але і ў свядомасці працоўных. У гэтай барацьбе рабочы клас ва ўсёй яго масе праходзіць школу соцыялістычнага перавыхавання, без якой нават авангард працоўных не можа дасягнуць спраўды пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства да канца.

Кіраўніцтва усёй гэтай перабудовай і стварэннем новага грамадства знаходзіцца ў руках нашай партыі. Поспехамі і перамогамі нашага будаўніцтва партыя па праву можаганарыцца. Яна іх арганізуе, яна стаіць на чале працоўных, будуючых соцыялізм. У партыі, разам з тым, моцна ўсведамленне адказнасці за недахопы і за адсталасць асобных галін гэтага будаўніцтва.

Вось чаму пасля перамог першай пяцігодкі партыя не толькі не згортвае справу пролетарскай самакрытыкі, але, наадварот, карыстаецца зброяй самакрытыкі для далейшай барацьбы за соцыялізм. XVII з'езд паказаў, што партыя высока трымае сцяг самакрытыкі ў барацьбе з усімі і ўсякімі недахопамі нашай работы. Слухаючы-ж прамовы ўчарашніх ухілістаў, мы павінны сказаць: справа цяпер не ў самабічаванні і не столькі ў прамовах за ранейшых памылках, колькі ў жаданні ўключыцца ў барацьбу, знайсці сабе месца ў радах самаадданых будаўнікоў соцыялізма.

Прымаючы праграму другой пяцігодкі, мы адначасова ставім на XVII з'ездзе арганізацыйныя пытанні партыйнага і совецкага будаўніцтва, ад выражэння якіх на практыцы і будзе залежаць сапраўднае выкананне праграмы новай пяцігодкі. Цяпер, калі ўсведамленне правільнасці палітыкі партыі з'яўляецца здабыткам многіх мільёнаў рабочых і сялян, рашаючае значэнне маюць задачы паляпшэння апарата кіраўніцтва, арганізацыйныя пытанні нашага будаўніцтва, практычная барацьба з бюракратызмам ва ўсіх яго розна відных расцях.

***

І так у нашых руках аграмадныя прыродныя багацці, якія толькі цяпер насапраўднаму ставяцца на службу інтарэсам ўсёй краіны, інтарэсам усёй масы працоўных. Мы стварылі ўжо індустрыю, здольную ў кароткі тэрмін ажыццявіць тэхнічнае пераўзбраенне ўсіх галін народнай гаспадаркі, і ставім задачу тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі ва главу задач другой пяцігодкі. Мы закончылі ў рашаючай частцы рэарганізацыйны перыяд у сельскай гаспадарцы і цяпер маем магчымасць забяспечыць небывалыя тэмпы пад'ёму калгаснай вёскі. Мы наўхільна ідзем на шляху пад'ёму жыццёвага ўзроўню і культуры працоўных нашай краіны і маем цяпер магчымасць ісці ў гэтай справе наперад быстрэй, чым за ўсе мінулыя гады. Мільёны рабочых і сялян згуртаваліся песнымі радамі будаўнікоў соцыялізма, непахісна верачы ў правільнасць шляху, на якому вядзе іх на на партыя. Расце актыўнасць і ініцыятыва ў масах працоўных у барацьбе за перамогу бяскласавага соцыялістычнага грамадства. Вырас і распе з кожным днём вопыт кіраўнікоў усёй нашай будоўлі ў горадзе і вёсцы. Апіраючыся на заводы і калгасы, апіраючыся на ўвесь аппарат пролетарскай дыктатуры, партыя арганізуе барацьбу за ліквідацыю класаў і вядзе працоўных нашай краіны да стварэння бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Няма тых перашкод, якія маглі-б спыніць, або затрымаць рух працоўных СССР да перамогі другой пяцігодкі — да перамогі, арганізаванай якой у руках нашай партыі. Ніякія ворагі, як-бы яны ні прабавалі сарваць перамогу другой пяцігодкі, нам не страшны. Партыя, правёўшая многія баі з апартуністамі усіх масцей, мабілізавана для таго, каб і надалей біць апартуністаў у тэорыі і ў практыцы.

Мы ідзем да перамогі пад сцягам марксізма-ленінізма. Мы пераможам пад гэтым вялікім сцягам, які нясе наперад большэвіцкая партыя, які трымае ў жалезных руках правадыр і гордасць рабочага класа і ленінскай партыі — **тав. Сталін. (Бурныя апладысменты).**

Няхай жыве поўная перамога другой пяцігодкі! **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты. Усе ўстаюць).**

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

На вячэрнім пасяджэнні 5 лютага

Заключнае слова прадастаўляецца тав. **МОЛАТАВУ.** Усе дэлегаты ўстаі і сустракаюць тав. Молатава на трыбуне бурнай авацыяй, крыкамі «ура».

З'езд па прапанове тав. **ЧУБАРА,** старшыня пастанаўляе: «Тэзісы аб плане другой пяцігодкі развіцця народнай гаспадаркі СССР прыняць за аснову і перадаць у камісію для апрацоўкі з улікам абмену думкамі на з'ездзе». Камісія адналасна выбіраецца з'ездам у наступным складзе:

МОЛАТАЎ, СТАЛІН, КАГАНОВІЧ, КУЙБЫШЭЎ, ВАРАШЫЛАЎ, ОРДЖАНІКІДЗЕ, КАЛІНІН, КІРАЎ, КАСІОР, МІКАЯН, ЯКАЎЛЕЎ, ЛЮБІМАЎ, АНДРЭЕЎ, ПЯТАКОЎ, МЕЖЛАУК, ЧУБАР, ГАЛАДЗЕД, ІСАЕЎ, МУСАБЕКАЎ, КАБАКОЎ, ГРАДЗІНСКІ, СУЛІМАЎ, РАХІМБАЕЎ, РАБІНІН, ПАХОМАЎ, ГАЙСТЭР, РУДЗУТАК, ШВЕРНІК, ЮРКІН.

АБ РАБОЦЕ ДЭЛЕГАЦЫІ ВКП(б) У ВККІ

Справаздачны даклад тав. МАНУІЛЬСКАГА на XVII з'ездзе ВКП(б))*

I. АБ НАРАСТАННІ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА КРЫЗІСА

Таварышы, час, працёкшы пасля XVI з'езда, працёкшы пад знакам развіцця сусветнага эканамічнага крызіса, характарызуецца ростам фашызма, развязваннем імперыялістычных войн і ўзмацненнем рэвалюцыйнага руху мас, спрыяючага высяванню рэвалюцыйных крызісаў у паасобных капіталістычных краінах.

Прагноз сусветнага развіцця, даны тав. **Сталіным** на XVI партыйным з'ездзе, пацверджан усім ходам сусветных падзей мінулых трох з паловай год.

На XVI партыйным з'ездзе ўлетку 1930 года тав. **Сталін** гаварыў, што стабілізацыі капіталізма прыходзіць канец. XII пленум ВККІ ў 1932 г. канстатаваў канец капіталістычнай стабілізацыі.

На XVI партз'ездзе тав. **Сталін** гаварыў, што ўздым рэвалюцыйнага руху мас будзе нарастаць з новай сілай. Зараз ва ўсім капіталістычным свеце нарастае рэвалюцыйны рух, які прымае ў некаторых краінах нават форму бражэння ў арміі.

На XVI партыйным з'ездзе тав. **Сталін** гаварыў, што крызіс эканамічны будзе перарастаць у крызіс палітычны, г. зн. рэвалюцыйны. Зараз, у 1934 г. у радзе капіталістычных краін ужо ў наяўнасці крызіс вярхоў, які перарастае ў некаторых краінах у агульнанацыянальны рэвалюцыйны крызіс.

Тады-ж тав. **Сталін** гаварыў, што буржуазія будзе шукаць выхаду ў галіне ўнутранай палітыкі ў далейшай фашызацыі, скарыстоўваючы для гэтага ўсе рэакцыйныя сілы, у тым ліку і социял-дэмакратыю. У студзені 1933 г. у цэнтры Еўропы, у Германіі, буржуазія ўстанавіла фашысцкую дыктатуру, даючы сігнал усёй сусветнай рэакцыі для наступлення на рабочы клас. II Інтэрнацыянал пасля ганебнай капітуляцыі германскай социял-дэмакратыі перад фашызмам ідзе на ўсіх парах па шляху далейшай фашызацыі.

Тав. **Сталін** гаварыў, што ў галіне знешняй палітыкі буржуазія будзе шукаць выхаду ў імперыялістычных войнах і асабліва ў контррэвалюцыйнай вайне супроць СССР. У 1931 г. японскі імперыялізм напаў на Кітай, вядзе гэту вайну па цяперашні час і сёння пагражае контррэвалюцыйнай вайной краіне Совецкаю.

Нарэшце, тав. Сталін гаварыў, што пролетарыят, змагаючыся з капіталістычнай эксплоатацыяй і ваеннай небяспекай, будзе шукаць выхаду ў рэвалюцыі.

За апошнія тры гады адбылося далейшае развіццё кітайскай рэвалюцыі, звязанае з агромнымі поспехамі кітайскіх Совецтаў. У Іспаніі — рэвалюцыя, якая перарастае в буржуазна-дэмакратычнай у пролетарскую.

Што гэта за паласа сусветнага развіцця, таварышы, якая характарызуецца сканчэннем капіталістычнай стабілізацыі і ўпаўзаннем капіталістычнага свету ў другі тур рэвалюцый і войн? Гэта паласа высявання агульнанацыянальных крызісаў у паасобных капіталістычных краінах. Гэта паласа высявання рэвалюцыйнага крызіса сусветнай сістэмы капіталізма.

Гэты рэвалюцыйны крызіс вырастае з абвастрэння агульнага крызіса капіталізма. Але ён прадпалагае большую расхістанасць капіталістычнай сістэмы, большы распад яе гаспадарчых і палітычных сувязяй, большы размах масавага рэвалюцыйнага руху, а галоўнае—большую арганізацыю сіл пролетарскай рэвалюцыі, большы ўплыў Комінтэрна і яго секцый, чым той, які мы маем у наяўнасці сёння. Рэвалюцыйны крызіс неўнікнёна выспее таму, што масавыя рэвалюцыйныя рухі, якія развіваюцца, будуць паскарацца далейшае расхістанне капіталістычнай сістэмы, а гэта расхістанне ў сваю чаргу будзе спрыяць росту сіл пролетарскай рэвалюцыі і сіл Комінтэрна; ён неўнікнёна выспее таму, што па меры выканання другой пяцігодкі і далейшага ўмацавання пролетарскай дыктатуры ў СССР будуць у абстаноўцы паглыблення агульнага крызіса капіталізма мяняцца і суадносіны класавых сіл на карысць пролетарскай рэвалюцыі.

Капіталізм відавочна прайшоў самы ніжэйшы пункт эканамічнага крызіса і зараз з 1932 г. ён топчацца на месцы. Але калі-б нават яму ўдалося выкарабкацца часова на ста дзью дэпрэсіі і нават чуць-чуць вышэй, то тым не менш ні «прасперыці», ні аднаўлення капіталістычнай стабілізацыі не будзе. І гэтым капіталізм паласы дэпрэсіі і нават кан'юнктуры чуць-чуць павышэй, адрозніваўся-б ад таго капіталізма, якім ён уступіў у сусветны эканамічны крызіс у 1929 годзе. Пяць год гэтага крызіса расхісталі яшчэ больш сусветную сістэму капіталізма і паглыбілі яе агульны крызіс, тым больш, што за гэтыя пяць год вырасла эканамічная, палітычная і ваенная магутнасць Совецкага Саюза, што на берагах Ціхага акіяна ўтварыўся новы фарпост сусветнай пролетарскай рэвалюцыі ў асобе кітайскіх Совецтаў і вырослі другія палітычныя фактары, якія паскараюць нарастанне рэвалюцыйнага крызіса-вайна на Далёкім Усходзе і ўстанаўленне фашысцкай дыктатуры ў Германіі. І гэта трэба асабліва падкрэсліць, бо гэта мае вялікае значэнне ў азначэнні рэвалюцыйнай перспектывы сусветнага рабочага руху. Стадыя дэпрэсіі не дала-б, на прыклад, германскаму фашызму той перадышкі, якую атрымаў італьянскі фашызм у перыяд частковай капіталістычнай стабілізацыі.

За гэтыя пяць год сусветнага эканамічнага крызіса расхістанасць капіталістычнай сістэмы зайшла так далёка, што аб'ектыўныя прадпасылкі рэвалюцыйнага крызіса ўжо спелыя ў найбольш слабых звеннях капіталістычнай сістэмы, калоніях і за лежных краінах, яны амаль спелыя ў Цэнтральнай Еўропе (Германіі, Аўстрыі, Чэха-Славакіі), на Балканах, Польшчы. Прыбалтыцы, яны выспяваюць у найбольш моцных звеннях капіталістычнай сістэмы, абвастрыў усе імперыялістычныя супярэчнасці.

Да крызіса імперыялістычныя супярэчнасці няўхільна раслі з года ў год. Ужо VI кангрэс Комінтэрна ўлетку 1928 г. сігналізаваў, што наступіўшы трэці перыяд пасляваеннага развіцця капіталізма прыводзе неўнікнёна дзяржавы і класы да сутычак агромнай сілы. Цяпер імперыялістычныя супярэчнасці насталі настолькі, што пытанне аб перадзеле свету зноў устае з яшчэ большай вастрынёй, чым у 1914 г.

Свет з усіх бакоў мініраван зараз узрыўчатымі матэрыяламі, сярод якіх ачумелыя ўрады і іх агенты, накшталт Ван дэр-Люббе, носяцца па падземных ходах з запаленымі факеламі.

Аб набліжэнні вайны гаворыць зрыў тых дагавароў, якімі кіруючы клас рэгуляваў у перыяд першага тура рэвалюцый і войн узаемадносіны паміж сабой на міжнародным арэне. Зрываецца Версаль, Вашынгтонскі дагавор 9-ці дзяржаў аб Кітаі. Раздзел Кітая імперыялістамі пачаўся.

З барацьбы вакол Кітая, як аднаго з асноўных элементаў імперыялістычных супярэчнасцяй, вырастае вялікі ціхаакіянскі канфлікт, які разрывае ўжо рамкі другога Вашынгтонскага дагавора пяці дзяржаў, аб суадносінах морскіх сіл.

Хто ўзначаліваў сусветную рэакцыю да крызіса? Імперыялістычная Францыя.

Хто ўзначальвае зараз сусветную рэакцыю?—Англія.

Англія стаіць за спіной Японіі і Германіі, руку якіх яна накіроўвае цішком супроць СССР. Але падрыхтоўка вайны супроць СССР—гэта працяг на міжнародным арэне той грамадзянскай вайны, якую буржуазія ўсіх капіталістычных краін вядзе супроць рабочых, хоць і з розпай ступенню лютасці ў розных краінах.

Да сусветнага эканамічнага крызіса ў радзе капіталістычных краін буржуазія ўжо змагалася з комуністычным тэрарыстычнымі метадамі. Сёння і колькасць гэтых краін вырасла, і метады барацьбы сталі яшчэ больш варварскімі, і гэта адно ўжо сведчыць аб паглыбленні і абвастрэнні агульнага крызіса капіталізма, аб паспяванні тых умоў, з якіх вырастае рэвалюцыйны крызіс. Амаль ва ўсіх капіталістычных краінах у той ці іншай форме намеціўся свой нацыянальны крызіс «вярхоў», які не прывёў яшчэ, за выключэннем Кітая і Іспаніі, да рэвалюцыі, але пацягнуў за сабой фашызацыю ўсіх буржуазных палітычных партый, уключаючы социял-дэмакратыю; у некаторых краінах, як Германія, ён прывёў да ўстанаўлення фашысцкай дыктатуры.

Чаму гэта адбылося? Таму, што сілы пролетарскай рэвалюцыі яшчэ не выспелі, а сусветная буржуазія, улічыўшы ўрокі паражэння рускай буржуазіі ў кастрычніку 1917 г., ударае ўсёй сваёй сілай па пролетарыяту ў момант, калі ён яшчэ не можа прыняць рашаючага бою. Сіла пролетарскай рэвалюцыі аказалася часова ў паасобных капіталістычных краінах слабей сіл буржуазнай рэакцыі. Яны аказаліся слабей таму, што социял-дэмакратыя раскалола пролетарыят, таму што яна паставіла агромныя масавыя арганізацыі рабочага класа, вырасшыя асабліва сільна пасля першага тура рэвалюцый і войн, на службу капіталу, таму што адну частку пролетарыята, іншую за ёю, яна сістэматычна дэмаралізавала сваімі заклікамі абараняць буржуазную дэмакратыю, г. зн. буржуазную дыктатуру, таму што яна памагла буржуазіі абязброіць рабочы клас, як гэта відаць на прыкладзе Германіі і Аўстрыі. А гэты расколаты рабочы клас процістаяў манапалістычнаму капіталу і буйнаму землеўладанню, якія часова пераадолелі свае ўнутраныя супярэчнасці ўстанаўленнем фашысцкай дыктатуры, згуртаваннем сіл буржуазнай рэакцыі ў адзін ударны кулак перад тварам пагражаючай ім пролетарскай рэвалюцыі. Раскол рабочага класа меў яшчэ і той згубны вынік, што ён аслабліў у агромнай ступені і сілу ўплыву пролетарыята на рэзервы пролетарскай рэвалюцыі—асноўныя масы сялянства, ніжэйшыя слаі служачых і дробную гарадскую буржуазію. У Германіі дзякуючы гэтаму значная частка сялянства, служачых, дробнай гарадской буржуазіі пахіснулася ў бок буржуазнай рэакцыі.

Унутраная бойка ў лагеры буржуазіі, якая суправаджаецца банкрутствам буржуазнай дэмакратыі, ужо ў радзе капіталістычных краін перарастае ў агульнанацыянальны крызіс, г. зн. у такі крызіс, калі накапічаецца незадаволенне мас ідзе не па каналу фашызма, а накіроўваецца супроць самой сістэмы капіталізма.

Дакладчык ілюструе гэта палажэн не багатым фактычным матэрыялам, узятым па трох катэгорыях краін: а) найбольш сільных звеннях капіталістычнай сістэмы—ПАЗШ, Францыі і Англіі, дзе няма яшчэ крызіса вярхоў, але развіваюцца стачкі і дэманстрацыі. Ён напамінае аб хваляваннях у 1931 г. у англійскім флоце, якія паставілі Англію перад пагрозай агульнанацыянальнага рэвалюцыйнага крызіса; б) фашызуючыхся і фашысцкіх краінах, дзе «капіталісты ўжо не * сілах утрымаць сваю дыктатуру старымі метадамі парламентарызма і паогул буржуазнай дэмакратыі» і вымушаны з прычыны гэтага «перайсці да адкрытай тэрарыстычнай дыктатуры». Але з пераходам да фашысцкай дыктатуры крызіс буржуазнай улады не знікае—ён паглыбляецца. Ад таго, што германскі фашызм ліквідаваў веймарскую канстытуцыю, ён не ўстараніў крызіса буржуазнай улады ў Германіі. Буржуазная дыктатура, даючы штурмовік у спіну социял-дэмакратыі, падобна рускаму царызму, адкідваўшаму падтрымманне лібералаў і кадэтаў, яшчэ звужае сваю масавую базу і далей коціцца ў бяздонне.

У гэтых краінах фашызм тэрарыстычнай дыктатурай затрымлівае часовы выбух вялікіх масавых рухаў.

Але затрымаць надоўга ён не можа рэвалюцыйнага руху мас ні ў Польшчы, ні ў Румыніі, ні ў Італіі, ні нават у Германіі, дзе адбываюцца і стачкі і рассыпныя дэманстрацыі; в) найбольш слабых звеннях капіталістычнай сістэмы, калоніях, залежных і аграрных краінах.

Што мы бачым тут? Рэвалюцыя ў Кітаі і Іспаніі. Але рэвалюцыя ў Кітаі — гэта рэвалюцыя ў агромнай краіне, дзе скрыжаваліся ўсе супярэчнасці імперыялістычнай сістэмы. Прарыў ланцута ў гэтым звяне хістае ўсю сусветную сістэму імперыялізма. А гэты прарыў пачаўся з утварэннем Совецкага Кітая, сілы якога растуць і мацнеюць з кожным днём. Совецкі Кітай — гэта заўтрашні дзень задаўленых імперыялізмам калоній і залежных краін.

Іспанія: 14 красавіка 1931 года яшчэ адна карона злятае з галавы манарха і падае ў сметнік. Штурмовік пляча падняўшыхся рабочых і сялян апракідваецца ваенна-тэрарыстычная дыктатура, паказваючы германскаму і італьянскаму фашызму іх заўтрашні дзень.

Але, таварышы, ужо пачынае хістацца ў паасобных капіталістычных краінах і тая ўзброеная сіла, апіраючыся на якую кіруючыя класы прабуюць затармазіць рэвалюцыйны рух мас. Мінуўшыя з часу XVI з'езда 3 з паловай гады характарызаваліся бражэннямі ў арміі, прымаўшымі ў паасобных мясцах формы адкрытага паўстання. Усё часцей становяцца выпадкі братання салдат з бастуючымі рабочымі. Так было ва Францыі, так было ў Бельгіі ў часе стачкі гарнякоў у Барынажы, так было і ў Швейцарыі, і ў Японіі, і ў іншых мясцах.

Галандыя: 1933 год. На стыку імперыялізма з калоніямі, у Сурабайе, працяглыя хваляванні сярод экіпажаў галандскага флота, расцэ ложанага ў Інданезіі. 5 лютага 1933 года буйнейшы ваенны крэйсер «Сем правінцый» паўтарае эпапею «Пацёмкіна». Перад яўным спачуваннем да паўстаўшых маракоў каманды астатніх суднаў, галандскі ўрад робіць над уладным крэйсерам крывавую рэпетыцыю наветрана-марскай вайны.

Няхай гэтыя рухі не прывялі яшчэ да перамогі, але-ж без «Пацёмкіна» не было-б і «Аўроры». На такіх рухах растуць і ўмацоўваюцца компартыі, вучацца рэвалюцыйнай навуцы самыя шырокія масы, вучацца асабліва быстра, бо зараз у капіталістычных краінах шлях ад «Пацёмкіна» 1905 г. вядзе значна хутчэй да «Аўроры» Окцябра 1917 года; чым гэта было ў царскай Расіі.

Калі падвесці вынікі цяперашняму становішчу сусветнага рэвалюцыйнага руху, то прыдзецца зрабіць наступныя вывады:

У наяўнасці такая расхістанасць капіталістычнай сістэмы ў слабых яе звеннях, што ў адных з гэтых краін выспявае, а ў другіх ужо выспеў крызіс вярхоў і пачынае перарастаць у агульнанацыянальны рэвалюцыйны крызіс. Але няма яшчэ такой расхістанасці капіталістычнай сістэмы ў цэлым, якая-б стварала абстаноўку, спрыяючую непасрэднаму прарыву імперыялістычнага ланцуга ў яго слабых звеннях. Палітычнае панаванне буржуазіі падрываецца ўсюды, але няроўнамерна; менш за ўсё яно пакуль падарвана ў ПАЗШ, Францыі і часткова Англіі, больш усяго — у калоніях і фашысцкіх краінах. Устанаўленне фашысцкай дыктатуры з'яўляецца прамежнай станцыяй у далейшым высяванні рэвалюцыйнага крызіса.

У наяўнасці такое глыбокае нездавальненне мас, такое абурэнне іх капіталістычным рабствам, якое ўжо сёння пагражае буржуазіі звяржэннем яе дыктатуры. Гэта нездавальненне праяўляецца няроўнамерна, розначасова, у самых рознастайных формах рэвалюцыйнага руху, ад невялікіх рассыпных дэманстрацый і эканамічных стачак у Германіі да партызанскай вайны ў калоніях, да хваляванняў у арміі і адкрытых узброеных паўстанняў. Аднак, у пераважнай большасці капіталістычных краін дзяржаўны апарат прымусу яшчэ не настолькі расхістан, масавы базіс буржуазнай дыктатуры яшчэ не настолькі разбуран, а масавы рэвалюцыйны рух не настолькі сільны, каб ён мог прарвацца явачным парадкам праз штыхі і скрозь штыхі пачынаючай хістацца ўзброенай сілы буржуазіі. У сілу гэтага буржуазія заганяе тэрарыстычнымі мерапрыемствамі нездавальненне мас углыб, але іменна гэтым яна стварае ўмовы для ўзрываў агромнай сілы, якія могуць паскорыць у кожны момант тэмпы нарастання рэвалюцыйнага крызіса капіталістычнай сістэмы.

Гэты момант «печаканасці» і «раптоўнасці» рэвалюцыйных узрываў з'яўляецца асабліва характэрнай рысай усёй цяперашняй абстаноўкі.

У наяўнасці ўсюды актыўны ўдзел комуністаў у першых радах рэвалюцыйнага руху мас, у радзе выпадкаў у наяўнасці самастойнае кіраўніцтва компартыяй рэвалюцыйнымі рухамі — але яшчэ няма такога палітычнага і арганізацыйнага росту компартый, які-б забяспечваў ізаляцыю ў метраполіях социял-дэмакратыі, а ў калоніях нацыянал-рэфармізма, з'яўляючыхся галоўным тормазам рэвалюцыйнага руху мас. Комуністы ў пераважнай большасці капіталістычных краін не заваявалі яшчэ большасці рабочага класа. Комуністы ўжо ў радзе капіталістычных краін вядуць пад гегемоніяй пролетарыята значныя часткі сялянства, як напрыклад, у Балгарыі, Польшчы, не кажучы аб Кітаі, але яны не дабіліся яшчэ гэтай гегемоніі над значнай часткай працоўных горада і вёскі ва ўсіх капіталістычных краінах.

А гэта ўсё разам узятае сведчыць аб тым, што галоўнейшых умоў рэвалюцыйнага крызіса сусветнай капіталістычнай сістэмы яшчэ няма ў наяўнасці, што сілы пролетарскай рэвалюцыі яшчэ не паспелі для рашаючага бою ў паасобных капіталістычных краінах.

І іменна таму, што гэтых умоў рэвалюцыйнага крызіса няма ў наяўнасці, але яны спеюць з кожным месяцам і днём, буржуазія спяшаецца развязаць фурыі вайны і фашызма, каб знайсці выхад з душачых яе капіталістычных супярэчнасцяй.

II. ВАЙНА, ФАШЫЗМ І РЭВОЛЮЦЫЯ

Але імперыялістычная вайна і фашызм — не толькі прадукт абвастрэння імперыялістычных супярэчнасцяй і разлажэння капіталізма; яны, у сваю чаргу, як падкрэсліў у сваім дакладзе тав. **Сталін,** яшчэ далей паглыбляюць агульны крызіс капіталізма, яшчэ больш раз лагаюць капіталістычную сістэму.

Два самыя рэакцыйныя капіталістычныя ўрады свету — Японія і Германія — выступаюць зараз у якасці аб'ектыўных фактараў разбурэння капіталістычнай сістэмы, паскараючых сваёй авантурысцкай контррэвалюцыйнай палітыкай выспяванне рэвалюцыйнага крызіса.

Увесь вопыт сусветнай гісторыі вучыць, што самыя рэакцыйныя ўрады падрыхтоўвалі часцей за ўсё самыя вялікія рэвалюцыі. Царызм таксама, падобна германскаму фашызму, граміў рабочы клас і большэвікоў, але не царызм разграміў рабочы клас і большэвікоў, а большэвікі, на чале рабочага класа, разграмілі царызм. **(Апладысменты).**

Царызм таксама, як і імперыялістычная Японія, хацеў сарваць рэвалюцыю войнамі, але рэвалюцыі 1905 і 1917 г.г. сарвалі войны царызма. Царызм таксама, як Германія і Японія, хацеў быць жандарам капіталістычнага парадку, але пролетарская рэвалюцыя самую рэакцыйную і адсталую краіну ў свеце ператварыла ў вялікага вартавога соцыялістычнага парадку. **(Апладысменты).**

Ваенная кліка Японіі хоча вайны супроць СССР таму, што нарастае пагроза рэвалюцыі японскіх рабочых і сялян. Імперыялістычную Японію раздзіраюць яе ўнутраныя супярэчнасці.

Цвёрдая, няўхільная палітыка міру Совецкага Саюза, падмацаваная цяпер радам пактаў аб ненападзе, прызнаннем СССР Паўночна-Амерыканскімі Злучанымі Штатамі, зрывала да гэтага часу правакацыйную палітыку японскай ваеннай кліки. Але контррэвалюцыйны авантурызм пазбаўлен палітычнага розуму. Напад імперыялістычнай Японіі на СССР не знят з парадку дня.

Але што азначала-б контррэвалюцыйная вайна японскага імперыялізма супроць СССР?

Ленін пісаў аб вайне 1914 года, што яна стварыла ў Еўропе рэвалюцыйную сітуацыю. Але ў 1914 г. капіталізм уступаў у вайну не пасля пяці год сусветнага эканамічнага крызіса, які ўжо абыйшоўся капіталістычнаму свету па матэрыяльных стратах больш чым сусветная імперыялістычная вайна 1914-18 г.г. Сёння капіталізм падыходзіць да новай імперыялістычнай вайны, ужо ахоплены агульным крызісам, чаго не было ў 1914 годзе. Сёння і ў паасобных капіталістычных краінах, і ва ўсім капіталістычным свеце ў цэлым наспяваюць ужо элементы рэвалюцыйнага крызіса, чаго свет не ведаў у 1914 годзе. Сёння буржуазія не зможа адкупіцца ад рэвалюцыі рэформамі так, як яна адкупілася ў 1918 годзе ў Аўстрыі і Германіі. Сёння рабочыя масы прарабілі ўжо ў радзе капіталістычных краін вопыт «дэмакратычнага соцыялізма» Гільфердынга і Отто Бауэра. Сёння масы абучаны разуменню значэння рэвалюцыйнага насілля крывавым вопытам фашысцкай дыктатуры. Сёння ёсць Ленінска-Сталінскі Комуністычны Інтэрнацыянал, якога не было ў 1914 г. **(Працяжныя апладысменты).**

Сёння на флангу Японіі вісіць трохсоттысячная армія Совецкага Кітая, які ўзначаліць у выпадку вайны рух 400-мільённага народу супроць імперыялістычнага ярма. **(Апладысменты).** Сёння ёсць СССР — узброеная частка сусветнага пролетарыята.

У выпадку нападу імперыялістычнай Японіі на СССР сілы японскай рэвалюцыі — гэта не толькі японская компартыя і японскія рабочыя і сяляне, а плюс падтрыманне ўсяго міжнароднага пролетарыята і, перш за ўсё, яго ўзброенай часткі СССР. **(Апладысменты).**

Няхай папрабуе буржуазія сёння ўзброіць масы ў капіталістычных краінах, так, як яна ўзброіла іх в канцу сусветнай імперыялістычнай вайны, яна тады зразумее, што значыць для лёсу капіталізма ўзброеныя народы і як узброеныя народы паскараюць развіццё рэвалюцыйнага крызіса. **(Апладысменты).**

Няхай японская ваенная к

Працяг даклада тав. МАНУІЛЬСКАГА

яна забіла рукамі Носке 20 тыс. рэвалюцыйных матросаў і салдат, бо не прыцлося-б нават расстрэльваць 35 чалавек, як гэта зрабіў з берлінскімі рабочымі паліцэйпрэзідэнт Цэргібель 1 мая 1929 г. Ён дастаткова было арыштаваць 35 фашысцкіх правадыроў плюс 2-3 буйных капіталістаў, снабжаўшых фашыстаў матэрыяльнымі сродкамі, расшусіць фашысцкія арганізацыі і іх баявыя дружыны, канфіскаваць іх зброю, забраць іх фінансавыя сродкі, закрыць фашысцкі друк, стварыць для фашыстаў рэжым, які яны ўстанавілі загад для сацыял-дэмакратычных рабочых, не кажучы ўжо аб комуністычных.

І гэтыя меры былі-б падтрыманы германскай компартыяй і мільёнамі ідучых за ёю рабочых. Германская компартыя пакінула-б за сабой толькі права крытыкі хістанняў і непаслядоўнасці сацыял-дэмакратыі, настойваючы таксама на роспуску рэйхсвера, узбраенні рабочых для абароны супроць фашысцкіх бандаў, і для расшырэння заваявання рабочага класа.

Сацыял-дэмакратыя магла загарадзіць дарогу фашызму і пры ўрадзе Брюнінга ў 1930-1932 г., бо яна трымала пяцімільённымі профсаюзамі, трымала ў руках дзяржаўны апарат Прусіі. На паліцэйскіх танках і бронезіках знаходзілі члены сацыял-дэмакратычнай партыі, берлінская паліцыя была ўкамплектавана з «дэмакратычных» элементаў Зеверынгам, Грыжэзінскім. Калі-б комуністы распалагалі дзесятай і дваццатай часткай той аброі, якая была ў руках прускага сацыял-дэмакратычнага ўрада, сёння не было-б у Германіі фашызма.

Сацыял-дэмакратыя магла сарваць планы фашыстаў і пры ўрадзе Шлейхера-Папена з, большым напружаннем сіл, чым пры ўрадзе Мюллера, пасля 20 ліпеня, аказаўшы супраціўленне разгону прускага сацыял-дэмакратычнага ўрада і руйнаўшы ў бой мільёны рэйхсбаннер. Яна магла не дапусціць Гітлера да ўлады, напярэдадні яго прыходу, прыняўшы прапанову КПГ аб адзіным фронце барацьбы ў студзені 1933 г.; яна магла звергнуць урад Гітлера пасля яго прыходу, найпоўнымі насустрач прапанове Комінтэрна ад 5 сакавіка 1933 г. аб агульнай барацьбе супроць фашызма. Заклік с.-д., АДГБ і компартыі да ўсеагульнай стачкі разграміў-бы фашызм, таксама як у 1920 г. усеагульная стачка германскіх рабочых ліквідавала капаўскі путч.

Але сацыял-дэмакратыя не стала і не магла стаць на гэты шлях таму, што з фашызмам у яе была агульная глеба — захаванне капіталізма, таму што яна ведала, што барацьба рабочага класа, пачатая супроць фашызма, перахлісне цяпер яе галаву і вылецца ў рэвалюцыю, накіраваную супроць панавання капітала наогул.

Але што-ж было рабіць пры такіх умовах комуністычнаму авангарду? Ісці ў бой аднаму, без падтрымання с.-д. рабочых, без удзелу пяці мільёнаў рабочых, арганізаваных у рэфармісцкія прафсаюзы, марны супроць сябе адзіны фронт усёй буржуазнай фашысцкай рэакцыі, уключаючы ў яго і сацыял-дэмакратыю? Не, таварышы, гэтага германская компартыя не магла зрабіць, калі яна не хацела стацьахвярай фашысцкай і сацыял-дэмакратычнай правакацыі, разлічанай, як гэта відаць з усяго лейпцыгскага працэса, на тое, каб выклікаць авангард пролетарыята на перадчасное выступленне, і фізічна знішчыць яго.

За прыход фашызма да ўлады ў Германіі нясуць адказнасць не толькі Вельсы і Лейпарты ў Германіі, але і сацыялісты і рэфармісты ва Францыі, і генеральны совет, і лейбарыцкая партыя ў Англіі, і ўвесь II Інтэрнацыянал.

II Інтэрнацыянал — галоўная апора сусветнай рэакцыі. Ва ўмовах нарастаючага сусветнага рэвалюцыйнага крызіса ён адыгрывае такую-ж ролю, якую адыгрывала царква ва працягу стагоддзяў, як сродак абману мас

Разбурэнне ўплыву сацыял-дэмакратыі ёсць адна з важнейшых умоў паскарэння нарастання рэвалюцыйнага крызіса. І адным з буйнейшых паказальнікаў такога нарастання рэвалюцыйнага крызіса з'яўляецца пачаўшыйся крызіс II Інтэрнацыянала. Паглыбляецца надлом капіталізма, расце надлом і сацыял-дэмакратыі. Перадваеннае абвастрэнне імперыялістычных супярэчнасцяй развальвае II Інтэрнацыянал, як міжнародную арганізацыю; яшчэ да вайны ў адрозненне ад 1914 г., выдзяляюцца нэо-фашысцкія групы, у сацыял-фашысцкіх верхах ідзе грызня, адлюстроўваючая ўнутраную барацьбу ў лагеры буржуазіі.

Але яшчэ больш паказальны для цяперашняга становішча міжнароднай сацыял-дэмакратыі яе ідэйны разброд. Яе лозунгі сёнешняга дня — гэта істарычныя скачкі з боку на бок, якія сведчаць аб велізарнейшым замяшанні ў яе радах

III. СТАНОВІШЧА СЕКЦЫЙ КОМІНТЭРНА

Разброд і крызіс сацыял-дэмакратыі працякаюць не аўтаматычна, як дзеянне сляпых сіл загнаўчагася капіталізма, а ў нястомнай штодзённай барацьбе комуністаў за заваяванне большасці рабочага класа. Крызіс сацыял-дэмакратыі ёсць, перш за ўсё, рэзультат шматгадовай барацьбы Комінтэрна і яго секцый супроць II Інтэрнацыянала. І тым не менш, калі компартыі яшчэ не паклалі сацыял-дэмакратыі на абедзве лапаткі, то гэта паказвае слабую работу компартый, не скарыстаўшых як трэба сусветны эканамічны крызіс для падрыву ўплыву сацыял-дэмакратыі і ўмацавання сваіх пазіцый у сусветным рабочым руху. Калі-б компартыі не адставалі ў справе заваявання большасці рабочага класа, зараз тэмпы развіцця сусветнага рэвалюцыйнага крызіса былі-б іншыя і іншым быў бы ўвесь ход падзей і ў Германіі і на ўсім свеце.

Тав. Сталін вучыць большэвікоў безбоязна ўскрываць усе свае недахопы, каб тым самым узняць якасць нашай работы на большую вышыню і на нашых пленумах ВККІ і ў нашай штодзённай рабоце Комінтэрн падвяргае слабасці, памылкі, недахопы, хібы сваіх секцый бязлітаснай крытыцы. Верна, што комуністы былі ва ўсіх рэвалюцыйных рухах іх унутраным матэрам, што яны былі адзінай партыяй, узначальваўшай рух беспрацоўных: яны прымалі на сябе і залпы ў Жэневе і ўвесь цяжар рэпрэсій, якія абрушваюцца пасля рухаў. Але верна таксама і тое, што комуністы часта не кіравалі гэтымі рухамі і не кіравалі таму, што раней не вялі штодзённай чорнай работы па збіранню і арганізацыі сіл рабочага класа для вялікіх масавых рухаў. Вялікія падзеі часта заставалі знянацку компартыі. Тое, што тав. Сталін гаварыў аб арыстацыі некаторых комуністаў на стыхійную перамогу рэволюцыі, б'е не ў брыво, а ў вока сяго-таго з брацкіх компартый. І ў секцыях Комінтэрна ёсць комуністы, якім не чужды такія нарокі, як чэсная балбатня, якую бічаваў тут тав. Сталін. Асабліва часта праяўляецца гэты нарок у раду комуністаў раманскіх краін, якія страдаюць вялікай арганізацыйнай блізарукасцю.

Многія комуністы гатовы ў любую мінуту памерці гераічна на барыкадзе, але гераізма будзённай, крапатлівай работы яны зразумець не могуць. Іх лягчэй рушыць на паўстанне, чым прымусіць працаваць з дня на дзень у рэфармісцкім ці фашысцкім профсаюзе, дзе прыходзіцца весці доўгую асаду, а не рабіць рапатоўныя атакі.

Комінтэрн гадамі біўся з італьянскай компартыяй, каб зламаць супраціўленне італьянскіх таварышоў рабоце ў фашысцкіх профсаюзах, і поўнага пералому ён не дабіўся да гэтага часу. Толькі з вялікім нацескам удалося дабіцца ў кітайскіх таварышоў работы ў жоўтых гаміндановскіх профсаюзах. Маладыя кадры компартый лічаць за лепшае самае цяжкае падполле, чым быць у адной зале разам з фашысцкім камісарам, дыхаць з ім адным паветрам. У краінах, дзе комуністы маюць свае адкрытыя ці поўзакрытыя арганізацыі, яны лічаць за лепшае замыкацца толькі ў іх, а не ісці ў іншыя арганізацыі для расшырэння ўплыву партыі.

КІМ за рад год выхаваў пад кіраўніцтвам Комінтэрна найлепшае пакаленне маладых большэвікоў, даказаўшых не раз сваю беззаветную адданасць справе комунізма, але глыбока ў масы рабочай моладзі ён не пранік. Гэтай моладзі не мае таксама за сабой і сацыял-дэмакратыя. Моладзь ахоплена ў капіталістычных краінах многамільённымі спартыўнымі арганізацыямі, створанымі буржуазіяй, яе папамі, яе ваеннымі штабамі. У Германіі пэўная частка беспрацоўнай моладзі пайшла ў фашысцкую казарму, але комсамольцы не зусім зразумелі гэты ўрок. Яны мужна біліся з фашыстамі ў Германіі, у радзе краін яны не дрэнна разгортваюць работу ў арміі, атрымліваючы за яе шматгадовыя катаржныя прыгавары, але пайсці, напрыклад, у каталіцкую спартыўную арганізацыю, дзе ёсць дзесяткі тысяч рабочай моладзі, ім таксама трудна, як папе рымскаму прымкнуць для прапаганды каталіцызма да саюза бязбожнікаў. (Смех).

Гады крызіса былі самымі цяжкімі гадамі работы комуністаў на прадпрыемствах за ўсе 15 год існавання Комінтэрна. Прадпрыемцы выкарысталі крызіс для таго, каб ачысціць прадпрыемствы ад комуністаў. І, не гледзячы на гэта, за апошні год Комінтэрн дабіўся сур'ёзных поспехаў у рабоце на прадпрыемствах у Германіі і Японіі. Але гэтага-ж нельга сказаць аб другіх партыях, якія не пераадалелі яшчэ сваіх слабасцяй у гэтай галіне.

Але і там, дзе комуністы вядуць барацьбу на прадпрыемствах за заваяванне гэтай большасці, яны вядуць яе не заўсёды здавальняюча. Комуністы перапоўнены самай шчырай арганічнай нянавісцю да сацыял-дэмакратыі, як агентуры капітала ўнутры рабочага руху. Але гэту здаровую рэволюцыйную нянавісць трэба ўмець перадаць рабочым. Трэба, каб здраднічая роля сацыял-дэмакратыі, ясная для комуністаў, была ясна і для сацыял-дэмакратычных рабочых. Для іх гэта яшчэ не аксіёма, а тэарэма, якая патрабуе доказаў. Чэснага комуністычнага рабочага з душы верне абвяргаць подлыя сафізмы сацыял-дэмакратыі, ён іх даўно адвёг у сваім класавым сазнанні, але ён патрабуе такой-жа рашучай распладоўнасці і ад сацыял-дэмакратычных рабочых, якія толькі пачынаюць хістацца. Ён ведае, што хістанні ў партыі недапушчальны, што яны ні што іншае, як праяўленне апартунізма, што хістаючыхся ў партыі, як адыходзячых ад комунізма, трэба выкрываць; яму трудна зразумець, што хістаючыхся за межамі партыі, якія толькі ідуць да комунізма, трэба ўмець заваяваць, зрабіўшы іх моцнымі, надзейнымі сторонникамі пролетарскай дыктатуры і компартыі, сторонникамі, якія не будуць ніколі хістацца.

Нашы комуністы не заўсёды спракатыкаваны ў тонкасцях лісіх манёўраў сацыял-дэмакратыі, асабліва тэк званай як левай часткі, і часта нападаюць пры правядзенні тактыкі адзінага фронту ў расстаўленую пастку. У такую пастку папалі французскія таварышы ў пачатку 1932 г., калі яны зацеялі перагаворы з Блюмамі аб дыскусіях на абстрактную тэму — аб «адзінстве». Французскія комуністы не заўважылі, што гэтымі перагаворамі яны аслабілі націск партыі на сацыял-дэмакратыю, і гэта ў той момант, калі германская сацыял-дэмакратыя раскрывала шырока дзверы фашызму і калі ўвесь II Інтэрнацыянал знаходзіўся ў велізарным замяшанні. Жэнеўская арганізацыя ў Швейцарыі таму і не здолела замацаваць свой вырасшы ў выніку жэнеўскіх расстрэлаў уплыў у рабочых масах, — што яна своечасова не дала адпору лініі правага апартунізма Эмбер-Дро, цягнуўшага арганізацыю да аслаблення барацьбы супроць «левага» сацыял-дэмакрата Ніколя. А гэты правы апартунізм з'яўляецца сёння тым больш **галоўнай небяспекай**, што «левыя» групкі, якія адпачкоўваюцца ад распаўзаючайся на кусках сацыял-дэмакратыі, прабуюць затрымаць рэволюцыянізаванне сацыял-дэмакратычных рабочых «лева» рэфармісцкімі прамежкавымі платформамі, накшталт платформы англійскага незалежніка Брокуэя.

Але гэтыя слабасці не могуць зацямніць тыя дасягненні, якіх дабіўся Комінтэрн з часу апошняга XVI з'езда за 3 з паловай гады ў справе распырэння масавага базіса сваіх секцый. І першае месца ў гэтых дасягненнях пасля ВКП(б) належыць, несумненна, **кітайскай компартыі.** Кітайская компартыя заваявала не толькі большасць пролетарыята, але і большасць усіх працоўных у совецкіх раёнах. Гэты рост комуністычнага ўплыву ў Кітаі знайшоў сваё выражэнне ў колькасным павялічэнні кітайскай компартыі, вырасшай за адзін год на 120 тыс. і налічваючай у цяперашні час 416 тыс. членаў. **(Апладысменты).** Гэта партыя ўжо кіруе совецкай дзяржавай, ахватваючай тэрыторыю ў 700 тыс. кв. клм., большую чым Францыя або Германія або якая-небудзь іншая імперыялістычная дзяржава, за выключэннем НАЗШ. Яна распалагае ўзброенай сілай у асобе кітайскай Чырвонай арміі, якая налічвае 350 тыс. байцоў у сваіх рэгулярных часцях **(апладысменты)** і каля 600 тыс. ва ўзброеных партызанскіх атрадах **(апладысменты).** Гэта армія, якая з'яўляецца па прызнанню самых горшых ворагаў яе, лепшай арміяй у Кітаі, складаецца на 30 проц. з рабочых і мае ў сваіх узорных часцях каля 50 проц. комуністаў **(апладысменты).**

Маладая кітайская компартыя вырастае зараз у адну з лепшых секцый Комінтэрна яшчэ і таму, што яна і яе Чырвоная армія прайшлі шматгадовую школу грамадзянскай вайны, у часе якой яны выкавалі і моцныя партыйныя кадры, і цэлую плеяду талантлівых палкаводцаў і баявых камандзіраў. **(Апладысменты).** Загартаваўшаяся ў грамадзянскай вайне, Чырвоная армія Кітая ўжо адбіла 5 паходаў Чан Кай-шы, у часе апошняга, пятага паходу, дзе супроць яе дзейнічала 87 адборных дывізій Чан Кай-шы, налічваўшых разам з памеснічыцкакарнымі атрадамі і кулацкімі бандамі каля 600 тыс. штыхоў, яна зусім разграміла 17 дывізій, адбіла напад 40 дывізій, узяла ў палон каля 80 тыс. чалавек і з студзеня па красавік 1933 г. захваціла ў праціўніка 140 тыс. вінтовак, 1390 станкавых і легкавых кулямётаў, 20 радыёўстановак, 6 аэрапланаў і заняла 79 новых паветаў. **(Гадасы: Брава! Апладысменты).** Такая армія і такая партыя, таварышы, ужо буйны фактар у суадносінах сіл на Далёкім Усходзе.

Зараз гэта армія адбівае шосты паход Чан Кай-шы, дзе ёй прыходзіцца змагацца з перавышаючымі сіламі праціўніка, ваюючымі па плану генерала Секта і аснашчонымі навейшай ваеннай тэхнікай, амерыканскімі аэраплянамі, англійскімі танкамі і браневікамі і французскай артылерыяй. Але і гэты паход пакуль прыбёў да таго, што Чырвоная армія заняла новых 15 паветаў у Сычуане і кітайскія таварышы ўпэўнены, што гэты паход таксама скончыцца паражэннем Чан Кай-шы і тэхнічным пераўзбраеннем Чырвонай арміі за кошт праціўніка, таму што кітайская компартыя і Чырвоная армія аснашчоны тым, чаго няма ў праціўніка: усё перамагаючай сілай комунізма і самаадданым падтрыманнем працоўных мас Кітая. У раёнах, дзе адбываюцца самыя ўпорныя баі, Чырвоную армію падтрымлівае і абслугоўвае ўсё насельніцтва: рабочыя, кулі, сяляне, гандлёвыя служачыя, рыбакі, вулічныя жабракі, жанчыны, дзеці.

І Чан Кай-шы і надалей будзе цярпець паражэнні, таму што найшырэйшыя масы працоўных Кітая ўжо на канкрэтным вопыце совецкіх раёнаў бачаць перавагі совецкай сістэмы. Кітайская компартыя заваявала гэтыя масы тым, што яна правяла да канца аграрную рэволюцыю, канфіскаваўшы ў карысць народу зямлю і інвентар памешчыкаў, джэнтры і кулакоў, што яна ліквідавала язву кітайскай вёскі — ліхвярства, што яна, не ўграмаджваючы гандлю і рамясла, строга рэгламентуе іх, што яна арганізуе дзяржаўную і грамадскую дапамогу сялянам, не маючым жывёлы і насення, што яна развівае прамысловую і крэдытную кааперацыю, што яна ўзяла справу народнай асветы і аховы здароўя на небывалую для Кітая вышыню. Гэта тая партыя і тая ўлада, якую чакаў тысячагоддзямі кітайскі кулі і селянін. Гэта яшчэ не пролетарская дыктатура, але гэта асобая форма рэволюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры пролетарыята і сялянства паласы **агульнага** крызіса капіталізма. Гэта дыктатура, правадзімая пад гегемоніяй пролетарыята і пад мапапольным палітычным кіраўніцтвам компартыі, даводзячая буржуазна-дэмакратычную рэволюцыю да канца і ў працэсе яе ажыццяўляючая рад мерапрыемстваў сацыялістычнага характару; а гэта ўсё разам узятае за бясспечнае быстрае перарастанне гэтай рэволюцыі ў рэволюцыю сацыялістычную пры ўмове распырэння ўлады Советаў на прамысловыя цэнтры.

Другой партыяй пасля кітайскай, зрабіўшай крок уперад у справе заваявання большасці рабочага класа, з'яўляецца КП Германіі. Ніколі яна яшчэ так блізка, як ушчыльную не падыходзіла да сацыял-дэмакратычных рабочых, як у цяперашні час; ніколі яшчэ за ўвесь пасляваенны перыяд развіцця соц.-дэмакратыі, рабочыя не лавілі так прагна кожную комуністычную лістоўку, як цяпер, ніколі ў Германіі не было такой глыбокай цягі да адзінага фронту барацьбы рабочага класа, як сёння. А гэта дало магчымасць КПГ сарваць планы фашыстаў аб аўладанні профсаюзамі. Вырасшы ўплыў КПГ дазволіў ёй пасля сакавіцкага ўдару ўжо ў маі месяцы перайсці да тыпу рассыпных дэманстрацый, на якія фашызм адказаў новай хваляй тэрора і публічнымі карамі смерцю. У жніўні-верасні рэволюцыйная профсаюзная апазіцыя разгортвае рад паспяховых стачак у ніжнім Рэйне, Гаагане, Дзюсельдорфе, Рэмшэйдзе Бупертале Золінгене і іншых мясцах.

У лістападзе яна ўзначальвае пяці мільённую — па даных фашызма — дэманстрацыю германскіх рабочых, або галасаваўшых супроць фашызма, або ўстрымаўшыхся, каб выразіць свой пратэст супроць фашысцкай дыктатуры.

Прасунулася ўперад у заваяванні большасці рабочага класа і компартыя Польшчы, што выразілася, па першае, у колькасным павялічэнні партыі і комсамола, налічваючых зараз да 30 тыс., г. зн. столькі-ж, колькі налічвае легальная партыя ППС, падругое, у самастойнай арганізацыі, самастойным кіраўніцтве раду буйнейшых стачак.

Ва Францыі пасля раду год застою і нават пэўнага руху назад у колькасным росце партыі і чырвонай канфедэрацыі працы, у апошні год намеціўся пэўны эрух у бок далейшага павялічэння як партыі, так і чырвоных профсаюзаў, налічваючых у цяперашні час каля 40 тысяч комуністаў і каля 275 тысяч членаў чырвонай канфедэрацыі працы.

У Чэха-Славакіі, не гледзячы на тое, што партыя загнана ў падполле, яна налічвае 55 тысяч членаў і 90 тыс. чырвоных профсаюзаў.

Заваявала большасць рабочага класа гераічная рабочая партыя Балгарыі, аўладаўшая ў 1932 г. сафійскім муніцыпалітэтам, што пацягнула за сабой ануляванне выбараў і шалёную хвалю рэпрэсій супроць компартыі. Вялікія поспехі мае компартыя Іспаніі, якая з 800 членаў тры гады таму назад вырасла да 30 тыс., якая вядзе за сабой каля 300 тысяч арганізаваных у профсаюзах рабочых і сабрала на апошніх выбарах каля 40 тысяч галасоў. **(Апладысменты).**

Зараз няма амаль ні адной секцыі Комінтэрна, якая-б не расшырыла за апошнія 3 з паловай гады сваёй масавай базы.

Комінтэрн зараз налічвае 860 тыс. комуністаў у капіталістычных краінах. Але справа не толькі ў колькасным росце компартый, але і ў росце іх уплыву. Якая-небудзь маленькая паўтаратысячная компартыя Аўстраліі праводзіць свайго другога сакратара генеральным сакратаром усеаўстралійскай федэрацыі гарнякоў.

А між тым, гэты рост уплыву компартыі адбываецца ў абстаноўцы, калі пераважная большасць секцый Комінтэрна ўжо знаходзіцца на нелегальным становішчы і толькі 15 секцый, уключаючы і Совецкі Кітай, маюць яшчэ большыя ці меншыя магчымасці для адкрытай работы.

У большасці капіталістычных краін комуністы працуюць ва ўмовах самых лютых праследванняў, пакідаючых эзаду рэпрэсіі царызма. Толькі за 8 месяцаў 1933 года было арыштавана 238 тыс., забіта 46 тыс. чалавек паранена і пакалечана каля 160 тыс.

У капіталістычных турмах сядзяць сотні тысяч комуністаў, з якіх у кожнай паасобнай краіне можна скласці за 24 гадзіны дасканалую баявую партыю з самых адданых і праверэных ваўцоў пролетарскай рэволюцыі. У адной Германіі кінута ў канцэнтрацыйныя лагеры каля 60 тысяч комуністычных рабочых. Польская нелегальная компартыя налічвае 15 тысяч членаў партыі на свабодзе, а колькасць яе актывістаў, кінутых у турмы, дасягае 10 тысяч. У самых так званых «перадавых» буржуазных дэмакратыях, як ПАЗШ, комуністаў расстрэльваюць з-за вугла наёмныя банды.

У Паўднёвых Штатах чорнага негрыцянскага пояса іх падвяргаюць суду лінча. У каланіяльных краінах комуністаў трымаюць у клетках, прыкаваных ланцугом да жалезнай жэрдкі, падобна таму, як рымскія патрыцыі прыкоўвалі беглых рабоў.

Падпал рэйхстага фашысцкімі правакатарамі паказвае, да якой нізасці і подласці скочваюцца здыхаючыя класы ў барацьбе супроць пролетарыята. Тое, што адбываецца зараз ў фашысцкіх засценках Германіі, зацямніла існуючыя да гэтага часу прыёмы белага тэрора. Фашысцкія штурмавікі і іх прыёмы даклад на спісаны са звярынага вобліка п'яной белагвардзейшчыны, лютаваўшай у дзянікінскіх контрразведках.

І ў гэтых умовах германская компартыя захавала не толькі 100 тысяч сваіх членаў, але расце і далей. **(Апладысменты).** Бо кожны комуніст такога падполля — пролетарскае золата, па вагах гісторыі ён зажыць больш, чым дзесяткі тысяч тых, хто галасаваў да апошняга часу за социял-дэмакратыю. І гонар і слава германскай компартыі, яе Цэнтральнаму Камітэту і яе правадыру Тэльману, выпестававаўшым такія кадры. **(Апладысменты. Усе ўстаюць і доўга апладыруюць).**

А такіх кадраў Комінтэрн мае ўжо многія дзесяткі тысяч у капіталістычным свеце. Свет захапляўся паводзінамі Георгія Дзімітрава **(працяжныя апладысменты).** Паводзіны Дзімітрава — гэта вартыя комуніста паводзіны, якія пры другіх, больш скромных акалічнасцях праяўлялі тысячы комуністычных кадравікоў ва ўсіх капіталістычных краінах, паводзіны, якім вучылі Ленін і Сталін большэвіцкую партыю і якім навучыліся ў яе другія секцыі Комуністычнага Інтэрнацыянала. **(Апладысменты).** Хіба гамбургскі рабочы Люттенс, памёршы пад фашысцкай сякерай з крыкам «Няхай жыве сусветная пролетарская рэволюцыя», не таго-ж большэвіцкага загартавання чалавек, што і Дзімітраў?

Значэнне шляху, пройдзенага Комінтэрнам, заключаецца ў тым, што голас Лібкнехта не голас адзіночкі, як у 1914 годзе, а тысячы лібкнехтаў у капіталістычных краінах высока трымаюць ужо сёння і будуць трымаць яшчэ мацней заўтра, у выпадку новай імперыялістычнай вайны, сцяг сусветнай пролетарскай рэволюцыі. **(Апладысменты).** І тут справа не ў праверцы паасобных людзей. Цэлыя партыі ўжо вытрымалі такую гістарычную праверку. Хіба паводзіны і работа КПГ ва ўмовах фашысцкага тэрора гэта не найбольш верная праверка большэвіцкага загартавання компартыі Германіі?

Партыя, тры члены ЦК якой забіты, кожны кіруючы работнік якой з'яўляецца фактычна «смяротнікам», звыш дзесятка тысяч членаў якой былі арыштаваны за адзін тыдзень у лістападзе мінулага года, ні на адзін дзень не спыняла сваёй работы. З часу устанаўлення фашысцкай дыктатуры яна распаўсюдзіла каля 2 млн. друкаваных выданняў. Яе нелегальны цэнтральны орган «Ротэ фане» пакуль выходзіць рэгулярна, чытаецца значна большым кругам людзей, чым калі «Ротэ фане» выходзіла легальна. **(Апладысменты).** За свабоднае комуністычнае слова людзі паміраюць з той-жа мужнасцю, з якой паміралі большэвікі, на франтах грамадзянскай вайны. У Тюрынгіі непрыкмет ны партыец-рабочы, забарыкадаваўшыся ў кватэры, адчыняе акно і перадае прамову маскоўскага радыё перад сабраўшымся натоўпам, пакуль фашысцкае звяр'ё не забівае яго на месцы. Ва ўмовах найцяжэйшага падполля шырока развіваецца ініцыятыва нізавых партыйных арганізацый, быстра і самастойна рэагуючых на кожную падзею ў краіне; растуць новыя партыйныя кадры, што дазволіла партыі чатыры разы пасля буйных правалаў замяніць арыштаваных таварышоў новымі. Хіба не паказальны для большэвіцкага загартавання партыі той факт, што з 60 тыс. комуністаў арыштаваных і зняволеных у канцлагеры, фашысцкая паліцыя не магла знайсці ні аднаго «сведкі» на Лейпцыгскі працэс і вымушана была аперываць з ілжэ-сведкамі, узятымі на пракат з крымінальнага свету. Такая партыя не можа не заваяваць давер'я рабочых, такая партыя абрастае мільёнамі.

Хіба такой большэвіцкай праверкі не вытрымала ўжо другая компартыя, адыгрываючая зараз важную ролю, компартыя Японіі? Толькі за дзевяць месяцаў, па надзвычай няпоўных даных, якія прасочваюцца ў буржуазную прэсу, у Японіі арыштавана каля васьмі тысяч комуністаў і комсамольцаў. І тым не менш на змену аднаму арыштаванаму ў Японіі падымаюцца дзесяткі новых комуністычных сіл. Японская компартыя вырошчвае сталёвае большэвіцкае пакаленне. Маладая комсамолка пад катаваннямі на працягу шасці тыдняў не толькі не дае паказанняў, але, на здзіўленне паліцэйскіх катаў, не стогне, не вымаўляе ні аднаго слова. Але справа не толькі ў гераізме японскай компартыі. Толькі компартыя Японіі вядзе мужную барацьбу ў краіне супроць вайны ў Кітаі. Яна дае ўсім секцыям Комінтэрна ўзор масавай большэвіцкай работы, адпаўляючай да найдрабнейшых дэталяй прыёмы работы нашай партыі, калі яна была нелегальнай. У апошні час надзвычай узмацнілася актыўнасць комуністаў на ваенных прадпрыемствах. На працягу некалькіх год, не гледзячы на агромныя правалы, цэнтральны орган партыі «Секкі» не пераставаў выходзіць. Партыя выдае газету для салдат «Друг салдата», газету для маракоў у Кобе, сялянскую газету — насычаныя караспандэнцыямі з заводаў, казарм і японскай вёскі. Цэлая сетка вельмі добра пастаўленых фабрычна-заводскіх газет дапаўняе гэту карціну работы японскай компартыі. Трудна чытаць без глыбокага хвалявання гэтыя газеты, у якіх кожнае слова дыша пролетарскім абурэннем супроць эксплаатацыі і ленінска-сталінскай барацьбой супроць імперыялізма і вайны.

«Тыя, — піша адна з гэтых фабрычна-заводскіх газет, выходзячых на заводзе Міцюбісі, — таго называюць маньчжурскімі бандытамі, гэта нашы браты — кітайскія рабочыя і сяляне, якія змагаюцца супроць інтэнсіўнага японскага імперыялізма. Японскі імперыялізм накіроўваецца на ўжо створаныя ў Кітаі советы і замышляе напад на Совецкі Саюз, — нашу пролетарскую бацькаўшчыну. А нападзі на краіну совецкіх рабочых і сялян, г. зн. напасці на нас саміх, японскіх рабочых і сялян». **(Бурныя апладысменты).**

А такіх караспандэнцый і артыкулаў дзесяткі і сотні. І гэта ёсць сапраўдны голас рабоча-сялянскай Японіі, якой працоўныя нашай совецкай краіны працягваюць руку брацтва, пролетарскай салідарнасці. **(Апладысменты).**

Хіба такой-жа траверкай большэвіцкага загартавання секцый Комінтэрна не быў іх добра арганізаваны і праведзены пераход на нелегальнае становішча за апошнія гады? Але калі секцыі Комінтэрна вытрымалі гэтую гістарычную пробу, то імецна таму, што ў сваіх нас таўнікаў Леніна і Сталіна, ва ўзорнай партыі ВКП(б) яны навучыліся большэвіцкай непрымірымасці да ўсякага роду апартуністычных хістанняў і ўхілаў. Калі ў Германіі ні завая група таварышоў збіраецца ў лесе каля дзесятка раз, каб у выпускаемым імі нумары газеты не праслізнула ніякіх палітычных памылак і ўхілаў, то гэта аб чым-небудзь ды гаворыць. Людзі больш баяцца ўхілу, чым смерці. На барацьбе з правым ухілам, як галоўнай небяспекай, і левым ухілам рос, умацоўваўся і большэвізаваўся Комінтэрн на працягу 15 год свайго існавання і 10 год без Леніна. Ні адна секцыя Комінтэрна не дрогнула пасля прыходу фашыстаў да ўлады ў Германіі. Рэмеле і Нейман у Германіі не змаглі скакаціць параженцкай групы ў радах КПГ. Гутман у Чэха-Славакіі быў палітычна ліквідаваны ў дваццаць чатыры гадзіны, не ўзёўшы за сабой нізводнага чалавека пасля выключэння яго з партыі. І гэта жалезнае адзінства складае вялікую сілу Комінтэрна, перад тварам II Інтэрнацыянала, які распаўзаецца яшчэ да пачатку вайны.

Лева-рэфармісцкі лідэр англійскай незалежнай рабочай партыі, Брокувей, у сваёй перапісцы з Комінтэрнам прапануе нам склаці новы інтэрнацыянал з уключэннем у яго адшчапенцкіх крушачак, пры дапамозе якіх буржуазія прабуе распыліць сілы рабочага класа. Да рога гэтых крушачак вядзе ў лагер буржуазіі, а новага інтэрнацыянала нам не патрэбна, бо ленінізм на брокуэізм не мяняюць.

Шлях да адзінства рабочага класа ляжыць не праз стварэнне новых прамежкавых інтэрнацыяналаў, а праз палітычную ліквідацыю сацыял-дэмакратыі, як партыі адрады рабочаму класу, і ўмацаванне і ўмацаванне Комуністычнага Інтэрнацыянала.

Мільёны с.-д. рабочых, якія з горыччу і болем стаяць перад банкрутцвам іх вялікіх масавых арганізацый, усё яшчэ задаюць сабе балючае пытанне: дзе выхад?

І XVII партз'езд, з'езд кіруючай секцыі Комінтэрна, к голасу якога прыслухоўваецца ўвесь свет, адказа на гэта пытанне. Мы ведаем гэты выхад, выхад з нарастаючай катастрофы, гэты выхад указаў 17 год таму назад велізарнейшы побач з Марксам і Энгельсам геній чалавечай гісторыі Ленін прапоўным нашай краіны. Гэта Окцябр, гэта перамога рабочых і сялян над сіламі старога свету. Мы ведаем ужо праверэны на вопыце вялікага народу сродак, каб пакласці канец фашызму і войнам і паралюючаму іх капіталізму. Гэта совецкая ўлада, лозунг якой — згодна тэзісам XIII пленума ВККІ — становіцца зараз цэнтральным лозунгам усёй масавай работы компартый. Мы ведаем шлях, які вядзе да перамогі. Гэта адзіны фронт пролетарыята пад кіраўніцтвам компартыі ў паасобных капіталістычных краінах — гэта адзіны фронт сусветнага рабочага класа пад кіраўніцтвам Комінтэрна, фронт, які ў злучэнні з СССР і Совецкім Кітаем, прадстаўляе сабой непераможную сілу.

Ідучы па гэтаму шляху, мы перамаглі ў кастрычніку таму, што Ленін выхаваў большэвіцкую партыю, па якой раўняецца зараз сусветная партыя ленінізма, створаная ім Комуністычны Інтэрнацыянал. Ён не толькі ўзброіў гэту партыю тэорыяй рэволюцыйнага марксізма але і ўзбагаціў і развіў гэту тэорыю для новай эпохі пролетарскіх рэволюцый і войн. Мы перамаглі таму, што ён выпеставаў такія большэвіцкія кадры, канцэнтраваны ўвасабленне лепшых якасцяй якіх можа быць выражана ў адным слове: Сталін. **(Апладысменты. Усе ўстаюць. Бурныя авацыя).** Мы не толькі перамаглі, але і ўтрымалі замацавалі гэту перамогу таму, што геній Леніна правёў працоўных нашай краіны праз самыя небяспечныя моманты нашай рэволюцыі праз войны здыхаючых і тым шалёней супраціўляючыхся класаў праз войны міжнароднай інтэрвенцыі. Але мы не толькі нашу перамогу утрымалі і замацавалі, мы расшырылі яе, узмацніўшы ўсямерна пролетарскую дыктатуру і перамогна будуючы социялістычнае грамадства пад тэніяльным кіраўніцтвам пераемніка Леніна—тав. Сталіна.

Пад ленінскім кіраўніцтвам Сталіна за дзесяць год без Леніна СССР — сёння не толькі ўзброеная частка сусветнага пролетарыята, але і ўзброеная навейшай тэхнікай. Пад кіраўніцтвам Сталіна СССР сёння не толькі дзяржаўная арганізацыя часткі сусветнага пролетарыята, але і дзяржаўная арганізацыя. Свайм мутнасцю перасоўваючая вагары гісторыі і паскараючая пагібель капіталізма. Пад кіраўніцтвам тав. Сталіна ў СССР пабудавана социялістычная гаспадарка пераламвога ад сусветнага пролетарыята. Цяпер калі буржуазія гоніць свет да імпарыялістычных войн, калі яна прамяць абязброены рабочы клас у капіталістычных краінах, цяпер відаць асабліва ясна, чым з'яўляецца для сусветнага рэволюцыйнага руху тэорыя будаўніцтва социялізма ў асобнай краіне. Гэта была ёсць тэорыя найглыбейшай пролетарскай салідарнасці, велізарнейшага інтэрнацыяналізма ВКП(б), узброены гэтай тэорыяй пролетарыят рыхтуе нястомна перамогу пролетарскай рэволюцыі ва ўсім свеце. Ленін прывёў працоўных ў Окцябру ў Расіі, Сталін шляхамі Леніна вядзе іх да перамогі ва ўсім свеце. **(Апладысменты).** Яго апонкі і перспектывы вызначалі той шлях, які праходзіў Комінтэрн у апошнія дзесяць год без Леніна. Гэты шлях асвятляў непраўзойдзенай дыялектыкай марксістка-ленінскай тэорыі на ягі цвёрдай, як граніт большэвіцкай прынцыповасці, і гібкай, як высокаякасная сталь,